Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

Літ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

№ 20 (4411) 18 мая 2007 г.

У нумары:

Пад стрэламі Купідона
Інтэрв'ю з Мікалаем Чаргінцом пра аб'яўлены Рэспубліканскі літаратурны конкурс
Стар. 3

Для каго і для чаго?
Мініяцюры Таццяны Мушынскай, змест якіх закране кожнага літаратара
Стар. 9

Ці можна?
Нечаканы "погляд знутры" на творчае жыццё ТЮГа
Стар. 11

Ад рэальнасці да мастацтва
Развагі Міколы Дубоўскага над палемічнай публікацыяй Валерыя Гапеева
Стар. 13

Палёт натхнення ў стылі графіці
Узважаны аповед пра тое, *хто* і *чаму* распісвае сцены там, дзе дазволена і дзе не дазволена
Стар. 14

ПАДПІСАЦЦА НА ШТОТЫДНЁВІК «ЛІМ» МОЖНА З ЛЮБОГА МЕСЯЦА

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 4500 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 5800 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: другое паўгоддзе, на 1 месяц — 4000 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска: 1 месяц — 4700 руб.
Падпісны індэкс — 63880

Храмы муз

Сёння, 18 мая, — Міжнародны дзень музеяў. А роўна месяц таму, 18 красавіка, быў дзень, сугучны сённяшняму — сугучны сваёй духоўнай сутнасцю і грамадскім розгаласам: Сусветны дзень аховы помнікаў і гістарычных мясцін. У нашай свядомасці абедзве даты зближаюцца...

Так, абедзве гэтыя знамянальныя даты ў нашай свядомасці зусім зближаюцца, можна сказаць нават — амаль супадаюць, робяцца тоеснымі, калі мы глядзім на святыні нашай багатай і своеадметнай гісторыі, сімвалы беларускай самабытнасці, непаўторнасці, знакі нашага складанага еўрапейскага лёсу і годнага еўрапейскага шляху. Мірскі замак: што ён для нас? І помнік, і гістарычнае месца, і музей. І знак нацыянальнага, культурнага, дзяржаўнага адраджэння. І візітоўка абноўленай, незалежнай, годнай, прыгожай краіны.

Дарэчы, менавіта Мірскі замак паспрыяў прызнанню маладой суверэннай Беларусі ў сённяшнім свеце.

2002 год, ліпень. Візіт у нашу краіну Генеральнага дырэктара ЮНЕСКА Каіціры Мацууры. Высокі госць узяў удзел ва ўрачыстасцях з нагоды ўключэння замкавага комплексу "Мір" у Спіс сусветнай прыроднай і культурнай спадчыны, у цырымоніі адкрыцця адпаведнай мемарыяльнай шыльды. Правёў афіцыйныя перамовы наконт перспектыў супрацоўніцтва Беларусі з ЮНЕСКА.

Праз тры гады, у ліпені 2005-га, мы адчулі дадатны вынік тых перамоў. Доўгачаканая падзея! Архітэктурна-культурны комплекс у Нясвіжы (рэзідэнцыя княжацкай дынастыі Радзівілаў), які не мае аналагаў нават у багатай на замкі, палацы ды паркі Еўропе, увайшоў у Спіс сусветнай прыроднай і культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Адпаведны Міжурадавы камітэт, што займаецца праблемамі аховы гістарычных помнікаў і унікальных мясцін, прыняў на сваёй чарговай, XXIX сесіі такое важнае і прэстыжнае для Беларусі рашэнне.

Любіце метафары? Тады вы не будзеце пярэчыць таму, хто скажа пра Нясвіж: горад-музей. А ён жа не адзін у нас такі! Згадайма старажытны Полацк з яго гісторыка-культурным запаведнікам. Гародню. Пінск. "Музейныя" куточкі Наваградка і Віцебска, Турава і Паставаў. Брэст з яго славутай цытадэллю і Бярэсцем — гэткім дзіўным горадам-міражом. Успомнім фантастычную "ўсебеларускую вёску" Строчыцу — Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту. Ці радзінныя сядзібы класікаў айчыннай літаратуры...

А вось Мірскі замак музеем завецца зусім не ў метафарычным сэнсе: у яго легендарных мурах размясціўся філіял Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Дарэчы, днямі, 22 мая, у гэтым храме муз пачынаюцца ўрачыстасці, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння Алены Аладавай, унікальнай асобы, якая з 1944 по 1977 гады была тут дырэктарам.

Вядома, што сёння значна пашырыліся экспазіцыйныя плошчы галоўнай скарбніцы мастацтва, і высокі дух акадэмічнасці адмыслова спалучаецца тут з яскравымі, нават эпатажнымі падзеямі. Яны адбываюцца і ў межах міжнароднага праекта новага стагоддзя — "Ноч музеяў". Вось і заўтра гледачам будзе прапанавана музычна-выяўленчая святочная імпрэза "Пад маскай ночы", якая завершыцца на памежжы суботняга вечара і ўжо новага дня.

Архітэктура, станковая скульптура, жывапіс і класічны габелен, медальерная пластыка, прыгожае пісьменства, дэкламацыя, музыка — якая адмысловая кампанія муз можа збірацца ў гэтых сценах! Тут і Эўтэрпа; а, можа, і Мельпамена. Ды і сам Апалон. І Кліо — муза гісторыі... Як жа без антычных персанажаў, калі карані самога паняцця "музей" — у грэчаскім слове "museion", што значыць "храм муз". Хаця статус кво сённяшніх музеяў даўно ўжо не стасуецца з артадаксальнымі ўяўленнямі пра антычныя традыцыі. Прыродазнаўчыя і этнаграфічныя, ваенна-гістарычныя і мастацкія, археалагічныя і літаратурныя... Музей Беларускага Палесся ў Пінску. Геалагічны — "Парк камянёў" у сталіцы. Музей старажытнабеларускай культуры ў Нацыянальнай акадэміі навук. Цэнтральны дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва Беларусі. Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе", дзе знаходзіцца самая вялікая і разнастайная калекцыя беларускіх маляваных дываноў. Веткаўскі музей народнай творчасці. Музеі, звязаныя з імёнамі нашых сусветна вядомых землякоў: Янкі Купалы, Якуба Коласа, Т. Касцюшкі, С. Манюшкі, А. Міцкевіча, Н. Орды, М. Шагала... Дом-музей І з'езда РСДРП. Музей баявой садружнасці беларускіх, рускіх, латышскіх і літоўскіх партызан у Расонах... А краязнаўчыя зборы ў кожнай вёсачцы, мястэчку ці абласным цэнтры! Пералічваць — марны занятак. Сёння ў нашай краіне толькі дзяржаўных музеяў каля паўтары сотні.

Ужо ў XIV — XV стст. у ВКЛ, колішняй нашай дзяржаве, існаваў музейны збор, дзе дэманстраваліся вайсковыя трафеі, творы выяўленчага мастацтва, габелены, дываны, медалі, манеты. Музейныя зборы магнатаў былі ў Мірскім і Нясвіжскім замках. 1856 год увайшоў у гісторыю нашай культуры як час утварэння Віленскага музея старажытнасці — першага агульнадаступнага музея на беларускай зямлі. І праз паўтары сотні гадоў на цяпер ужо суверэнных абсягах нашай айчыны працягваюць сваю карпатлівую і нягучную справу сціплыя рупліўцы-музейшчыкі — высокаадукаваныя прафесіяналы, саматужнікі-энтузіясты.

Сёння ўрачыста адкрываецца XII Рэспубліканскі фестываль "Музы Нясвіжа". Праграмы артыстаў Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі; вернісаж партрэтнага жывапісу з музеяў Янкі Купалы і Якуба Коласа... А ў Мір неўзабаве таксама зляцяцца музы: на пачатку лета тут адбудзецца фестываль "Мірскі замак-2007".

С. БЕРАСЦЕНЬ

Фота В. Кавалёва

Чаканыя сустрэчы пачаліся

Дзіцячая бібліятэка № 17, якая год таму адкрылася ў мікрараёне Лошыца, — самая маладая сярод падобных устаноў сталіцы. Тым не менш на яе рахунку ўжо нямала цікавых і карысных мерапрыемстваў, праведзеных з дзецьмі і падлеткамі. А ў бібліятэчных планах — яшчэ і сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі.

На пачатку мая першым у госці да чытачоў завітаў паэт, празаік, сатырык і гумарыст, а да ўсяго і дзіцячы пісьменнік Анатоль Зэкаў. З яго гадзіннага аповеда вучні даведаліся, як аўтарам ствараліся кнігі для дзяцей "Чатыры зярняткі" і "На арэхавым кані", а таксама пачулі гісторыю з будучай кнігі "Не казкі пра Сашку".

Анатоль Зэкаў чытаў вершы, у тым ліку і са зборніка "Чарнобыльскі вецер", якія вымушалі школьнікаў задумацца, весяліў іх гумарыстычнымі вершамі, праз пародыю знаёміў з творчасцю сяброў-паэтаў.

З'яўляючыся супрацоўнікам часопіса "Полымя", ён, безумоўна, не мог абысці ўвагай і асноўныя творы, змешчаныя ў апошні час на старонках старэйшага літаратурнага выдання рэспублікі, у прыватнасці, у раздзеле "Проза", а таксама матэрыялы пад рубрыкамі "Школьны факультатыў", "На паверцы — імёны", "Наш край", "Легенды XX стагоддзя", шэраг публікацый, прысвечаных 125-годдзю класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Сяргей БЯРНАЦКІ

З дыпломам, бярозаўцы!

Па выніках работы па камплектаванні фондаў гарадскіх і сельскіх бібліятэк сацыяльна значнай літаратурай за 2006 год Бярозаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Брэсцкай вобласці ўзнагароджана дыпломам Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. У гэтым — вялікая заслуга яе калектыву і асабіста дырэктара Ірыны Макарэвіч.

Супрацоўнікі бібліятэкі працавалі ў цесным кантакце з вядучымі рэспубліканскімі выдавецтвамі "Мастацкая літаратура", "Беларусь", "Вышэйшая школа", "Беларуская навука" і многімі іншымі. За мінулы год Бярозаўская ЦБС закупіла ў іх каля 2000 экз. самых разнастайных кніг. На закупку літаратуры мясцовы бюджэт выдаткаваў 15 млн. рублёў.

Іван АСКІРКА

Коласавы Каралішчавічы

У мястэчку Каралішчавічы, што ў 20 кіламетрах ад сталіцы, адкрылася мемарыяльная экспазіцыя ў гонар славутага беларускага песняра Якуба Коласа.

У сасновым бары стаяла сонечнае надвор'е, калі дзесяткі гасцей — пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў і журналістаў — сабраліся ля старой драўлянай хаты — былога дома творчасці "Каралішчавічы".

Тут на працягу 1950—90-х гадоў працавалі найвядомейшыя літаратары. У іх шэрагу — Якуб Колас. Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч меў тут свае ўлюбёныя куткі, а таксама цяністы пакой. Пра яго частыя візіты сюды з 1950-га па 1956-ы сведчыць мемарыяльная дошка.

Сёння гэта — дом адпачынку, які належыць ААТ "Мінскрамбуд". Сучасныя гаспадары захавалі коласаўскую назву комплексу — "На ростанях", а сам будынак, у якім збіраўся свет беларускай літаратуры, быў адноўлены дзякуючы намаганням Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа пры фінансавай падтрымцы гэтай арганізацыі.

У экспазіцыйным пакоі прадстаўлены фотаздымкі, самыя цікавыя лісты, прысвячэнні тых гадоў. Аўтэнтычны стол, за якім працаваў класік, ягоныя рукапісы, побач стаіць пішучая машынка, якую ён любіў значна менш за пяро.

Стваральнікі экспазіцыі пастараліся максімальна захаваць атмасферу тых часоў. Пакоі новага музея аздобленыя рэчамі хатняга ўжытку пачатку-сярэдзіны мінулага стагоддзя. Асобным комплексам вылучана ткацкая майстэрня, дзе кожны наведвальнік пры жаданні можа самастойна выткаць невялічкі сувенір на памяць.

Успаміны пра мясціны

Прыгадвае сын песняра, доктар тэхнічных навук Міхась Міцкевіч:

— Гэты будынак пабудавалі калісьці для Наталевіча, старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета як дачу для палявання, пераважна зімовага. Пасля дом, каб не прападаў, аддалі пісьменнікам. Нейкага асаблівага захаплення гэтымі мясцінамі не было, але пісалася добра, стравы гатаваліся смачныя, а самае галоўнае — тут збіраліся аднадумцы.

Мікола Аўрамчык расказвае, як у першыя пасляваенныя гады тут кіпела творчае жыццё:

— Сюды прыязджалі працаваць усе нашыя старэйшыя пісьменнікі. Наведваліся нават Міхаіл Ісакоўскі з жонкай, тут працаваў Усевалад Раждзественскі.

У гэтым месцы пісьменнікі не толькі працавалі, але і адпачывалі. Мікола Аўрамчык згадвае, што кожны дзень адсюль выпраўляўся аўтобус у горад, на якім яны ездзілі на службу. Побач знаходзілася крама, у якую хадзілі па прадукты. Ля самага плоту, у зацішку Міхась Лынькоў паліў кастры. Непадалёку — пляцоўка, дзе гулялі ў гарадкі. Асабліва любілі гуляць Максім Танк, Аркадзь Куляшоў і Кандрат Крапіва.

— Гэтае месца шмат чым звязана з нашай літаратурай. Пра яго напісаны ўспаміны і яшчэ больш вершаў. Тут пісаліся многія творы, і сюды прыязджаў шмат хто з супрацоўнікаў тагачасных часопісаў, газет і выдавецтваў — каб узяць інтэрв'ю ці рукапіс для друку.

Лідзію Арабей калісьці прадставілі ў гэтым месцы Якубу Коласу як маладую паэтку. Той папрасіў яе прывесці ў парадак ягоны архіў.

— ...Але мне не было тады яшчэ дваццаці гадоў. Я не разумела, да якога скарбу дакранулася і што я магла з той галавою карыснага зрабіць. Але ўбачыла і зразумела адно: да якой ступені Якуб Колас быў знітаваны са сваім народам. Я член Саюза пісьменнікаў з 1958-га года, і наглядзелася розных пісьменнікаў — але ніводнага не даводзілася сустрэць з такой знітаванасцю са сваім народам. Ён быў не толькі пісьменнік, але і грамадзянін.

Экспазіцыя ў Каралішчавічах працуе круглы год. Звязацца з новым своеасаблівым музеем можна таксама праз Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа.

Мікалай АНІШЧАНКА

На здымку: вядомыя літаратары краіны на адкрыцці экспазіцыі.

Фота аўтара

Да юбілею класікаў

У апошнія дні красавіка адбылася рабочая сустрэча пісьменнікаў Берасцейшчыны з намеснікам старшыні аблвыканкама Леанідам Цупрыкам, падчас якой вялася зацікаўленая размова наконт выкарыстання творчага патэнцыялу пісьменніцкай арганізацыі ў рамках святкавання юбілеяў класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы ды Якуба Коласа. Намечаны мерапрыемствы, звязаныя з наведваннем коласаўскіх мясцін на Піншчыне, у Лунінецкім ды Ганцавіцкім раёнах, сустрэчы з чытачамі. Асобным пунктам праходзіла падрыхтоўка кніг нарысаў пра моладзь Берасцейшчыны, яе жыццёвыя пазіцыі і арыенціры, пра тых юных працаўнікоў, хто ўносіць найбольшы ўклад у поспехі свайго калектыву і ўсяго рэгіёна. У гэтым плане ў літаратараў ёсць добрыя традыцыі, пэўныя напрацоўкі, якія сёння запатрабаваныя, як ніколі. Зацікаўлена разглядалася пытанне аказання фінансавай дапамогі тым пісьменнікам, хто прадэманструе найбольш глыбокае раскрыццё надзённых і важных тэм.

У абмеркаванні гэтых пытанняў бралі ўдзел пісьменнікі Анатоль Крэйдзіч, Мікалай Елянеўскі, Любоў Красеўская, Віктар Рэчыц, Аляксандр Валковіч і іншыя.

Незвычайная прэзентацыя

Адбылася прэзентацыя ў спецыялізаванай бібліятэцы інвалідаў па зроку ў Брэсце. Па-першае, яе галоўнымі дзейнымі асобамі былі паэты, якія, да ўсяго, з'яўляюцца яшчэ і інвалідамі; па-другое, у горадзе над Бугам увогуле ўпершыню прэзентавалася кніга, напісаная невідушчымі. "Инвалид я, без слов, — но душой я здоров. Тяжело устоять, но меня не сломать," — чытаў, хвалюючыся, Аляксандр Стасюк.

Усяго ў зборніку накладам 300 асобнікаў убачылі свет вершы адзінаццаці аўтараў. Рэдагаваў тэксты Алесь Каско. Укладальнікам выступіла Людміла Валюшка — загадчыца бібліятэкі і кіраўнік створанага ёю пры ўстанове літаб'яднання "Выток".

"Прачытайце гэтую кнігу, — звяртаецца да чытачоў аўтар прадмовы, старшыня абласнога аддзялення СПБ Анатоль Крэйдзіч, — і вы зразумееце, што сляпыя таксама маюць зрок. Унутраны. Ды такі востры, што ствараецца ўражанне, нібыта яны бачаць лепш за многіх відушчых..."

Антаніна КІТ

Успаміналі паэта

7 мая ў канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбыўся ўрачысты вечар "Вайна. Каханне. Перамога", прысвечаны памяці паэта-франтавіка Міхаіла Ясеня. Мерапрыемства было арганізавана па ініцыятыве кіраўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі, а таксама старшыні адміністрацыі Першамайскага раёна Мінска Валерыя Скакуна, які наведаў канцэрт і выказаў словы падзякі ўсім ветэранам-франтавікам, прысутным у зале. Ветэранаў прыйшло шмат, і свабодных месцаў амаль не было.

У канцэрце ўдзельнічалі даўнія сябры паэта, людзі, разам з якімі ён ствараў свае творы: спявачка Нэлі Багуслаўская, кампазітары Ізмаіл Капланаў, Віктар Войцік, Леанід Захлеўны і шматлікія іншыя дзеячы мастацтва. Прагучалі песні, якія сталі залатой вайсковай класікай.

Гавораць, што таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Міхаіл Ясень — відавочнае таму пацвярджэнне. Шмат дасягнуў на ніве мастацтва (першая прэмія Усесаюзнага конкурсу на лепшую савецкую песню ў кастрычніку 1966 года, якую ён атрымаў разам з кампазітарам Ігарам Лучанком за вядомую песню "Память сердца"; Ганаровая грамата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь за адметны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры), з'яўляўся лаўрэатам Усесаюзнага агляду тэхнічнай творчасці і аўтарам пятнаццаці вынаходстваў. Аднак, нягледзячы на тое, што паводле адукацыі Міхаіл Аронавіч быў інжынерам, найбольш поўна рэалізаваць свой талент яму ўдалося ў паэзіі.

Шматлікія песні на яго вершы, такія, як "Майский вальс", "Память сердца", "Письмо из 45-го", застаюцца вядомымі і любімымі далёка за межамі сінявокай. Гэтыя і шматлікія іншыя вершы былі напісаныя ад чыстага сэрца, бо паэт валодаў дарам глядзець на свет шчырымі вачамі. Вершы, якія ўвайшлі ў зборнік "Вайна. Любовь. Победа.", прысвечаныя не толькі ваеннай тэматыцы. Нямала радкоў у паэта з думкамі пра каханне, пра Беларусь, пра родны Мінск. Але, паводле слоў сына Міхаіла Ясеня, Леаніда Гольдмана, асноўнай тэмай творчасці яго бацькі з'яўляецца тэма "любові да жыцця". Напрыканцы сваёй прамовы ён пажадаў усім ветэранам, якія прысутнічалі ў зале: "Захоўвайце любоў да жыцця так, як захоўваў яе мой бацька!". Людзі з арганізацыі "Блокадники Ленинграда", якія наведаліся на мерапрыемства, шчыра прызналіся, што без гэтых вершаў і без гэтых песень ім было б намнога цяжэй пратрымацца ў абложным горадзе.

У канцэрце прагучалі і песні часоў Вялікай айчыннай вайны. Выкананыя Нэлі Багуслаўскай і Ізмаілам Капланавым "Катюша", "Брестская улица на запад нас ведет", "Давай закурим", "Темная ночь" былі сустрэтыя працяглымі апладысментамі ўсёй залы, якая проста зіхацела ад бляску ордэнаў і медалёў. Удзельнікі ансамбля народнай музыкі "Бяседа", кіраўніком якога з'яўляецца кампазітар Леанід Захлеўны, праспявалі песні на словы Міхаіла Ясеня "Синие глаза" і "С днём рождения, Победа!"

Завяршылася мерапрыемства гучаннем неўміручай кампазіцыі Д. Тухманава "День Победы", якую ўся зала слухала стоячы і падпявала.

Алег МАЛЕВІЧ

На здымку: ансамбль "Бяседа".

Фота аўтара

УМОВЫ правядзення конкурсу на замяшчэнне вакантных пасад творчага складу Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь

У конкурсе на замяшчэнне вакантных пасад творчага складу Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь маюць права ўзяць удзел музыканты з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія валодаюць неабходнымі навыкамі і практыкай ігры ў аркестравым калектыве. Асобы, якія жадаюць удзельнічаць у конкурсе, прадстаўляюць пісьмовую заяву ў дырэкцыю Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь. Да заявы дадаюцца:

а) копія дыплома аб вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

б) аўтабіяграфія;

в) характарыстыка з месца працы або вучобы;

г) праграма выступлення да 15 хвілін з двух рознахарактарных музычных твораў.

Конкурсная камісія мае права прапанаваць удзельніку праслухоўвання нотны матэрыял для чытання з ліста.

Удзельнікі конкурсу падаюць вышэйназваныя дакументы па адрасе: г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1, Палац Рэспублікі, п. 101 з пазнакай "На конкурс у Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь" у адміністрацыю аркестра да 31 мая 2007 г.

Конкурсная камісія закрытым галасаваннем выносіць рашэнне па выніках праслухоўвання. Рашэнне прымаецца большасцю галасоў пры наяўнасці не менш як 75 працэнтаў членаў камісіі.

Даведкі па тэлефоне 216 21 79 (адміністрацыя Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь).

Рэспубліканскі літаратурны конкурс

Зацверджана інструкцыя аб рэспубліканскім конкурсе на лепшы твор года ў галіне паэзіі, прозы, драматургіі, літаратурнай крытыкі, дзіцячай літаратуры. Заснавальнікамі конкурсу з'яўляюцца міністэрствы інфармацыі, культуры, адукацыі Рэспублікі Беларусь, таксама Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт і грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі».

Пад стрэламі Купідона

Ганаровым сімвалам конкурсу літаратараў стане прыгожы хлопчык Купідон з кніжкаю ў руках. Сёлета спаборніцтва паміж майстрамі слова абвешчана ўпершыню — і адразу па пяці намінацыях.

Ужо створана журы новага рэспубліканскага конкурсу, старшынёй якога з'яўляецца намеснік міністра інфармацыі Ігар Лапцёнак, намеснікам — акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Гніламёдаў. У складзе журы таксама намеснік міністра адукацыі Таццяна Кавалёва, намеснік міністра культуры Валерый Гедройц, лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі Беларусі Уладзімір Карызна і Валянцін Лукша, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура», першы сакратар СПБ Віктар Праўдзін, дырэктар рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і Мастацтва», лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» Алесь Карлюкевіч, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Алесь Савіцкі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва Валянціна Паліканіна, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка» Уладзімір Ліпскі.

— Пэўна, мы дадамо яшчэ шостую намінацыю — за лепшы сатырычны альбо гумарыстычны твор, — зазначае старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ, да якога мы звярнуліся па каментарыі.

— Мікалай Іванавіч, якая мэта новага творчага конкурсу?

— Пашырыць магчымасці папулярызацыі кнігі. І, зразумела, беларускіх аўтараў. У кожнай з намінацый будзе вызначаны пераможца, якому мы ўручым дыплом і прыз-сімвал, прэмію ў памеры 15 базавых велічынь. За другое месца чалавек атрымлівае прэмію ў 10 базавых велічынь і дыплом, крыху меншую прэмію — у 5 базавых велічынь і дыплом атрымаюць уладальнікі «бронзы».

Аднайменныя секцыі распачалі працу па вызначэнні лепшых твораў з тых, што пададзены ў камісіі. Па прадстаўленні абласных і Мінскай гарадской пісьменніцкіх арганізацый творы будуць разглядацца на бюро і выносіцца на прэзідыум. Пасля гэтага ўсе прапановы паступяць у журы.

— Ці патрэбна пры гэтым першапачатковая рэкамендацыя калектыву, у якім чалавек працуе, альбо рэдакцыі, дзе аўтар друкаваўся?

— Не працоўныя калектывы, а менавіта творчыя арганізацыі рэкамендуюць да разгляду вартыя апавяданні, раманы і вершы.

— Гэта будзе штогадовы конкурс?

— Штогадовы. На жаль, здарылася так, што мы крыху запазніліся з-за чыноўніцкай валакіты з інструкцыяй-палажэннем. Напачатку думалі заснаваць конкурс толькі для сяброў саюза і аб'явілі яго ўмовы ва ўсіх абласных аддзяленнях СПБ. Таму зараз ужо маем шмат прадстаўленых твораў. Пабачыўшы іх, зразумелі: межы конкурсу трэба пашыраць ды павышаць яго значнасць. Вось тады мы і павялі перамовы з іншымі арганізатарамі. Таму перапісвалі інструкцыю, затым доўга яе зацвярджалі. Але гэта першая спроба, наступным жа разам усе будуць ведаць, што дакументы і матэрыялы трэба накіроўваць у Саюз пісьменнікаў Беларусі да 15 студзеня бягучага года, а вынікі падводзяцца да 1 сакавіка.

— У сувязі з тым, што сёлета конкурс праводзіцца ўпершыню, ці магчымы разгляд публікацый мінулых гадоў?

— Не, будуць ацэньвацца творы, выдадзеныя на працягу папярэдняга года. Магчыма, і трэба было б зрабіць намінацыю кшталту «Лепшая кніга мінулых гадоў» — падумаем.

— Конкурс адкрыты, гэта значыць, у ім змогуць паўдзельнічаць і тыя, хто не з'яўляецца сябрам СПБ?

— Зразумела, мы будзем разглядаць усе прапановы, галоўнае, каб быў выдатны, варты ўвагі твор.

— Гэта абавязкова павінна быць кніга?

— Калі твор надрукаваны ў літаратурным часопісе, ён будзе разглядацца. Прычым, пашырэнне тэматыкі ў межах конкурсу таксама магчымае. Першыя нашыя крокі пакажуць мэтазгоднасць задуманага. У будучым, верагодна, з'явяцца і іншыя намінацыі, скажам, па літаратуры дэтэктыўнай — яна запатрабаваная чытачом і заслугоўвае таго, каб быць адзначанай. Мы збіраемся сёлета вылучаць лепшы твор па дзіцячай тэматыцы, не лішне пры гэтым звярнуць увагу і на маладзёжную аўдыторыю ды яе куміраў. Мы хацелі б таксама дэталізаваць намінацыі ў галіне прозы. Нашая яшчэ адна бяда — адсутнасць літаратурнай крытыкі, таму абавязковым бачыцца пункт «навуковая праца па літаратуры». Я ж увогуле лічу, што ў нашых тоўстых літаратурных часопісах павінны быць моцныя крытычныя артыкулы. Справядлівая дэталёвая ацэнка творчасці пісьменніка спрыяе яму ў працы: немагчыма развіццё літаратуры без крытыкі.

— Па якіх намінацыях прадстаўлена найбольш твораў цяпер ужо?

— Па прозе і дзіцячай літаратуры. Шмат ёсць новых паэтычных кніг. Але паслухаем, што нам скажуць секцыі. Можа, з'явяцца новыя ідэі, бо сэнс конкурсу павінен памагчы і нам самім вызначыцца: якія галоўныя напрамкі развіцця літаратуры неабходна распрацоўваць надалей. Свет сур'ёзна змяніўся, і маральныя каштоўнасці мінулага — гэта аснова, база; высокадухоўныя ж творы заўсёды цэняцца, але ў літаратуры ва ўсе часы гучала і нешта сваё, новае, яго таксама нельга не ўлічваць. Пісьменнікі павінны заўважаць, што непакоіць людзей сёння. Таму і звернем увагу на ўсё выдадзенае ў Беларусі і пра Беларусь.

— А што выйшла ў свет па-за межамі сінявокай?

— Так, у нас ёсць нават сябры Саюза пісьменнікаў — не грамадзяне Беларусі. Калі яны прадставяць свае творы — разгледзім. Падыход просты: усё, што пойдзе на карысць айчыннай літаратуры, павінна быць улічана. Ёсць у нас прапановы праводзіць конкурс, а дакладней — падводзіць яго вынікі падчас дзён беларускага пісьменства, але, на нашу думку, ён павінен стаць самастойным дзействам, каб людзі маглі пазнаёміцца з новымі — лепшымі! — кнігамі, з іх аўтарамі, каб быў канцэрт з песнямі на вершы нашых паэтаў... І вельмі хочацца, каб гэты новы конкурс стаўся сапраўдным святам кнігі.

Гутарыла Ірына ТУЛУПАВА

Фота Кастуся Дробава

«ЛіМ» у Гомельскім універсітэце

Працягваецца цыкл імпрэз, якія арганізуюць у абласных бібліятэках і навучальных установах краіны супрацоўнікі газеты "ЛіМ" і РВУ «Літаратура і Мастацтва».

Сустрэча са студэнтамі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны праходзіла ў адной з аўдыторый, па-за сценамі якой гучалі, напамінаючы пра пачатак заняткаў і іх заканчэнне, званкі. Гаворка быццам і была абмежаваная ў часе, але нязмушаная «лекцыя», што і па форме, і па змесце вылучалася са звычнага раскладу дня, сабрала ў зале шмат студэнтаў.

На кафедры беларускай літаратуры творцы, пісьменнікі, ды паэты бываюць часта. Добрыя стасункі ўсталяваліся тут і з нашым штотыднёвікам. Гэтым разам дыялог распачала супрацоўніца аддзела крытыкі газеты «Літаратура і мастацтва», кандыдат філалагічных навук Ірына Шаўлякова, зазначыўшы, што ў Беларусі сфарміравана адмысловая літаратурна-крытычная школа і яе рэальнае ўвасабленне можна знайсці на старонках «ЛіМа» — у рубрыцы «Крытычны практыкум», дзе, між іншым, публікацыі студэнтаў складаюць большасць матэрыялаў.

Але мастацкая частка і гісторыка-публіцыстычная на такіх сустрэчах арганічна спалучаюцца ў адно. І вядуцца яны часцей за ўсё «не паводле пратакола». Выступленні ж Анатоля Зэкава рэдка абыходзяцца без імправізацый, гумару і жартаў. Ён згадаў пра планы часопіса «Полымя», адказаў на пытанні, кшталту «якія яго ўспаміны звязаныя з універсітэтам?» Успаміны, зразумела, самыя найлепшыя, бо студэнцтва — гэта маладосць. Калі ж па просьбе слухачоў Анатоль пачаў чытаць свае лірычныя вершы і пародыі — на Р. Баравікову, В. Куртаніч ды інш., у дзверы аўдыторыі знарок няўпэўнена, быццам вучань, які спазняецца на ўрок, зазірнуў загадчык кафедры беларускай літаратуры, прафесар Іван Штэйнер. І, атрымаўшы «дазвол» студэнтаў: «уваходзьце, прафесар», — адразу падхапіў жартаўлівы настрой моладзевай аўдыторыі: — "Са мной яшчэ двое!"

Да гутаркі пра сучасны літаратурны працэс далучыліся дырэктар РВУ «Літаратура і Мастацтва» Алесь Карлюкевіч і былы выпускнік ГДУ, а цяпер галоўны рэдактар «ЛіМа» Анатоль Казлоў.

Яны расказалі пра установу, выданні РВУ, а таксама пра новыя рубрыкі ў газеце, пра сучасныя аддзелы публіцыстыкі ды мастацтва, новыя творы пісьменнікаў, што будуць друкавацца на старонках газеты ў бліжэйшы час. Таму студэнты закцэнтавалі ўвагу на думцы, што каб паспяхова здаць іспыты падчас сесіі, не лішне мець пад рукой свежы нумар "ЛіМа" — таму што будучыя філолагі могуць своечасова знайсці ў літаратурным выданні падказку. А адшукаць неабходны экземпляр можна ў сваёй паштовай скрыні: сістэма льготнай падпіскі на выданне эфектыўна дзейнічае. Так, ёсць асобны індэкс «ЛіМа» для настаўнікаў.

— А ці будзе такі і для студэнтаў? — на справядлівае пытанне самых уніклівых слухачоў адказаў дырэктар РВУ «Літаратура і Мастацтва» Алесь Карлюкевіч: абавязкова будзе. І калі не ў гэтую падпіску, то з 1 кастрычніка шукайце свой, «студэнцкі», індэкс «ЛіМа» ў каталогах беларускіх выданняў.

Акрамя зместу, творчых планаў часопісаў «Маладосць», «Полымя», «Всемирная литература», «Нёман» і газеты «ЛіМ», гендэрных праблем літаратурнай крытыкі, дасціпных студэнтаў цікавілі і аўтарскія задумы саміх аўтараў. Не дзіва: на кафедры беларускай літаратуры, якой сёлета спаўняецца 37 гадоў, сярод традыцый, сфарміраваных дзесяцігоддзямі, галоўная — павага да роднага слова. Да свайго паважнага юбілею (35 гадоў) тут падрыхтавалі кнігу «Універсітэт літаратурны». Яе укладальнік прафесар Іван Штэйнер падарыў асобнік для рэдакцыйна-выдавецкай установы. Прынамсі, калісьці існавала добрая традыцыя — выданне студэнцкіх паэтычных зборнікаў. Так, памятаецца, выйшлі ў свет «Маладыя галасы», «Тутэйшыя»...

На заканчэнне сустрэчы ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце ўдзельнікаў гутаркі запрасілі да супрацоўніцтва з літаратурнымі выданнямі: каму, як не знаўцам беларускай літаратуры ды мастацтва, быць нашымі аўтарамі...

Ірына ТУЛУПАВА

На здымку: А. Карлюкевіч, І. Штэйнер, І. Шаўлякова, А. Казлоў.

Фота Віктара Кавалёва

Перамогу кавалі разам

У часы Вялікай Айчыннай мала хто з сённяшніх яе ветэранаў думаў пра тое, з якой рэспублікі ягоны таварыш па атацы, хто да якой нацыянальнасці належыць...

Такімі яны засталіся на ўсё жыццё, што яшчэ раз было пацверджана ў час святочнага мерапрыемства, прымеркаванага да Дня Перамогі, якое для ветэранаў — членаў Саюза пісьменнікаў і Саюза кінематаграфістаў Беларусі наладзіла на днях Пасольства Расійскай Федэрацыі.

У пранікнёных словах, што прагучалі з вуснаў старшыні пісьменніцкай арганізацыі краіны М. Чаргінца, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Расіі ў Беларусі А. Сурыкава, пісьменнікаў-ветэранаў У. Федасеенкі, А. Савіцкага і іншых. Галоўным лейтматывам было адно — мы разам, і раз'яднаць народы Беларусі і Расіі немагчыма.

Для ветэранаў спявалі майстры мастацтваў — Святлана Зелянкоўская, Вера Палякова, чыталі мастацкую прозу народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч, дэманстраваліся дакументальныя фільмы...

Пасол Расіі ўручыў ветэранам каштоўныя падарункі.

Нельга не адзначыць і адміністрацыю кінатэатра "Цэнтральны", якая зрабіла ўсё магчымае, каб свята атрымалася.

Анатоль АЎРУЦІН,
першы сакратар
Саюза пісьменнікаў Беларусі

На здымку: Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі А. Сурыкаў і пісьменнік А. Сульянаў.

Фота А. Лябедзіка

Чатыры гадзіны працягваўся ў Палацы Рэспублікі дабрачынны канцэрт народнага артыста СССР Іосіфа Кабзона. У зале прысутнічала шмат ветэранаў, людзей з узнагародамі, якія яны надзяваюць на касцюмы і сукенкі, на жаль, толькі па святах.

Іосіф Кабзон — мінчанам

Прыехалі да мінчан таксама Маскоўскі камерны хор і Ансамбль песні і танца Міністэрства ўнутраных спраў. Знакаміты спявак выказаў сваё захапленне чысцінёй і прыгажосцю горада, Беларуссю, адзначыў, што прыехаў са сваёй жонкай Нэлі, з якой пражыў 36 гадоў, паведаміў, што мае 5 унучак. Ля раяля ўжо 30 гадоў яго сябра, народны артыст Расіі Аляксей Еўсянкоў. Гучалі рамансы, песні многіх аўтараў. Асабліва адзначыў І. Кабзон Ігара Лучанка, папрасіўшы: "Пасвяціце, калі ёсць у каго ліхтары, на кампазітара". І калі святло сафітаў асвятліла твар нашага знакамітага земляка, зала не паскупілася на апладысменты.

Было шмат букетаў, і трэба было бачыць, як І. Кабзон разгортваў іх і ўручаў па кветачцы жанчынам — удзельніцам канцэрта. І на заканчэнне — букет ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. Вядома ж, самы вялікі і самы прыгожы, бо не толькі ад кіраўніка дзяржавы, але і ад усіх удзячных ветэранаў, якія атрымалі асалоду ад канцэрта.

Валянціна СМАНЦАР

«Тут страляюць толькі па мішэнях»

Сайт Міністэрства абароны Беларусі (www.mod.mil.by) існуе ўжо больш як пяць год. Увесь гэты час ён упэўнена займае адно з першых месц сярод электронных СМІ краіны. Сведчанне таго — шматлікія прэміі, заваяваныя на прафесійных спаборніцтвах і выставах. Вось і нядаўна, на XIV Беларускім форуме па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях "ТІВО-2007", вайскоўцы зноў атрымалі перамогу — інтэрнет-сайт "Дзецям пра армію" заваяваў першае месца ў раздзеле "Сайт для дзяцей і юнацтва". Сёння наш субяседнік — галоўны рэдактар сайта Міністэрства абароны Беларусі палкоўнік Андрэй Шубадзёраў.

— Андрэй Юр'евіч, хачу спытаць вас — для чаго Міністэрству абароны свой сайт, якія задачы ён вырашае і на каго разлічаны?

— Перш за ўсё трэба адзначыць, што галоўная мэта армейскага сайта, які існуе ў беларускай, рускай і англійскай версіях, — гэта інфармаванне грамадства нашай краіны, наведвальнікаў сайта з іншых дзяржаў пра ўсё тое, што адбываецца сёння ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь.

Неабходнае адступленне

Не лішне будзе дадаць, што "рухавіком", які паспрыяў з'яўленню ў сусветным павуцінні вайсковага сайта, быў міністр абароны нашай краіны генерал-палкоўнік Леанід Мальцаў. У Беларусі яго невыпадкова лічаць рэфарматарам нацыянальнай арміі. У пачатку 2000-х ён выпусціў кнігу пра сучасныя падыходы пры вядзенні баявых дзеянняў, у якой ён зрабіў даволі абгрунтаваную выснову, што пры цяперашніх тэхналогіях і перспектывах іх развіцця вядомае сцвярджэнне Клаўзевіца пра тое, што вайна як працяг палітыкі ўзброеным шляхам у значнай ступені састарэла і, можна сказаць, зусім страціла сэнс. "Сёння ў вайне можна перамагчы без адзінага стрэлу, — упэўнены міністр абароны. — Калі раней вайна была практычна толькі ўзброенай барацьбой, то цяпер з'явіліся іншыя сродкі націску: інфармацыйныя, эканамічныя і псіхалагічныя. Адсюль выцякаюць і адпаведныя задачы. Міністэрства абароны Беларусі павінна прыстасавацца да сучасных умоў і вучыцца, таму што мы забяспечваем ваенныя складнікі нацыянальнай бяспекі краіны".

На кожным з чатырох буйных эксперыментальных вучэнняў, якія праводзяцца ў рэспубліцы кожны год (пачынаючы з 2001-га, калі генерал-палкоўнік Леанід Мальцаў узначаліў ваеннае ведамства), заўсёды распрацоўваліся як пытанні супрацьстаяння інфармацыйнаму і псіхалагічнаму ўздзеянню на войскі з боку магчымага праціўніка, так і тэхніка аднолькавага роду ўдару саміх беларускіх вайскоўцаў. Прытым, гэта рабілася не метадам распаўсюджвання прапагандысцкіх паштовак і палітычных агітацыйных гутарак на радыё, як гэта практыкавалася ў час другой сусветнай вайны... Інфармацыйныя войны, як вядома, маюць пастаянны характар. І Беларусь гэта адчувае на сабе кожны дзень.

— Сайт — гэта жывая істота.

Яго напаўненне, новыя праекты падказвае само жыццё. У 2003 годзе, напрыклад, мы стварылі «Віртуальны ваенкамат», куды можа звярнуцца кожны будучы салдат у зручны для яго час. Як зрабіць ваенную кар'еру, даведацца пра ўмовы прызыву і нясення службы, паскардзіцца на начальнікаў і самому пазбегнуць пакарання за адмову служыць у арміі — пра ўсё гэта можна даведацца ў "Віртуальным ваенкамаце" на працягу аднаго дня. Ідэя стварэння дадзенага праекта ўзнікла сама па сабе — 90 працэнтаў усіх пытанняў, якія паступаюць на сайт Міністэрства абароны, у асноўным, датычаць прызыву.

Праца над паляпшэннем сайта працягваецца. У будучым замест разрозненых армейскіх сайтаў будзе створаны моцны ваенны партал, у які ўключаць, акрамя сайта Міністэрства абароны, web-сайты ваенных сродкаў масавай інфармацыі, галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра, а таксама аўтаматызаваную сістэму пошуку інфармацыі па пытаннях абароны, прызыву, і зону частковага доступу па пытаннях навучання, якая зараз ствараецца...

— Своеасаблівым і адзіным на постсавецкай прасторы стаў новы інтэрнет-рэсурс "Дзецям пра армію". Кажуць, што на працягу першых дзён пасля адкрыцця яго наведала каля паўмільёна карыстальнікаў з многіх краін свету. Раскажыце, калі ласка, пра гэта падрабязней.

— Летам мінулага года ў сусветным павуцінні мы адкрылі сайт для самых юных грамадзян Беларусі. Ён так і называецца — "Дзецям пра армію" (www.deti.mil.by). 14 ліпеня 2006 года на базе 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады адбылося яго афіцыйнае прадстаўленне. Узяла старт новая інтэрнет-крыніца з лёгкай рукі самога міністра абароны генерал-палкоўніка Леаніда Мальцава. Навінка стала важнай часткай у моцнай структуры інфармацыйнага забеспячэння, ужо пабудаванага і на працягу некалькіх год дзеючага ў рамках не толькі Міністэрства абароны, але і ў рэспубліцы ў цэлым. Гэта сістэма ахоплівае і маладое пакаленне нашых грамадзян, але неставала яшчэ аднаго "дзіцячага звяна" — электроннага. Да ведама, на постсавецкай прасторы падобнага роду web-рэсурс з'явіўся ўпершыню ў Беларусі. Але ж і беларусы тут не першапраходцы — для замежжа такія звароты вайскоўцаў да дзяцей праз Інтэрнет звычайныя. Такія ж віртуальныя старонкі існуюць у шэрагу краін Заходняй Еўропы і ў Злучаных Штатах Амерыкі. Менавіта кіраўнік беларускага ваеннага ведамства і пазначыў суперзадачу www.deti.mil.by: "Мы не ставім пытанне — будзь вайскоўцам, а ставім пытанне: будзь патрыётам сваёй Радзімы". Афіцыйна web-праект "Дзецям пра армію" створаны з мэтай інфармавання школьнікаў пра дзейнасць Узброеных Сіл Беларусі і пра парадак нясення ваеннай службы.

Неабходнае ўдакладненне

"Пры стварэнні сайта дамагаліся таго, каб на ім не было жорсткасці, якую мы бачым у замежных баевіках альбо ў камп'ютэрных гульнях! — адзначыў міністр абароны. — На ім дзеці не ўбачаць забойстваў, тут страляюць толькі па мішэнях". Стваральнікі сайта "Дзецям пра армію", паводле іх слоў, ставілі перад сабой задачу "не прывучаць дзяцей да крыві", супраць чаго цяпер выступае грамадскасць як у Беларусі, так і ў Расіі. Але ж ёсць і другая задача — страляючы толькі па мішэнях, гуляючы ў даступныя, спецыяльна створаныя для іх гульні, дзеці не толькі не будуць жорсткімі, але і навучацца біць ворага інтэлектуальна. Між тым, карыстальнікі сайта — будучыя салдаты — у момант спаборніцтва не толькі асвойваюць армейскія нарматывы, але і выпрацоўваюць неабходныя мужчынскія якасці, якіх сёння многім з іх не хапае.

— Дзіцячы сайт у нас прадстаўлены дзвюма версіямі: для дзяцей ва ўзросце ад 6 да 12 год і для падлеткаў ад 12 да 18 год. Навігацыя яго здзяйсняецца незвычайным спосабам: юныя наведвальнікі ажыццяўляюць віртуальную экскурсію па ваенным гарадку. Сайт пачынаецца з кантрольна-прапускнога пункта. Тут жа ўсіх сустракае першая цікавая асоба — радавы Армейкін... У залежнасці ад узросту наведвальніка суправаджае хлопчык Алесь і яго сабака Трэзор альбо Лёха і Свецік. Сталовая, клуб, палігон, заняткі па страявой і баявой падрыхтоўцы...Адзін віртуальны дзень у ваенным гарадку праходзіць у гульні. Вядома, што інфармацыя, якая падаецца ў момант гульні, дапамагае дзецям з лёгкасцю ўспрымаць любую перамену сітуацыі. У версіі для малодшых школьнікаў пераважае візуальная інфармацыя, а тэксты невялікія і зручныя для ўспрымання, таму што напісаныя "дзіцячай" мовай. А вось для старэйшых класаў даецца больш падрабязная інфармацыя. Асаблівасцю новага сайта з'яўляецца прысутнасць флэш-гульняў, кожная з якіх спрыяе замацаванню і віртуальнаму выкарыстанню ведаў, атрыманых на старонках сайта.

Каб пашырыць аўдыторыю сайта і зрабіць больш даступнай для маладога пакалення інфармацыю пра армію, мы аб'явілі штогадовыя конкурсы на лепшае сачыненне, малюнак і фотаздымак, прысвечаныя Узброеным Сілам Рэспублікі Беларусь. Не так даўно адміністрацыя сайта падвяла вынікі праведзенага конкурсу ў намінацыях "Ліст салдату", "Дзіцячы малюнак пра армію", "Фотаздымак пра армію". 5 мая 2007 года на XI Міжнароднай спецыялізаванай выстаўцы "СМІ ў Беларусі" адбылося ўзнагароджанне пераможцаў міністрам абароны Рэспублікі Беларусь. Ім былі ўручаны дыпломы і каштоўныя падарункі. Але ж адзначу, што конкурс працягваецца і з кожным днём да спаборніцтва далучаюцца ўсё новыя і новыя ўдзельнікі.

— Гэта праўда, што неўзабаве віртуальны праект "Дзецям пра армію" прыме форму цікавай, не зусім звычайнай кнігі і з'явіцца ў продажы?

—Улічваючы асаблівасці псіхалогіі сучаснага падлетка (цяга да камп'ютэра) і невялікія магчымасці бацькоў (карыстальнікамі камп'ютэрнай тэхнікі з'яўляецца невялікі працэнт беларусаў), мы прыйшлі да высновы, што гэты дзіцячы праект трэба працягваць, але ў выглядзе прыгожа афармленай кнігі. У асноўным яна адлюструе змест сайта "Дзецям пра армію", толькі пазнавальная інфармацыя пра армію будзе пададзена ў выглядзе развіццёвых гульняў, заданняў, шматлікіх конкурсаў, у тым ліку і ў выглядзе расфарбовак. Да ведама, сама кніга будзе нагадваць мару любога хлопца — афіцэрскую сумку, якая зручна абсталявана, дзе, напрыклад, можна будзе захоўваць ручкі, алоўкі... Для працы над кнігай "Дзецям пра армію" (Кніга будучых камандзіраў) прыцягваецца вялікі аўтарскі калектыў з прадстаўнікоў міністэрстваў абароны і адукацыі.

Гутарыў Валерый КРУЧКО

На плац — з кнігай

Падчас вайны вялікую ролю ў падтрыманні баявога духу адыгрывалі кнігі і артыкулы нашых славутых літаратараў. А якія кніжкі чытаюць будучыя вайскоўцы сёння? І ўвогуле, якое месца займае культура і мова ў патрыятычным выхаванні? Па адказ на гэтыя пытанні мы выправіліся ў мінскае Суворaўскае вучылішча.

— У нас няма самамэты вышкаліць навучэнцаў, зрабіць з іх толькі ваенных. Наша задача шырэйшая — зрабіць курсанта прафесіяналам, чалавекам шматгранным, — гаворыць Іван Рогач, які ўзначальвае бібліятэчны фонд установы.

Фонд бібліятэкі налічвае 65 тысяч кніг. Калі навучэнцы маюць ахвоту да чытання, то могуць знаходзіцца ў чытальнай зале да дзевяці гадзін вечара.

На 1 красавіка на абанеменце запісана 616 чалавек, у чытальнай зале — 582. Пры тым, што колькасць навучэнцаў вучылішча каля 500 чалавек. Прыведзеныя лічбы сведчаць: паслугамі бібліятэкі карыстаецца і персанал навучальнай установы.

У мінулым годзе ў бібліятэцы было зафіксавана 6.477 наведванняў, больш як 10 тысяч кнігавыдач. У тым ліку грамадска-палітычнай літаратуры — больш як 900 кніжак (агульная колькасць выдач у чытальнай зале і на абанеменце), ваенна-тэхнічнай — каля 1200 асобнікаў. Адметна, што вялікай папулярнасцю карыстаецца ў навучэнцаў Суворaўскага вучылішча мастацкая літаратура — на яе прыпадае больш як 40 працэнтаў выдач.

— Спісваецца шмат літаратуры, якая адслужыла сваё, але яшчэ больш прыходзіць новых паступленняў, — распавядае Іван Іванавіч. — Цягам 2006 года ў фонд бібліятэкі паступіла 4.300 асобнікаў літаратуры на суму больш як 16 мільёнаў рублёў. У тым ліку асноўны фонд папоўніўся 3,5 тысячамі кніжак (у асноўным гэта вучэбная літаратура). У бібліятэцы праведзена каля 50 кніжных выставак, 11 тэматычных вечароў, 42 літаратурныя агляды. Супрацоўнічаем з бібліятэкамі горада, завязваем з імі цесныя кантакты, іх прадстаўнікі наведваюць наша вучылішча.

«Паўлінка»" ў Суворaўскім

— Якія кніжкі больш за ўсё карыстаюцца папулярнасцю сярод навучэнцаў?

— З беларускай літаратуры гэта ў асноўным праграмныя творы. Акрамя іх, чытаюць таксама Дайнеку, Арлова, Рыбака, Чаргінца. Мы падпісваемся на ўвесь спектр беларускіх часопісаў: "Беларусь", "Алесю", "Нёман". "ЛіМ" прыходзіць на кафедру мовы.

Зразумела, навучаюцца тут прадстаўнікі малодшага ўзросту, якім цікавыя прыгоды, а таксама гістарычная, навукова-фантастычная літаратура, фэнтэзі. Папулярная ў нас і ваенная тэматыка: творы і дакументальныя аповеды пра вайну, ваенную тэхніку, славутых палкаводцаў, герояў-патрыётаў.

Навучэнцы пішуць вершы, у тым ліку і па-беларуску. Друкаваліся ў асноўным у газетах "Во славу Родины", "На страже", а таксама ў іншых выданнях.

Песні, вершы, прысвечаныя Суворaўскаму вучылішчу, складаюць сучасныя беларускія аўтары. Напрыклад, колішні выпускнік установы генерал-маёр Міхаіл Гец стаў аўтарам "Суворaўскага вальса" — кампазіцыі, якая традыцыйна ўжо выконваецца на ўсіх урачыстасцях у вучылішчы. Супрацоўнічаюць з суворaўцамі і іншыя майстры; часты госць — кампазітар Ігар Лучанок.

Наведваюць установу і знакамітыя літаратары. Паводле Івана Рогача, апошнім часам выступалі ў сценах установы Анатоль Сульянаў, Леанід Гаўруковіч.

— Амаль штомесяц сустракаюцца з навучэнцамі літаратары, бо ў рамках бібліятэчнай гадзіны мы запрашаем прадстаўнікоў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Сцэнарый да такіх мерапрыемстваў пішам сумесна з кафедрай рускай і беларускай моваў.

Увогуле, тэатралізаваныя прадстаўленні — неад'емная частка пазавучэбнага працэсу. Іван Рогач згадвае, што напярэдадні апошніх навагодніх святаў, да прыкладу, навучэнцы ставілі на суворaўскай сцэне своеасаблівае "папуры" паводле п'ес беларускіх класікаў на матывы "Паўлінкі".

Міхась АКАВІТАЎ

На здымку: кіраўнік бібліятэкі Іван Рогач дэманструе кніжныя фонды.

Фота аўтара

— Дровы нам завозяць, на гэта мы не скардзімся. Дзе торфабрыкет патрэбен, дзе паравое ацяпленне...

Наша гутарка з дырэктарам Капыльскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Таццянай СЕРАЙ распачынаецца з праблем гаспадарчых. Клопаты быццам з мінулага стагоддзя: каб цёпла ды ўтульна было ў сучасным асяродку культуры, трэба назапашваць для яго... дровы. У цэнтралізаванай сістэме раёна — 41 бібліятэка. Галоўная, раённая і дзіцячая, месцяцца ў адным памяшканні амаль у цэнтры Капыля, ёсць яшчэ 39 сельскіх, сярод якіх 5 бібліятэк-клубаў — такая новая форма ўстановы культуры. Вядома, што і праца тут наладжана па-новаму. Але і пра маленькія бібліятэчкі не забываюцца...

Калі ў бібліятэцы холадна, у ёй няўтульна

Ад хаты-чытальні да бібліятэкі-клуба

— Мала ў нас населеных пунктаў, дзе можна размясціць асобную бібліятэку — надта ж дробныя зоны абслугоўвання. Трэба было вырашаць: альбо мы зачыняем бібліятэку і робім яе толькі на цэнтральнай сядзібе калгаса альбо саўгаса, ці ствараем бібліятэку-клуб, — працягвае дырэктар. — Не шыкоўныя, але даволі прыстойныя бібліятэкі-клубы атрымаліся. Дзе ёсць, прыкладам, стаўкі музыканта-акампаніятара (гэта чалавек, які вядзе адмысловыя гульневыя праграмы, мастацкую самадзейнасць) і бібліятэкара — як загадчыка бібліятэкі-клуба.

Такая форма зручная ўдвая: памяшканне, якое нярэдка, асабліва ў так званых неперспектыўных вёсках, пустуе, атрымлівае гаспадара. А вёска мае ўстанову культуры — няхай сабе і комплексную. І колькі б не мелася чытачоў, літаратуру тут фарміруюць зыходзячы з іх запатрабаванняў.

— Там, дзе бібліятэкі функцыянуюць разам з клубамі — пераважна цэнтральнае ацяпленне, у некаторых установах выкарыстоўваем і сучасныя энергазберагальныя тэхналогіі, калі ацяпляецца толькі неабходная частка памяшкання, найчасцей — фонды. А дровы нам пастаўляюць па дамовах лясгасы. Узімку не раз даводзілася нагадваць качагарам, каб эканомна расходавалі і торфабрыкет, і дровы, — распавядае Таццяна Пятроўна, — бо калі ў бібліятэцы холадна, у ёй няўтульна. Дарэчы, лясгасы дапамагаюць камплектаваць фонды прыродазнаўчай літаратурай, яна неабходная: многія рэгіянальныя бібліятэкі, у тым ліку і цэнтральная, удзельнічаюць у прапагандзе экалагічных праграм.

Ва ўстановах культуры раёна традыцыйныя падыходы спалучаюцца з новымі прыёмамі працы. І тут таксама гаворыць пра камп'ютэрызацыю працэсаў. Гарадская, альбо, як яе называюць — цэнтральная раённая бібліятэка, мае свой сайт у Інтэрнеце, у камп'ютэры чытач можа знайсці інфармацыю па любой тэматыцы — яна захаваная на асобных файлах, тут жа — згадкі пра кнігі, якія можна спытаць на абанеменце, каб мець інфармацыю рознабаковую. Сіламі аматараў-краязнаўцаў створаны фільм пра Капыль — яго можна паглядзець па камп'ютэры. Але побач на паліцах размешчаны асобныя папкі, дзе акуратныя старонкі напісаныя каліграфічным почыркам — дапаможнікі для тых, хто не авалодаў сучаснымі тэхналогіямі.

На мясцовым узроўні рэальна існуе цэнтралізацыя фондаў і адбору літаратуры. Аддзел камплектавання мае сувязі з выдавецкімі арганізацыямі, набывае літаратуру ў кнігарнях. Тут жа ёсць звесткі па структуры чытачоў у кожнай вясковай бібліятэцы — па ўзросце і нават па профілі гаспадаркі. Дзе сеюць лён, дзе птушку гадуюць, ці тэхніку рамантуюць — заказы адпаведныя, так званая літаратура эканамічнага профілю. Сельскія бібліятэкары складаюць картатэку заказаў, якія накіроўваюць у бібліятэку цэнтральную. Нават, калі выданне прыйшло ў адным экземпляры, але яно ёсць, яго могуць прачытаць ва ўсіх навакольных вёсках. Такая форма ўнутрысістэмнага абмену фондамі вельмі выгадная. Прычым, шмат літаратуры бярэцца якраз з сельскіх бібліятэк — яны маюць выдатныя зборы па аграрнай літаратуры. Фонд — мабільны, таму надзвычай запатрабаваны.

Чытач ЦБС

У невялічкай вёсачцы Капыльшчыны Канюхах — на радзіме Алеся Адамовіча — таксама ёсць бібліятэка. Хаця хат тут засталося няшмат: вёска пусцее. Не кожны з жыхароў ходзіць у бібліятэку. Затое папулярызацыя кнігі можа быць стопрацэнтнай: калі чалавек чытае нешта на яго погляд вартае — абавязкова прапаноўвае суседу. Пра што ж яшчэ распавядаць аднавяскоўцам? А сустрэча з новай кнігай — што знаёмства з чалавекам: ніяк яго не прамінеш. Але ў Канюхах яшчэ знаходзіцца школа-інтэрнат: школьнікі ж ва ўстановах культуры — найактыўнейшыя карыстальнікі. Тым Канюхі і асаблівыя, што маюць каля 350 чытачоў.

У цэнтральнай раённай — чытачоў больш за 4 тысячы.

На жаль, і цэнтральная, і сельскія бібліятэкі не маюць выданняў рарытэтных: у вайну ўсё было спалена. Цяпер кніжныя фонды ў Капылі малаунікальныя ў параўнанні з пачаткам XX стагоддзя, калі тут жыў Цішка Гартны і меліся прыватныя бібліятэкі з рэдкаснымі выданнямі. Але студэнты ды школьнікі пасля заняткаў альбо ў выхадныя дні на прыгарадным аўтобусе прыязджаюць у галоўнае кнігасховішча — тут выдатны краязнаўчы матэрыял, ды і электронная база вельмі моцная. Яе перавага перад бібліятэкамі сельскімі — у большай аператыўнасці. Акрамя гараджаніна, чытачом цэнтральнай раённай бібліятэкі насамрэч лічыць сябе і вясковец.

І яшчэ адна асаблівасць — шмат у залах чытачоў прыезджых, асабліва летам. За сезон дабаўляецца 20—30 чытачоў адно толькі ў дзіцячай бібліятэцы, якая дзеліць памяшканне з гарадской і назапасіла вялікія фонды па класічнай літаратуры.

— Недалёка той дзень, калі будучае станецца ў руках нашых дзяцей. Ад таго, якія каштоўнасці яны будуць спавядаць, залежыць іх жыццё, ды і будучыня нашай зямлі. Таму адзін з яркіх напрамкаў — экалагічная дзейнасць бібліятэк, — акцэнтуе ўвагу на адметных спецыялізацыях установаў Таццяна Пятроўна. — Вось чаму так важна сёння дапамагчы дзецям і падлеткам засвоіць новую сістэму каштоўнасцей ва ўзаемаадносінах з наваколлем. У фарміраванні экалагічнай культуры асаблівая роля тых, хто працуе са словам. Таму і кнігі кшталту «Птушкі Беларусі», «Водныя рэсурсы Мінскай вобласці» навідавоку амаль у кожнай бібліятэцы. З падпіскаю на перыёдыку дапамагае мясцовая экалагічная суполка. Раённая інспекцыя аховы навакольнага асяроддзя праводзіць таксама і конкурсы чытачоў, прэміруючы лепшых з іх кнігамі. Сама ж цэнтральная бібліятэка была пераможцай абласнога экаконкурсу і стала прызёрам рэспубліканскага.

Капыльшчына спрадвеку багатая на паданні ды легенды, валадараць тут мясцовыя асаблівасці выхавання на лепшых узорах літаратуры, шмат знаных людзей мае тут свае карані.

Ніколі не прамінае бібліятэку, калі едзе на радзіму ў Цімкавічы, А.Бельскі — навуковец, які працуе зараз у Белдзяржуніверсітэце. І абавязкова пакідае бібліятэцы падарунак — кнігу. Кардыёхірург А. Манак прыслаў аўтарскі асобнік па хірургіі ды ксеракопіі папулярных медыцынскіх кніг, М. Высоцкі — знакаміты канструктар, адзін з першых Герояў Беларусі — цяпер таксама добра вядомы капылянам менавіта дзякуючы рупліўцам з бібліятэкі.

Кожная ж установа з улікам гістарычных асаблівасцей рэгіёна мае сваю скіраванасць. Прыкладам, у Семежава больш напрамак краязнаўчы, у Цімкавічах цяпер — бібліятэка аграгарадка, і чытаць ходзяць сем'ямі, не прамінуўшы ні музея Кузьмы Чорнага, ні мясцовага клуба ды школы.

Асноўны напрамак працы цэнтральнай бібліятэкі — краязнаўчы. Імя А. Астрэйкі, нададзенае ўстанове, гэтага вымагае: і біяграфіі, і бібліяграфіі знаных людзей краю тут насычаныя фактамі. Але які б профіль не быў — галоўнае ў тым, што ў рэгіёнах так званая масавая літаратура пакуль не авалодала розумам кідкага на сенсацыі натоўпу. Самыя цікаўныя чытачы — пенсіянеры і людзі сярэдняга ўзросту — пытаюцца пра галіновую літаратуру, чытаюць перыядычныя выданні. Ёсць тыя, хто вельмі цікавіцца гісторыяй і краязнаўствам. А «рэйтынгавая» літаратура, фэнтэзі і дэтэктывы не складаюць асноўную выдачу кніг. На пачэсным месцы ў чытальнях — уся класіка: савецкая і замежная, беларуская.

І ў «ЛіМа» тут — свая катэгорыя чытачоў. Гэта найперш настаўнікі, студэнты ды пенсіянеры, якія прыходзяць у суботу ды нядзелю і прачытваюць усё, што ёсць на паліцах, у тым ліку і штотыднёвікі «Культура», «ЛіМ». Прозвішча пенсіянера Саковіча запомнілі з-за яго пастаяннай прыхільнасці да часопіса «Полымя» — прачытвае кожны нумар: і прозу, і публіцыстыку.

Такі плён працы 18 супрацоўнікаў цэнтральнай бібліятэкі за 30 гадоў, калі пачалася цэнтралізацыя. На жаль, дакладнай даты ўтварэння ўстановы, якая прыпадае ці не на пачатак мінулага стагоддзя, у архіўных згадках не знайшлі. Пацвярджэнне нашага сталага ўзросту — і размяшчэнне цяпер былога ўжо будынка дзіцячай бібліятэкі, якая раней знаходзілася ў гістарычным прадмесці Капыля. Але не вытрымалі драўляныя ўмацаванні, і службы прызналі небяспечным стан установы. Вось і мусілі пераехаць у цэнтральную. Цяпер для цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтаваны новы праект будынка, які спецыялісты плануюць рэалізаваць у бліжэйшы час. Бібліятэка размесціцца ў прамысловым раёне горада.

Ірына ТУЛУПАВА

НА ЗДЫМКАХ: дырэктар бібліятэкі Т. Серая; фрагмент афармлення чытальнай залы.

Фота аўтара

Таямніцы Опернага тэатра

З мінулага года вядуцца рамонтна-аднаўленчыя работы на адным з самых значных аб'ектаў культуры — будынку Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы і балета. Працэс рэканструкцыі час ад часу абрастае новымі фактамі, чуткамі і плёткамі. Таямніцы знакавага помніка архітэктуры паспрабаваў спасцігнуць і карэспандэнт "ЛіМа"...

Гісторыя сведчыць

Гісторыя самога тэатра пачынаецца 25 мая 1933 года, але будынак Опернага пабудаваны, як вядома, толькі ў другой палове 30-х гг. XX стагоддзя на Траецкай гары, афіцыйна адкрыты ў 1939-м. Аўтар праекта — архітэктар Іосіф Лангбард, які таксама вядомы знакавым сталічным будынкам Дома ўрада.

Падчас нямецкай акупацыі фашысцкія ўлады зрабілі прыніжальны для нацыянальнай беларускай культуры жэст — яны размясцілі ў Оперным стайні, разрабавалі унікальны інтэр'ер: свяцільнікі, стылізаваную мэблю, дываны, карціны — усё гэта было вывезена ў Германію.

Пасля вайны Лангбард дапамагаў аднаўляць спраектаваныя ім будынкі, шмат работ вялося і ў тэатры. Змянілася аблічча глядзельнай залы (у ёй з'явіліся ярусы замест балконаў), поўнасцю адноўлены ляпны дэкор скульптара Андрэя Бембеля. Работы вяліся на працягу 1945—1948 гг. Ля тэатра тады разбілі прыгожы парк, які таксама спраектаваў Лангбард.

У 1960-х гадах у будынку зноў была маштабная рэканструкцыя. Зразумела, грошай не хапала, многія залачоныя дэталі інтэр'ера не рэстаўраваліся...

З афіцыйных выказванняў

Унікальная магчымасць агледзець тэатр з'явілася падчас сустрэч журналістаў з прадстаўнікамі Міністэрства культуры, якія традыцыйна праходзяць напрыканцы месяца. Тым больш, што на аб'екце, акрамя "акул пяра, мікрафона і тэлекамеры", сабраўся шэраг кіраўнікоў арганізацый, якія вядуць работы на аб'екце.

Намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Грыдзюшка зазначыў, што сёлета Міністэрства культуры атрымала немалыя сродкі на будаўнічыя работы, закупку абсталявання, рамонт і інш. Адзін толькі праект аднаўлення Опернага тэатра будзе каштаваць больш як 90 млн. долараў ЗША.

Уладзімір Грыдзюшка паведаміў, што ў мінулым годзе на аб'екце асвоена больш як 33 млрд. беларускіх рублёў, сёлета плануецца патраціць больш як 69 млрд. Фактычна гатовы да здачы ў эксплуатацыю першы пускавы комплекс, які ўключае службовыя памяшканні, адміністрацыйную і службовую часткі, рэпетыцыйныя, грымёрныя памяшканні.

Да пачатку рамонтных работ будынак тэатра меў надзвычай дрэнны стан: камунікацыі, столь, падлога, нават цагляная кладка сцен патрабавалі рамонту. Даводзіцца працаваць з надзвычай вялікімі плошчамі: падземная частка тэатра — 28,8 тыс. куб.м, агульная плошча — каля 36 тыс. кв. м, агульны аб'ём — 207 тыс куб.м.

Асабліва складаныя работы вяліся на трэцім пускавым комплексе, які ўключае глядацкую зону і цеплавы контур будынка. Самае цяжкае — дэмантаж і потым мантаж металічных перакрыццяў даху над глядзельнай залай, так званага барабана. А гэта — сотні тон металу, які перамяшчаў унікальны пад'ёмны кран. Шмат дзе даводзілася мяняць цагляную кладку...

На аб'екце працуе каля 600 чалавек. Гэта супрацоўнікі ЗАТ НВА "Эльвіра" і 20 субпадрадных арганізацый, якія задзейнічаны на спецыяльных работах. Няма сумненняў, што будынак будзе здадзены ў эксплуатацыю не пазней за студзень 2009 г. Сёння работы вядуцца нават з апярэджваннем графіка. Мяркуецца, што ў бліжэйшы час тэатральныя трупы атрымаюць адрэстаўраванае памяшканне першага пускавога комплексу будынка — левая частка адміністрацыйнай прыбудовы (уваход з вул.Пашкевіч. — **Удакл.аўт.**) у эксплуатацыю. Дагэтуль рэпетыцыі вяліся ў памяшканні правай прыбудовы (другога пускавога комплексу), які пасля пераезду становіцца на рамонт.

Намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь вельмі добра ацаніў працу будаўнічых арганізацый, звязаных з праектам аднаўлення тэатра оперы і балета, а таксама падкрэсліў, што ўсе работы вядуцца сумленнымі людзьмі, у строгай адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

Разам з Уладзімірам Грыдзюшкам мы прайшлі праз усе паверхі тэатра і нават патрапілі на дах. Паколькі тэатр стаіць на ўзвышшы, з даху адкрываецца надзвычай прыгожая панарама горада.

Працэс рэканструкцыі няспынна працягваецца. Засталося няшмат часу да таго моманту, калі мы пабачым адноўлены сталічны помнік архітэктуры.

С. ДУБОВІК

Фота аўтара

На пачатку 2007 года выйшла чарговая кніга Алеся Разанава з серыі "Манвантара" — "Дождж: возера ў акупунктуры", прэзентацыя якой адбылася ў сакавіку ў фальварку "Добрыя мыслі". Паколькі кніга серыйная, яна суправаджаецца выявай яйкаквадрата — чорнае яйка ў белым квадраце.

Акупункціры, у якіх гаворыць прастора

Нагадаем, што працуючы ў сааўтарстве з мастаком Віктарам Маркаўцом, Алесь Разанаў выдае ўжо чацвёртую кнігу. Сам аўтар меркаваў азнаменаваць яе "трэцім вокам". Але відавочна не чорным уяўляецца аўтару колер вачэй:

Сонца заходзіць:
у двое вачэй
узіраюся ў трэцяе вока.

Ды і па ліку кніга атрымалася чацвёртай. Серыю "Манвантара" адрознівае тое, што ў кожную асобную кнігу ўваходзяць творы пэўнага жанру. Так, першую "Кнігу ўзнаўленняў" склалі творы ў так званым жанры рэстаўрацыі (пераклад твораў са старабеларускай мовы на сучасную). "Лясная дарога" складаецца з версэтаў. Паэмы сабраныя ў кнігу з рамантычнай і ўзнёслай назвай "Каб мелі шчасце ўваскрасаць і лётаць". Цалкам пункцірнай сталася кніга "Дождж: возера ў акупунктуры". Змест кнігі складаюць пункціры з розных творчых этапаў аўтара, у тым ліку самыя "гарачыя" — "швейцарскія", што яшчэ не аб'яўляліся ў друку. Заўважым, што пачынаючы ўжо з назвы кнігі, аўтар прытрымліваецца, наўмысна ці выпадкова, наступнай тэндэнцыі: укладае паступова назву жанру — затым назву твора пэўнага жанру — цытату з твора — змест усяго твора. Атрымліваецца парадаксальная сітуацыя: з аднаго боку, А.Разанаў ідзе па шляху канкрэтызацыі — у нас перад вачыма цэлы твор на вокладцы, з другога, у маштабах сэнсу — ён выходзіць да шырокага абагульнення (а гэта ён рабіў не раз): пункцірнымі рыскамі дажджу знітоўвае дзве сферы — зямлю і нябёсы. А ў гэтай прасторы жывуць усе папярэднія творы і ўсе наступныя, бо іх каардынаты ў любым выпадку ў рамках дзвюх асноўных — зямлі і неба.

У гэтулькі нітак!..
Сшывае
зямлю і нябёсы дождж.

Неяк раней у адной са сваіх філасафем паэт пісаў, што "акупунктурныя кропкі рассыпаны па ўсім чалавечым целе". На "целе" разанаўскай паэзіі гэтыя кропкі — пункціры-акупункціры — паўсюль, бо, паводле слоў самога паэта, "усё ёсць цела", уся паэзія — адна суцэльная кропка.

Цікавасць аўтара да мініяцюрнай формы праявілася яшчэ на самым пачатку творчага шляху паэта, калі ў зборнік "Назаўжды", акрамя класічных вершаў і паэмы з аднайменнай назвай, было ўключана 90 пункціраў (пункціры ўяўляюць сабой невялікі па памеры монастрафічны верш, якому характэрна адсутнасць рыфмы (за выключэннем самых першых пункціраў), наяўнасць некалькіх рытмічных груп, няроўных па колькасці складоў, "прычынна-выніковы" сінтаксіс. Пункціры блізкія да японскіх хайку і літоўскіх карацелек).

Магчыма, сімвалічным аказалася назва зборніка "Назаўжды" — назаўжды аўтар застаўся верным абранаму шляху і назаўжды засталіся пункціры ў ягонай творчасці. Больш за тое, сімвалічным у нейкім сэнсе аказаўся і сам жанр. Ён стаў тым самабытным зернем, з якога вырасла моцнае "галіністае" дрэва разанаўскай паэзіі, — версэты, паэмы, вершаказы, зномы, вершасловы.

З боку паэтычнага зместу гэты жанр бачыцца нам складаным, бо адкрыць запаветнае, выказаўшыся пры гэтым адной, дзвюма фразамі, — падуладна далёка не кожнаму. Адчувальны ўплыў усходняй філасофіі ў характары пазнання свету, інтэлектуальнай заглыбленасці і скандэнсаванасці думкі:

Туман:
у наўколля
кружыцца галава.

Разанаў умее ўхапіцца за няўлоўнае, за тое, што, здавалася б, так лёгка пакінуць па-за ўвагай. Справа ў тым, што мы часта не заўважаем таго, што на паверхні зямлі, вады, агню, паветра, бо нават не задумваемся пра наяўнасць "новай паверхні: дна". Сэнсавая глыбіня пункціраў, такім чынам, прыхавана і знаходзіцца не столькі ў самім канкрэтным творы, колькі ў патэнцыяле яго ўспрымання намі. Спасцігнуць яго, і ўвогуле ўсё існае на гэтай зямлі — жыццё і смерць, будзень і свята, радасць і самоту, — можна праз штодзённыя звычайныя рухі ў жыцці..

Як сапраўдны мастак, Алесь Разанаў давярае інтуітыўнаму спасціжэнню рэчы, ён не дыктуе сваю волю матэрыялу, а толькі выяўляе закладзеную ў ім прыродай прыгажосць. Ягоны настаўнік — суцэльная прастора: кожная яе праява, рух, жэст. Здаецца, паэт трымаецца запаведзі, якую пакінуў сваім вучням Мацуа Басё, японскі паэт XVII стагоддзя: "Вучыся сасне ў сасны, бамбуку ў бамбука. Уцякай ад самога сябе, ісціна не дасягнецца, калі не адслоніш сябе. Вучыся — гэта значыць заходзь у рэч, адчыняй яе сутнасць, адчувай яе, — тады народзіцца верш":

Падае шышка з хваіны:
наставіў
далоні дол..

Аказваецца, можна ўслухоўвацца ў недаказанае, захапляцца нябачным. У той жа час разанаўскія пункціры схіляюць да грунтоўнага, складанага спасціжэння свету.

Нікога,
хто ў гэты свет
прыходзіць,
не абыходзіць доля:
атрымліваюць
усе без вынятку
два найвялікшыя
падарункі —
жыццё і смерць .

Звяртае на сябе ўвагу "пункцірны" сінтаксіс. Амаль ў кожнай мініяцюры — працяжнік альбо двукроп'е. Яны арганізуюць прычынна-выніковыя адносіны паміж часткамі сказа, змест якога — узаемазалежнасць усіх рэчаў, з'яў, працэсаў і рухаў на нашай зямлі. Пункціры багатыя на стылістычныя сродкі — эпітэты, метафары, рытарычныя пытанні. Праілюструем на прыкладах. Эпітэты: *начныя сонцы, востры маладзічок, самотны вечар, паважны грак, трава-гараджанка, мастачка-восень, зялёны песнаспеў, празрысты смутак, світальная павуціна.* Метафары: *нябёсы гавораць, ціша загаварыла, спявае наўколле, камень зацвіў.* Рытарычныя пытанні:

Знасіліся чаравікі:
рады,
што вызваляюцца ад мяне?!

Увогуле вобразная сістэма пункціраў характарызуецца разнастайнасцю: не толькі прырода, але самыя розныя жыццёвыя праявы, у якія ўглядаецца, над якімі думае-разважае паэт. Часам змест будуецца на сутыкненні высокапаэтычных рэчаў і штодзённага побыту чалавека. Так, у адным пункціры сумяшчаюцца *ліхтары і сонцы, шматпавярховыя дамы і барвовы акраец сонца, машыны і матылькі.* Альбо наогул аўтар ужывае "непаэтычную" лексіку: *лесвіца, пад'езд, аўтобус, законы аэрадынамікі, запалкі, кніжная паліца, марафон, дворнік, тратуар, асфальт, чарга, тэлефон-аўтамат, зона, бальніца* і інш. Такія пункціры звычайна афарбаваныя ў "мінорны" колер.

Пункціры — лаканічныя творы, насычаныя асацыятыўным падтэкстам. Звычайна яны будуюцца на нейкай дамінуючай дэталі, аднак у іх заўсёды ўтрымліваецца магчымасць больш поўнага развіцця закладзенай думкі. Увага акцэнтуецца, як правіла, на дэталі, але не заўсёды, шляхам вылучэння яе ў асобны вершарадок. Па-трэцяе, іх простая форма — выключная форма. Пункціры сваёй фармальнай арганізацыяй пацвярджаюць скразную тэндэнцыю, якой прытрымліваецца Разанаў у сваёй творчасці — укласці ў мінімальную форму максімальны змест. Такі працэс цалкам адпавядае сітуацыі, якая складваецца на сённяшні дзень у літаратуры і якую можна вызначыць як тэндэнцыю да мініяцюрызацыі мастацкага выказвання.

Можна шмат разважаць і дыскутаваць, адкуль узніклі пункціры, як увогуле яны нараджаюцца і "намацваюць" свае каардынаты ў абмежавана-неабмежаванай прасторы. Што бліжэй пункцірам — "Захад ці Усход, хайку, бейт альбо класічная страфа?" Аднак Алесь Разанаў прапануе зарыентаваць гэтае пытанне ў іншы кірунак, напрыклад: "хайку ці дождж, бейт ці дрэва, класічная страфа альбо птушка?" Сам аўтар неяк разважаў пра свае творы: "У пункцірах усё ўзаемазвязана, узаемаабумоўлена і знаходзіцца ў раўнавазе: гук, сэнс, вобраз: метафара для іх надта ўмоўная, красамоўства надта ідэалагічна, а логіка вельмі настойлівая. І канешне ж, аўтарскае "я" даволі вялікае, каб умясціцца ў іх краткасць; яно ўмяшчаецца, становячыся слыхам пункціраў, іх зрокам. Пункціры —"акупункціры": адказ прасторы на позірк, услухоўванне, думку, якія намацалі ў прасторы нешта асаблівае... яно ўяўляецца асаблівым толькі таму, што было заўважана і адгукнулась, стала тоесным настрою гэтай гадзіны, гэтай хвіліны".

Цікава: пра што гаворыць прастора ў яшчэ не абвешчаным пункціры, чым ужо зараз адгукаюцца яе нетры?!

Таццяна ЦІХАНОВІЧ

Паядынак розуму і сэрца

Рудзенская зямля дала шмат таленавітых паэтаў, але зоркай першай велічыні ззяе над ёй імя Таісы Бондар — пісьменніцы, публіцыста, перакладчыцы, грамадскага дзеяча, аўтара апавяданняў, раманаў, зборнікаў вершаў, стваральніка і галоўнага рэдактара часопіса "Всемирная литература", кіраўніка РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Яна нарадзілася 20 лютага 1945 года ў невялічкім гарадку, тады раённым цэнтры, Рудзенск Мінскай вобласці. Вершы пачала пісаць яшчэ ў школе, але, як сама прызнавалася, нікому іх не паказвала. Скончыла факультэт англійскай мовы Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў, працавала некалькі год настаўніцай у Малдове. У 1977 годзе вярнулася з сям'ёй на Беларусь. Толькі ў аддаленні можна адчуць тую вялікую тугу па Радзіме, пра якую Таіса Бондар так пранікнёна пісала:

Што мне іншыя,
лепшыя землі?
Скрозь жа,
дзе б ні блукалі гады...
Край, што высню
самотаю я,
І світанак, затканы
рамонкамі.
Беларусь мая —
песня мая,
Жаўруковая
звонкая-звонкая!

Упершыню яна пачала друкаваць вершы ў газеце "Літаратура і мастацтва" ў 1970 годзе. Тады адбыўся яе імклівы ўваход у літаратуру; з 1978 года Таіса Бондар ужо член Саюза пісьменнікаў СССР.

Героі вершаў Таісы Бондар вядуць вечны паядынак розуму і сэрца. Усёй сутнасцю сваёй, кожным радком паўстае паэтэса супраць халоднага раўнадушша.

Любіце ўсё і ўсіх
на гэтым свеце
Так, як любілі б
Госпада свайго!
І я ўсміхаюся насустрач
ранку,
Насустрач тым, хто,
як і я гатоў
Любіць і верыць
новым абяцанкам,
Адкінуўшы цяжкі
ланцуг гадоў.

Любоўная лірыка ў творчасці Таісы Бондар займае вялікае месца.

"Каханне — самае большае шчасце, якога варты чалавек. Я не ведаю, што нас уратуе, і так хачу, каб гэта была любоў", — пісала аўтарка.

Яе закаханая гераіня — гэта жанчына сталага ўзросту, якая ведае, чаго хоча ад жыцця, і разумее, што каханне — гэта заўсёды радасць і смутак адначасова, "драгоценность жизни и бриллиант в оправе страдания".

Не бойся за сябе
Ты справішся з сабою,
Твой схоў не разаб'еш
Спадзёўкаю слабой.
Сысціся ў барацьбе —
і заплаціць любоўю?
Ну, не! Лепш на трубе
сыграць гадам адбой.

Таіса Бондар — празаік, аўтар раманаў "Спакуса", "Ахвяры", "Мечаная", "Блаславенне Марыі", "Павуцінне", а таксама шматлікіх аповесцяў і апавяданняў.

Чытаючы яе "Дзённік жанчыны" я думала: яна не пабаялася вынесці на свет свае пачуцці, трывогі, сваё каханне.

Існуе нейкая незямная сувязь паміж празаічнымі творамі пісьменніцы, дзе ў цэнтры заўсёды жанчына, вобраз якой выпісаны настолькі таленавіта, што, здаецца, вось-вось адчыняцца дзверы і ўвойдзе... Марыя Магдалена, распусная і няшчасная, якая ўсё ж знайшла шлях да выратавання.

Колькі трэба было перажыць, перацярпець самой пісьменніцы, каб стварыць вобраз Марыі Магдалены, адчуць яе душэўнае трымценне.

Любоўная лірыка ў творчасці Таісы Бондар займае вялікае месца. "Каханне — самае большае шчасце, якога варты чалавек. Я не ведаю, што нас уратуе, і так хачу, каб гэта была любоў", — пісала аўтарка.

"Трэба будаваць святло ў душы, каб душа магла навучыцца радавацца самаму простаму ў жыцці: чалавечаму разуменню, прыходу раніцы, сонцу, траве, лесу.

Утрымацца можна толькі за саміх сябе, за тыя карэньчыкі, якія аблямваеш у вечнай мітусні, у вечнай пагоні за прывідамі шчасця", — пісала Таіса Мікалаеўна.

Проза Таісы Бондар — гэта не жаночыя французскія раманы; тут кожную старонку перачытваеш па некалькі разоў, абдумваеш кожны радок.

"Ратуйце душу!" — заклікае ўсёй сваёй творчасцю Таіса Бондар, бо сапраўдная літаратура вядзе вечны бой за Чалавека.

У апошнія гады пісьменніца шмат часу прысвячала ідэі арганізацыі славянскага брацтва, скліканню славянскага сабору. Яна прапагандавала гэтую ідэю ў Варшаве, Празе, ездзіла ў Балгарыю, Сербію і ўсюды знаходзіла аднадумцаў. Але гэтым планам не наканавана было здзейсніцца... Цяжкая хвароба, заўчасная смерць...

Ідзе другі год, як няма ўжо з намі гэтай цудоўнай жанчыны, таленавітай пісьменніцы. Але ж засталіся яе творы.

Светлы вобраз Таісы Мікалаеўны Бондар будзе заўсёды з намі!

Аліна СІДОРЫК

Сонца другой паловы дня

У акіян-моры рускай паэзіі ў выніку пэўных тэктанічных зрухаў, калі заўсёды сутыкаюцца час, талент і лёс, ужо даўно з'явіўся вострaў, імя якому — Анатоль Аўруцін. Увогуле паэзія — гэта астраўная сістэма: што ні паэт, то ізаляваная, няхай умоўна, тэрыторыя, якая амываецца, абдзімаецца ўсімі плынямі і вятрамі часу. Вострaў, пра які гаворка, ужо шмат гадоў як нанесены на літаратурныя мапы Беларусі і Расіі і з тых часоў уяўляе інтарэс для навігатараў — як чытачоў, так і крытыкаў. І адны і другія ўгледзелі на зямлі Аўруціна дзіўныя рэчы. Там аказаліся такія дзівосы, як «Золоченая бездна», «Неживая вода», «Поворотный круг» і нават «Снегопад в июле». Знаходзіцца гэтая зямля недалёка «... От мира сего» «По другую сторону дыхания». Асабліва схіляе яна да таго, каб «Наедине с молчанием» аддацца роздумам пра хуткаплыннае жыццё, пра дабро, каханне, прыгажосць і пра тое, што іх разбурае. Пасядзець, засяродзіцца на вечным і часовым, прашаптаць сабе: «Поверуй...Вспомни... Усомнись...». І, уздыхнуўшы, падумаць, што «Суд богов», на жаль, непазбежны.

Але хопіць метафар. Чытач, канечне, ужо зразумеў, што пералічанае — назвы паэтычных кніг Анатоля Аўруціна, апошняя з якіх, «Наедине с молчанием», толькі што выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», адкрыўшы сабой новую серыю «Залатое пяро», ужо адна назва якой абавязвае. У кнізе змешчаны сорак чатыры новыя вершы і выбранае з васьмі папярэдніх вышэйпамянёных зборнікаў. Паводле слоў самога паэта, гэты элегантны том у цвёрдай вокладцы, — галоўны вынік яго трыццаціпяцігадовай працы ў паэзіі.

Адзін з аўтарытэтных літаратуразнаўцаў, доктар філалагічных навук, прафесар А. Андрэеў у прадмове да гэтай кнігі спрабуе прабіць зяўро ў некаторай прадузятасці нашых айчынных крытыкаў, якія засвоілі правіла, паводле якога у сваёй айчыне прарока няма. Вось што ён піша: «Не скажаш, што Аўруціна не заўважаюць, але яго не заўважаюць як першакласнага паэта, зусім нобелеўскага па сваім фармаце. Хіба яго нельга супаставіць з Бродскім?»

Мне падабаецца такая пастаноўка пытання. Калі ўжо выбіраць саперніка, дык паводле Маякоўскага: не мужа Марыі Іванаўны, а самога Каперніка. Па-першае, прыемна паэту, па-другое (гэта ўжо ўсур'ёз), Анатоль Аўруцін параўнанняў, на мой погляд, не баіцца. Ён абсалютна не падобны ні да каго, у яго выключна свой стыль. Бродскі, калі воляй Андрэева ён усё ж умяшаўся ў размову, больш рэльефны ў малюнку дэталяў, больш рэчаісны і тым самым больш завершаны.

Паэзія ж Аўруціна не канчатковая. Яна абвалаквае цябе, як воблакі туману раніцай засцілаюць зямлю, пазбаўляючы яе ў момант свайго згушчэння яснай выразнасці і адначасова дадаюць ёй нешта містычнае, рухомае.

Солнце съежилось.
Зяблик озяблый
Настороженно жмется
к крыльцу.
Лист взбесившийся
с яблони дряблой
Так и жаждет хлестнуть
по лицу.

И туманного цвета
проклятье
Отзывается в стылой
душе...
Белый ангел и черное
платье...
Черных платьев
не носят уже.

Все свершилось...
Все вышло до срока.
Бог не выдал...
И "Аз" не воздал...
Только черная музыка
Блока...
Только бледная стылость
зеркал...

Усё сказана і ўсё схавана. І нематэрыяльна. Туман, што крыху парадзеў на першым радку. Матэрыя ва ўсёй яе аголенасці ў Аўруціна з'яўляецца там, дзе трагічнасць быцця нібы адчуваецца на дотык.

Кроваво-черная вода,
Такая, что смотреться
жутко.
Сиротски стонут провода,
И рябь — подобьем
первопутка.

Бревно с обугленным суком
Несет дорогою слепою,
Как будто с тощим
кадыком
Парит покойник
над толпою...

Сапраўды жудасна. Але не вельмі характэрна для Аўруціна. Увогуле яго паэзія натхнёная сонцам *другой паловы дня.* Гэта і ўмудронасць узросту, але яшчэ і захапленне прыгажосцю, гэта нягучныя фарбы, прадчуванне заходу, непрамое, ціхае святло і яго блікі, якія сумуюць на лісці пры сціхлым ветры. Вострае святло маладосці, якое слепіць вочы (самыя першыя кнігі Аўруціна), змянілася іншым, крыху стомленым, пры якім яшчэ добра бачна, але ўжо не баліць, а калі і засціць вочы сляза, то прадметы ў яе "биноклике" набываюць у паэта трохмернасць. Ці не адсюль нараджаецца «срэбная» інтанацыя вершаў, у якой мы пазнаём Блока, Гумілёва, Мандельштама, Пастарнака, Ахматаву? Гэта — як мелодыі з класічных музычных твораў, якія наўмысна цытуе кампазітар у сваіх. Так у Сёмай сімфоніі Шастаковіч інтаніруе вядомы «матыў лёсу» з Пятай сімфоніі Бетховена, а Скрыпічны канцэрт Альбана Берга (перадсмяротны шэдэўр знакамітага аўстрыйскага майстра) поўны алюзій і цытат з твораў іншых вялікіх кампазітараў. Хіба ж не тое робіць Аўруцін?

Россия... Родина... Рябина...
Распятье... Реченька...
Роса...
О, как светло
и некартинно
Парят над лугом голоса!

Парят... Схлестнулись
в этом пенье,
Как в теплой капельке
со лба,
Судьба... Смятение...
Спасенье...
Строка... Спасение...
Судьба...

Ці трэба цытаваць вядомае блокаўскае "Ночь, улица, фонарь, аптека, // Аптека, улица, фонарь», каб убачыць асэнсаваную інтанацыйную пераклічку? Але толькі інтанацыйную, таму што яна патрэбная для ўнутранага дыялога з ценем геніяльнага паэта. Так, «и повторится всё, как встарь», бязмоўна адсылае нас Аўруцін да гэтых змрочных радкоў, але мне, чытачу, ужо не самотна: хай бясконца паўтараецца святло і любоў, хай паўтарыцца разгубленасць перад прыгажосцю і святым. Не ў цябе, дык у іншых. У Блока — замкнёнае кола, у Аўруціна — выйсце з яго.

Вершы ўяўляюць сабой сасуды, таемна злучаныя між сабой, па якіх увесь час, мяняючы напрамак, рухаецца, жыве стыхія аўтарскай думкі і пачуцця: ад мінулага да цяперашняга, ад сённяшняга да мінулага. Кандалы рыфмаў і памераў, здаецца, зусім не абцяжараюць яе свабоду. Там жа, дзе яны даймаюць плоць верша, Аўруцін лёгка здымае іх:

Предаст любимый —
придет страданье.
Придет страданье —
постигнешь душу.

Постигнешь душу —
навек прозреешь.
Навек прозреешь —
любовь узнаешь —
Любовь узнаешь —
предаст любимый...

Як бачым, перад намі кола з пяці звёнаў-знаходжанняў чалавечага быцця. Калі ўзбуйніць кожнае з іх, што будзе справядліва ў дачыненні да жыцця чалавека, атрымаецца пяць эпох, у кожнай з якіх будуць свае часавыя і трагічныя колы: каханне, здрада, пакуты, спасціжэнне пекла душы, жахлівае прасвятленне і зноў распнутае здрадай каханне. Але мяне як чытача не пакідае адчуванне, што аўтар, замыкаючы кола, у той жа час выходзіць з яго ... не разрываючы звёнаў, і глядзіць на тое, што адчувае, знаходзячыся быццам звонку. Такіх вершаў у яго шмат.

Ці не ў гэтым парадоксе філасофскі камень Аўруціна? Так, канечне, адчуванне «божественной двоякости» свету (выраз Аўруціна), яго палярнасці, якая мяняецца на вачах, яго два ў адным і адно ў двух, яго аксюмароны накшталт «далекая близь» и «близкая даль» — усё гэта ўласціва паэту-дыялектыку. Адсюль у яго, канечне ж, цяга да так званых перавёртышаў: « Вода и пламень... Узник и судья...// Кандальник, но с походкой конвоира,//Святой и грешник...//Многоликий Я —// Кумир для низвергающих кумира».

І ўсе ж такі: забачанае двуадзінства матэрыяльнага і духоўнага не з'яўляецца адкрыццём паэта, таму што не адзін ён угледзеў узаемавыключальныя маскі тэатра сутнага. Часовая паралельнасць свету (паралельныя прамыя ўрэшце перасякуцца) і нават існаванне іншасвету даўно ў падсвядомасці, калі пакуль яшчэ не ў свядомасці, любога сапраўднага мастака. Але вось выйсці з зачараванага кола, не выходзячы з яго, — гэта, пэўна, характэрная асаблівасць менавіта Анатоля Аўруціна.

Вось загадка, адказу на якую няма і ў вершах. Альбо яна ёсць, але, як амаль усё напісанае Аўруціным, зашыфравана між радкоў. І неяк няёмка разбіваць шкарлупіну арэшка і знаходзіць на старонках «Наедине с молчанием» прыклады філасофіі дабра і зла, прыгажосці і брыдкасці, любові і нянавісці... Гэта было б так прымітыўна. Аўруцін — паэт блікаў, а не бляскаў, водбліскаў, паэт пункціраў, шматкроп'яў, паўтаноў, «амаль». «Почти новы, почти туманны,//Почти обманчивы слова...// Скользя по сходням деревянным, // Вдоль сквера плыли дерева. //Я выходил — почти светало..."

А ва ўлюбёным аўруцінскім «паў» мне бачыцца ўсмешка-намёк Джаконды, такая інтымная, быццам нейкая тайна, вядомая толькі нам дваім.

Полувздох положив
на перила,
В наклоненную глядя реку,
Все слежу,
как душа воспарила,
Как разбилась
на том берегу.

Как, дрожа
над течением зыбким,
Устремленная
в сумрак иной,
Испаряется полуулыбка,
Озаренная полной луной.

Абгабляваная ад зялёных галінак жывапісу думка, якая б яна ні была цікавая, пераводзіць верш хутчэй у галіну філасофіі, хаця апошняй жывыя фарбы таксама не шкодзяць. Аўруцін гэта вельмі добра адчувае. І яго верш, як правіла, я бачу, чую, нават, здаецца, адчуваю вобмацкам, бы тое дрэва. А крона такога дрэва — думка. Вось, скажам, карціна надыходзячай восені (з-за недахопу газетнай плошчы працытую хаця б канцоўку):

И видишь с каким-то
надрывом,
На зрелом своем рубеже —
Сосенка шумит
над обрывом,
А корни подмыло уже...

Узрастанне сэнсавай нагрузкі і вырашэнне яе ўсяго ў двух апошніх радках, высяканне іскры (або нават маланкі, што належыць ад моцы натхнення) — адбываецца ў шматлікіх вершах Аўруціна. Пры гэтым метафара ў яго, звычайна лёгкая, як паветраны шар, аснашчана думкай, што той шар грузам, і таму ён не адлятае ў паднябессе чыстай эстэтыкі. «Ветры века обрезали крону, // Нижним веткам вершинность придав». Там жа, дзе Аўруцін не бачыць карысці ў іншасказе, ён свядома ідзе на ўжыванне слоў у іх непасрэдным значэнні, але лірычная інтанацыя і электрычны разрад думкі напрыканцы разважанняў кампенсуюць папярэднюю лексічную скупасць. «Кто тополь долу распростер, // Какие выродки?// И шеей чувствуешь топор// На свежей вырубке...». Практычна няма алегорый там, дзе сіла менавіта ў іх адсутнасці, дзе нішто не пераціснута і сур'ёзнае перажыванне не апошлена прыгожым фальшам. Вось як паэт малюе карціну пасляваеннага мыцця бялізны. Жанчыны

От взглядов работу
не пряча
И лишь проклиная ее,
Стирали обноски ребячьи
Да мелкое что-то свое.

И дружно глазами тоскуя,
Глядели сквозь
влажную даль
На ту, что рубаху мужскую
В тугую крутила
спираль...

А вось верш пра сённяшніх жанчын. Ці моцна яны адрозніваюцца ад тых, гаротных, хоць і іншы час на двары?

У окна в притихшей
электричке
Женщина читала письмецо,
К свету близоруко,
по привычке,
Обратив усталое лицо.

Письмецо...
А как она читала! —
Полстранички —
целых полчаса.
Удивленно брови
поднимала,
Прикрывала влажные глаза.

И чему-то веря, улыбалась
И, не веря, хмурила лицо.
Женская доверчивая
жалость
Куталась в худое пальтецо.

И гадал, забывший о покое
Путник, что покинул дом
и мать, —
Написал ли он письмо
такое,
Сможет ли такое
написать?..

Такі ліст жанчыне напісаў Анатоль Аўруцін ў кнізе «Наедине с молчанием».

Вялікі англічанін Лоўрэнс у сваім "Апакаліпсісе" выказаў думку, вартую памяці. Кніга, піша ён, жыве столькі, колькі яна здольная змяняць нас *кожны* раз, калі яе чытаеш. Адна вычэрпваецца ўжо пры першым чытанні, яе часам нават не адолееш усю. А сапраўдную радасць адчуваеш, калі і потым, у тым жа тэксце, знаходзіш новыя сэнсы, фарбы, якія не заўважыў раней. Значна лепш, дадае ён, прачытаць адну кнігу шэсць разоў, чым адзін раз шэсць кніг. Упэўнены, што "Наедине с молчанием" адносіцца да першай катэгорыі кніг.

Юрый САПАЖКОЎ

Планета дзяцінства

У актавай зале цэнтральнай раённай бібліятэкі адбылося ўрачыстае адкрыццё Года Дзіцяці, на якое запрасілі вучняў СШ № 2 і іх бацькоў. У рамках праграмы прайшла сустрэча-размова з загадчыцай гарадской дзіцячай паліклінікі Г. Манеўскай.

Сапраўдным святам дзяцінства стала мерапрыемства дзіцячай бібліятэкі "Разам чытаем, разам адпачываем". У конкурснай праграме бралі ўдзел як сямейныя каманды, так і ўсе жадаючыя. Вучні 4 — 5-х класаў падрыхтавалі музычныя нумары, якія запоўнілі паўзы ў час працы журы. Сямейныя каманды паказалі добрыя веды, зладжанасць і знаходлівасць. Безумоўна, перамагла дружба, а ўдзельнікі атрымалі падарункі — кнігі.

Кніжна-часопісная экспазіцыя "Планета дзяцінства" і выстава-прагляд "Амаль пра ўсё для хлопчыкаў і дзяўчынак" засяродзілі ўвагу прысутных на цудоўных кнігах ды часопісах, якія раскрываюць усе бакі дзіцячага жыцця: захапленні, гульні, пытанні здароўя... Падарожжа ў часопісны свет "Бібліятэка — юным чытачам і іх бацькам" пазнаёміла з багатым светам перыядычных выданняў, карысных для сумеснага баўлення часу бацькоў і дзяцей.

Жан Жак Русо некалі прадбачліва заўважыў: "Прырода хоча, каб дзеці былі дзецьмі, перш чым стаць дарослымі. Калі мы хочам парушыць гэты парадак, мы атрымаем хуткаспелыя плады, якія не будуць мець ні спеласці, ні смаку і неўзабаве сапсуюцца. Дайце дзяцінству саспець у дзецях". Такая спеласць дасягаецца не цукеркамі ды іншымі ласункамі, а сапраўдным доглядам, выхаваннем, адукацыяй. Вялікую ролю тут адыгрывае і кніга.

Яўген ЛАПЦЕЎ

Марыя ДЗЮБАК

* * *

Патануць у бездані —
І чарамі
Хай п'яніць
Чаромхавы дурман...
І ўзляцець на крылах
На Ікаравых,
І не верыць,
Што жыццё — падман.
І прабачыць зло,
І сваіх ворагаў
Палюбіць,
Як і сваіх сяброў.
Вось дык зажыву,
Што люба-дорага.
Ці вяртацца
На Зямлю ізноў?

СВЕТЛЫЯ РОСТАНІ

Эх, памяць — дакор,
Дзе сумненняў так многа,
Дзе кроіць прастор
Крыжавая дарога,

Дзе іскры рабін,
Дзе суніцаў каралі, —
Святы напамін,
Дарагія скрыжалі.

Святла — акіян,
Неспазнанага многа.
Ты — ростань мая,
Крыжавая дарога.

* * *

У лес спяшаюся да дня,
Пакуль не ўгрэла кроны лета.
Мне дрэвы, кветкі — як радня,
Я іх чароўнасцю сагрэта.
Тут водар ягадна-грыбны.
І таямніцы — крок за крокам.
І хоць няблізка да вясны,
Але й да восені далёка.
Мой меднаствольны край лясны!
Тваёй красой — не наталіцца.
Як голаў кружыць дух сасны!
Ты для душы маёй — жывіца.

* * *

Паміжчассе — не то восень,
не то зіма.
Паміжмар'е — ці ёсць, ці няма?
Паміжвер'е — малюся і не...
Паміжхмар'е...
Ці сонца зірне?

* * *

Росна. Туманна. Золка.
Нудна і цёмна як!
Ціха! Зноў падае зорка —
Патух нечай долі маяк.

Нечае долі-нядолі
Зямны абарваўся шлях...
Не крыўдзіце бліжніх ніколі,
Мы ўсе тут часова, ў гасцях...

* * *

Мне далёка да вечнасці.
Мне не хочацца вернасці.
Ўжо не хочацца шчырасці.
Не хачу тваёй міласці.

Даражу я свабодаю.
Я сабою валодаю.
Мне б мацней стаць хоць кропельку.
Не лічыць свет утопіяй.

Не ўзлятаць разам з марамі,
А пад лёсу ударамі
Не зламацца, не згорбіцца.
Незалежнай стаць, гордаю.

Паласу прайсці чорную...

* * *

Не хачу. Не люблю. І не адчуваю.
Проста... проста — цябе забываю.
Не сумую. Не веру. Ужо не чакаю.
Проста — я ад цябе адвыкаю.

Усевалад ГАРАЧКА

* * *

Як загаралася першае лісце
на дрэвах,
Як ішоў наперад, наперад
Па хісткай кладцы вясны —

Радок за радком
Збягала ўдалеч чароўная стужка...

І вось яшчэ адна вясна за плячыма,
А ў далонях — новыя вершы.

* * *

Душа мая — нібы комін:
Пяе ў ёй вецер.

Ляцяць сюды
Пялёсткі з вясны.
І недзе ў грудзях,
Там дзе сэрца,
Згараюць,
Згасаюць.

Таму
Заўжды пячэ ў грудзях.
А вецер — пяе.
І белы попел уніз
Злятае,
Знікае.

ВОГНІШЧА

Назіраю за сваімі думкамі:
Добрае і дрэннае,
Святло і цемра,
Цень і агонь.
Танцуюць,
Танцуюць,
Танцуюць.
Невядома, чым гэта скончыцца,
І ці скончыцца,
Пакуль падкідаю дровы.

* * *

Наша каханне
Такое прыгожае,
Як першы снег,
Што ляціць на зямлю.
Яно такое прыгожае,
Як дрэвы
Ўвосень,
Што агалілі сваю жаўцізну,
Як летам —
Навальнічная хмара,
Што хутка пральецца дажджом.
Наша каханне, —
Яно
Зусім не падобнае на вясну.

ГЕРОІ

Яны спазналі ўсе таямніцы гэтага свету, перамаглі ўсіх цмокаў, вызвалілі ўсіх палонных і пайшлі далей чыніць сваю добрую справу.

Наперадзе іх чакаў іншы свет — свет даступны толькі абраным.

Нехта з іх там зробіцца цмокам, нехта будзе палонным, нехта — зноў стане героем.

* * *

Я пераможца,
І цяпер я хаджу
Па пустой і чужой зямлі,
Аглядаю свае прасторы
Далёка ад дому.
Ніхто тут не чыніць мне ліха,
Але і не кленчыць ніхто,
Не баіцца,
Бо навокал —
Толькі зямля.

* * *

Познія яблыкі
Ссыпаю ў поліэтыленавы мех.

Нікому яны не патрэбныя —
Апусцелы сад.

Так непадобны іх стук
На звон манет.

Але
Менавіта за познія яблыкі
Я купіў гэты верш.

* * *

Возера — старасць.
Гэта рэчка спынілася ўспомніць
Сваё мінулае.

Валянцін ЛУКША

МОЙ АНЁЛ

Шчаслівы мой анёл не быў ніколі,
Наведваў не парадным госцем дом, —
Заўжды круціўся, як вавёрка ў коле,
Гарбаціўся над прывідным радком.

Са мной адольваў дальнія дарогі,
З ілба рупліва горкі пот схінаў,
Мае малітвы шчырыя да Бога
Дакладна і старанна дастаўляў.

Дзяліў пароўну радасці і гора,
Пароўну невыцерпны боль дзяліў,
І, як старэйшы, пазіраў з дакорам,
Калі няроўна па жыцці руліў.

Я чысты перад ім. Я не назола,
Яму не вінаваты ні рубля...

Крыляюць бескарысліва анёлы,
Як зоркі, нам падказваючы шлях.

Веснавы настрой

Певень намагаецца напіцца
З лужыны вады — для звонкай песні.
Асвятлілі свечкамі Грамніцы
Шлях доўгачаканаму прадвесню.

Хоць зіма бярэ сваё начамі,
Шчокі, як сп'янелы госць, цалуе,
Капяжы у ясны дзень старанна
Вадасцёкі гулкія шліфуюць.

Сонейку удзячныя сініцы
Гімн спяваюць, як належыць птахам.
Ў нетрах варухнуліся крыніцы —
Час патрушчыць снегавыя гмахі.

Неба напаўняецца сінечай,
Быццам стужкі — раўчукі вадою,
І здаецца, што сівая вечнасць
Лучыць веснавы настрой з душою.

Белы карабель

Калі вятроў аціхне карусель,
І мора светлы ранак улагодзіць,
Маёй надзеі белы карабель
У гавань гаманлівую заходзіць.

І ветразі наструненыя ніц,
Як крылы, апускаюцца старанна.
У іх пунсовы водбліск зараніц,
Сінеча далягляда захавана.

Вады і хлеба возьме капітан,
Віном напоўніць ёмкую біклагу,
І зноў яго пакліча акіян,
Да новых астравоў шляхі
пралягуць.

Я карабель праводжу кожны раз,
Каб зноў сустрэць у гавані знаёмай,
Калі ж праб'е адмераны мне час,
Адпраўлюся на ім нарэшце з дому,

Я памахаю берагу рукой,
Слязу сатру натруджанай
далонню...

Не, гэта, ўсё-ткі, пэўна,
не за мной
Бялюткі карабель
прыплыў сягоння...

Даруйце

Не трэба наракаць на божы лёс,
Паддаўшыся пякучаму імгненню.
Даруйце ўсім, як дараваў Хрыстос,
У гэтым —
ад зямных грахоў збавенне.

Няўдзячны позірк
і няўклюдны крок —
Ці вартыя яны ўсяленскай
спрэчкі?
Не, гэта ваш няпройдзены урок,
Адзіны крок на сцежцы
векавечнай.

Хай крыўды адплываюць,
як ільды,
У далячынь гадоў
пад небам веснім.
Зязюля накувала нам гады,
Каб дакрыляць
у светлы храм нябесны.

Свой крыж пранёсшы
годна па зямлі,
Сабе на гэта зарабляеш права...

Так у бясконцасць жураўліны клін
Плыве увосень,
завяршыўшы справы.

Фота Канстанціна Дробава

Для каго і для чаго?

Мініяцюры

Таццяна МУШЫНСКАЯ

Знешняе і ўнутранае

У адной асобе заўсёды суіснуюць — часам гарманічна, часам не надта — чалавек знешні і чалавек унутраны. Яны могуць ідэальна супадаць, што здараецца рэдка. А могуць істотна адрозніваццa, нават супярэчыць. Многія ўласныя памылкі, расчараванні ў былых найлепшых сябрах, у людзях, якія вабілі, а потым адштурхнулі, тлумачу тым, што паміж знешнім і ўнутраным чалавекам існуе вялікая адлегласць.

Псіхолагі сцвярджаюць, што чалавеку, знешне прывабнаму, уяўленне іншых людзей дамалёўвае больш станоўчых душэўных якасцяў, чым непрывабнаму. Чаму? Мо таму, што кожны інстынктыўна імкнецца да прыгожага. Калі твар і гармонія ягоных рысаў — сапраўды твор мастацтва, дык яго можна разглядаць доўга, бясконца. Магчыма, таму артыстамі кіно, тэатра, эстрады становяцца людзі, чый твар вытрымлівае доўгае і працяглае разгляданне кіна- і тэлекамеры, а праз іх — дзесяткаў і соцень вачэй гледачоў. У век імклівага развіцця тэлебачання і панавання візуальных мастацтваў, у век бясконцых тэлесерыялаў і эстрадных шоу прыгожыя, гарманічныя твары аказваюцца вельмі запатрабаваныя. Сведчыць пра тое прэстыж прафесіі тэлевядучага, тэлекаментатара (а таксама ганарары тэлезорак, вядучых ток-шоу і рэаліці-шоу).

Несупадзенне знешняй прывабнасці і ўнутранага цынізму можа быць жахлівым. Гэтаксама, як несупадзенне пяшчотнай душы і зусім непрыгожай, непрывабнай яе абалонкі. Яркасць характару або яркасць таленту прымушае забыць пра адсутнасць ідэальных знешніх параметраў. Чароўнае ўнутранае святло здатнае зусім нечакана прадставіць асобу. З другога боку, калі ты глыбока расчараваўся ў чалавеку, яго знешняя прывабнасць ужо не цікавіць і нават раздражняе.

Несупадзенні могуць быць і іншыя. Узрост знешняга чалавека адлюстроўвае дата нараджэння, пазначаная ў пашпарце. Узрост, аблічча, самапачуванне чалавека ўнутранага адлюстроўвае бляск вачэй, цікаўнасць да жыцця, рухавасць. А таксама — ступень аптымізму ў настроі і гучанні ягоных твораў.

Ілюзія і рэальнасць

Калі чалавек не паглыблены ў свой твор, а знаходзіцца ў рэальнасці, дык многія псіхалагічныя праблемы проста не паўстаюць. Бо чалавек супадае з рэальнасцю. Ён знаходзіцца ў рэальнасці і існуе паводле яе законаў.

Калі творца пераходзіць ва ўласны, ім пабудаваны свет, адразу ж узнікае антаганізм, няхай да пары, да часу і прыхаваны. Антаганізм светаў рэальнага і ілюзорнага. Для творцы яны пачынаюць мяняцца месцамі. Рэальны робіцца ў пэўнай ступені ілюзорным, а ілюзорны — рэальным светам ягонага твора.

Чаму ўзнікае антаганізм? На ўсе прадметы, якія знаходзяцца ў гравітацыйным полі Зямлі, дзейнічае зямное прыцягненне. Стварэнне ўласнага свету — гэта пераадоленне зямных законаў. Трапіць у адкрыты космас фантазіі можна альбо дзякуючы таму, што ў цябе вельмі моцнае ўласнае біяполе, альбо з дапамогай «ракетаносьбітаў», у якасці якіх выступае высакародная, усеагульная, усёпаглынальная ідэя. Нацыянальная, рэлігійная ці нейкая іншая.

Гулівер у краіне ліліпутаў

Пісаць можна толькі тады, калі ты ўзняўся над побытам, над рэчаіснасцю, над будзённасцю. Над уласнымі праблемамі — побытавымі, фінансавымі, нават душэўнымі. Над усім дробязным, імгненным, не дужа істотным. З другога боку, творчасць — і ёсць адзін са сродкаў вырашэння многіх унутраных, духоўных праблем.

Чым вышэй ты узняўся, тым лягчэй пішацца. Таму не дзіўна, што сярод пісьменнікаў (і наогул прадстаўнікоў творчых прафесій) непараўнальна больш мужчын. Яны менш звязаныя з побытам, чым жанчыны, яны менш залежаць ад яго. А калі ты вымушаны паглыбляцца ў побыт, ты — як Гулівер у краіне ліліпутаў...

На ўсё жыццё запомнілася ілюстрацыя з дзіцячай кніжкі. Гулівер, трапіўшы ў невядомую яму краіну, яшчэ спіць. Ён ляжыць на зямлі, а ліліпуты, якіх вельмі напужаў ягоны рост, кожны валасок пышнай шавялюры незнаёмага чалавека прывязалі да асобнага калка. І ўсё! Болей не падымешся, каб і хацеў! Выдатная мастакоўская работа. Які вобраз! Не толькі Гулівера, а чалавека прыкутага — абставінамі, несупадзеннем. Вобраз чалавечай долі творцы.

Дарэчы, кніга Свіфта — бліскучая ілюстрацыя тэорыі адноснасці. Гулівер — велікан у краіне ліліпутаў, але ён, той самы Гулівер, — ліліпут у краіне веліканаў. Усё адноснае, усё спасцігаецца ў параўнанні. І ўсе нашы ацэнкі твораў, людзей таксама адносныя. Усё залежыць ад сістэмы каардынат...

Душэўнае распранання

Працэс чытацкага ўспрымання надрукаваных твораў, працэс публічнага выканання музычных опусаў заўсёды мае ў сабе пэўны элемент душэўнага стрыптызу. Ці, скажам мякчэй, душэўнага распранання...

Тое, што не хвалюе цябе, наўрад ці будзе хваляваць іншых. Гэта так. Але той, хто чытае, глядзіць, слухае, і той, хто піша, танцуе, іграе, спявае, знаходзяцца не ў раўназначнай сітуацыі. Чытач-слухач-глядач абаронены, "апрануты", ён — назіральнік. Таму што чытачоў-слухачоў-гледачоў шмат. А той, каго слухаюць, чытаюць, глядзяць, у нечым заўсёды безабаронны і "распрануты". Бо ён адзін...

Часам рэакцыя чытача або слухача такая, што ты імгненна разумееш, што ты — "голы". Вядома, не ў прамым сэнсе, а ў пераносным. Бо схавацца табе няма дзе і застаецца толькі спадзявацца на літасць і душэўную чуласць чытача-слухача-гледача. Якая, магчыма, ёсць, а якой, магчыма, і няма. У такіх выпадках са скрухай думаеш: "І нашто было друкаваць?! Няхай бы ляжала ў шуфлядзе пісьмовага стала і нікому не перашкаджала... есці ж не просіць! А можа, лепей наогул нічога не друкаваць?"

Дэпрэсія

Чалавек, які хоць аднойчы ў жыцці зведаў, што такое творчы ўздым, раней ці пазней абавязкова ведае, што такое творчы спад, які называюць дэпрэсіяй, а сучасная моладзь прасцей — "дэпрэсухай". Калі не пішацца, калі ўсё і ўсе раздражняюць. Нават тое, што, здавалася б, і не павінна раздражняць. І чым больш настойліва імкнешся раздражненне пераадолець, тым большая гарантыя, што атрымаецца наадварот. "Хвать писать — пропал запал!» — пісаў не так з гумарам, як з прыхаванай іроніяй А.Твардоўскі.

Думаю, творчыя крызісы перажываюць усе ці амаль усе. Толькі кожны імкнецца не акцэнтаваць на іх увагу, надта доўга не разважаць. Няхай усе думаюць, што ў мяне ўсё добра!

Калі ўявіць творчае развіццё ў выглядзе эмацыянальных і інтэлектуальных "арэляў" — уверх, уверх, уверх, потым паступова ўніз, а потым ізноў пацiху наверх — і так да бясконцасці, дык дэпрэсія — не што іншае, як самая ніжняя адзнака. Галоўнае, каб занадта надоўга ў ніжняй кропцы не затрымацца. У кожным чалавеку хаваецца бездань. І калі надта доўга засяроджвацца на ўласных змрочных думках, дык трапіць у гэтую бездань можна надоўга.

Пасля першай (ці другой) значнай творчай перамогі, пасля пэўнага грамадскага прызнання ўзнікае эйфарыя і нараджаецца ілюзія, што далей будзе вышэй, прасцей, лягчэй. Варта толькі сябе крыху прымусіць... Яшчэ... яшчэ... ну-ну... трошкі! А свядомасць маўчыць... Адчуванне жудаснае. Творчага чалавека яно не можа не пужаць. Бо прыходзіць трывалае адчуванне і ўстойлівае перакананне, што самае цікавае ты ўжо сказаў і нічога лепшага за ўсё астатняе жыццё не скажаш. Чалавек у стане дэпрэсіі нагадвае іграка ў рулетку, які ўсё паставіў на кон, і прайграў... А што рабіць далей — невядома.

Чытачы

Часам літаратура нагадвае вуліцу з аднабаковым рухам. У бок чытача. Прыдумаў, напісаў, занёс у рэдакцыю, пачакаў, апублікавалі. І — усё... Бывае, што трое сяброў скажуць, што прачыталі. Здараецца, яшчэ і рэцэнзія з'явіцца — разгорнутая ці малая. А бывае, што цішыня... А ці чыталі тыя, каму адрасавана, ці не чыталі? Закранула ці не закранула? І наогул — ці патрэбны яшчэ каму-небудзь твае практыкаванні на паперы ці ўжо даўно не?.. Кожнаму хочацца мець водгук тады, калі ты яшчэ не "астыў", не адышоў далёка ад тэксту.

Вельмі даўно, у 1983 ці 1984 годзе, калі працавала ў "ЛіМе", у калідоры рэдакцыі сустрэла Уладзіміра Арлова. Ён тады жыў у Наваполацку, а ў штотыднёвік час ад часу прывозіў свае творы. Прыхільнікі пісьменніка з радасцю і захапленнем чыталі ягоныя апавяданні ("Місія папскага нунцыя", "Пяць мужчын у леснічоўцы" і іншыя).

Я заўсёды лічыла, што калі можаш сказаць добрыя словы пісьменніку, мастаку, артысту, — скажы! Адкуль ты ведаеш, які ў чалавека настрой? Літаратурная барацьба — яна ж бясконцая... Гэтаксама, як барацьба амбіцый унутры яе. Хоць, з другога боку, цудоўна разумела, што значыць для Арлова, няхай маладога, але пісьменніка, меркаванні невядомай маладой журналісткі, якіх вакол безліч!

Рэакцыя аказалася нечаканай.

— Дзякуй за добрыя словы! А пішаш — як у пустую прастору. А ці чытаў хто-небудзь, ці не чытаў — і невядома...

Здараецца, што рэха ад даўно напісанай рэчы далятае да цябе праз шмат гадоў. Гэтаксама, як рэха напаўзабытай радыёперадачы ці тэлеэфіру, куды запрашалі з музычнай, літаратурнай ці тэатральнай нагоды. Тэлефаную ў віцебскі краязнаўчы музей па справах рэдакцыі, шукаю дырэктара, а таму прадстаўляюся.

— А я вас ведаю, — кажа мне супрацоўнік музея на тым канцы провада. — Я ў "Маладосці" вашу аповесць чытаў...

"Нам не дано предугадать, как наше слово отзовется..." Та-а-а-к, Фёдар Іванавіч, я вас вітаю і зноў згадваю!

«А вы по-русски понимаете?»

Адчуць, ці патрэбнае тваё пісанне яшчэ каму-небудзь, акрамя сяброў, вельмі дапамагаюць сустрэчы з чытачамі. Іх у мяне было шмат — пераважна ў дзіцячых бібліятэках і школах.

Адна з самых запамінальных адбылася ў мінскай матэматычнай гімназіі № 50. Запрасіла мяне ў гімназію, каб выступіць перад вучнямі-другакласнікамі, даўняя знаёмая — Людміла Іванаўна Моднік, тагачасны завуч пачатковых класаў, з якой некалі вучыліся ў адной школе, але ў паралельных класах. Людміла ў той час мела прозвішча Дружына, і была дзяўчынай актыўнай, завадатарам многіх класных і школьных спраў.

Пачынаецца сустрэча. Адразу відаць, што дзеці не абы-якія. Вочы разумныя, жвавыя. Публіка няўрымслівая і гаваркая. Падрыхтаваліся да сустрэчы грунтоўна! Такой увагі і павагі да пісьменніка, такой душэўнай тактоўнасці і чуласці не сустракала нідзе і ніколі. На заслоне, якая аддзяляла сцэну ад актавай залы, вісела безліч дзіцячых малюнкаў, зробленых яркімі фламасцерамі, каляровымі алоўкамі і проста шарыкавай ручкай. Найчасцей на малюнках трапляліся іншапланетныя талеркі, мурашы і выявы хатніх жывёл. Гэта ілюстрацыі да кніжкі маіх апавяданняў і казак "Віця Неслух у краіне мурашў". Потым дзеці падаравалі малюнкі мне на памяць, беражліва захоўваю іх у асобнай папцы да сённяшняга часу як сапраўдную рэліквію.

Хлопчыкі і дзяўчынкі чыталі на памяць урыўкі з апавяданняў і вершы. Вядома, задавалі пытанні. Былі яны і разумныя, і гарэзныя, і па-дзіцячы непасрэдныя. Ім усё было цікава:

— А ў якой школе вы вучыліся?

— Якія былі вашы любімыя прадметы?

— Ці былі ў вас двойкі?

— Які быў ваш першы верш?

— А ці памятаеце вы сваё першае апавяданне?

— Як завуць вашых дзяцей?

— Які свой верш вы найбольш любіце?

— Як вы іх прыдумваеце?

Адно з пытанняў, якое выклікала смех і дзяцей, і настаўнікаў, было вартае клуба вясёлых і знаходлівых:

— Скажите, пожалуйста, а вы по-русски понимаете?

І смяяцца хацелася, і плакаць адначасова. Бо для дзяцей нязвыкла, калі нехта прыходзіць да іх і размаўляе па-беларуску.

І яшчэ адно цікавае пытанне прагучала на сустрэчы: "А ці ёсць у вас дома кот ці сабака?". Прагучала невыпадкова. Бо ў зборніку вершаў "Калі тата — Дзед Мароз" быў змешчаны верш "Сумны кот" пра ката-бамжа, у якога няма ўтульнага ўласнага дома. Мяркуючы па тым, колькі сярод дзіцячых малюнкаў аказалася выяў катоў, я зразумела. што лёс менавіта гэтага ката моцна крануў дзяцей.

Задумалася, што ж адказваць? Дзеці зусім лагічна палічылі, што нельга цікава напісаць пра ката, не меўшы дома ўласнага ката і не меўшы магчымасць за ім назіраць. Яны, вядома, чакалі адказу, што кот ёсць. Увогуле выдумляць можна, але хлусіць надта ж неприемна! Але калі спытаюць, а як ката клічуць? А якога ён колеру? Заблытаешся сам. Таму давялося адразу сказаць, што катоў няма... Дагэтуль памятаю лёгкае, ледзь прыкметнае расчараванне, якое, нібы павеў ветру, праляцела па аўдыторыі.

Напрыканцы сустрэчы дзеці падаравалі шмат кветак. А яшчэ былі аўтографы на памяць. Сёння, калі пісьменнік грамадству не надта патрэбны, а дзіцячы асабліва, і, акрамя маральных дывідэндаў, амаль нічога са сваёй працы не мае, такое стаўленне ўспрымаецца як фантастычнае і амаль неверагоднае... Такія сустрэчы запамінаюцца на ўсё жыццё... Велізарнай колькасцю шчырых, шчодрых, непасрэдных дзіцячых эмоцый.

Для каго і для чаго?

Для каго пішуць — вершы, паэмы, п'есы, раманы артыкулы, сімфоніі? Для народа? Але тыя п'яныя, з "фінгаламі" пад вачыма, пакамечаныя дзядзькі і цёткі, якія стаяць ля магазіна і падлічваюць наяўныя грошы і праз кожнае слова мацюкаюцца, — скажыце мне, яны народ ці не народ? Той, хто крадзе чужыя машыны, "чысціць" дачы і кватэры, сумкі і кішэні ў гарадскім транспарце, — яны таксама народ? Або не народ? Можна, вядома, суцяшаць сябе тым, што гэта не народ, а насельніцтва, што гэта люмпен, які быў, ёсць і будзе. На жаль, колькасць гэтага люмпена неяк незаўважна большае з кожным годам.

Значыць, усё-такі пішуць не для народа, а для асобных яго прадстаўнікоў. Бо амаль 10 мільёнаў жыхароў Беларусі і трохтысячныя тыражы вядучых літаратурных часопісаў краіны мала між сабою стасуюцца. Гэтаксама, як амаль двухмільённы Мінск і 60 чалавек, якія звычайна прысутнічалі на філарманічных канцэртах у касцёле святога Роха.

Магчыма, пішуць для самога сябе, для сяброў, для каханай (каханага). Для самавыяўлення і самаўсведамлення. Для таго, каб ведаць пра свае здольнасці. Для таго, каб убачылі, ацанілі, зразумелі, палюбілі. Для таго, каб быць унутры літаратуры, музыкі, тэатра — як унутры хаты... А не назіраць знадворку, цішком у вокны.

Для чаго пішуць?

Часцей усё-такі не для грошай. Бо ўсім зразумела, што за літаратурны і музычны заробак, прынамсі, у нашай краіне, пражыць нельга. Як пісаў Пушкін: "Не продается вдохновенье, но можно рукопись продать..."

Роля паэта, празаіка, кампазітара, музыканта ў сучасным грамадстве хутчэй метафізічная. Пішуць для ідэі, для самога мастацтва, для падтрымання духоўнага, інтэлектуальнага статуса грамадства. Каб было пра што думаць, каб было што абмяркоўваць, каб было пра што гаварыць. Уласнымі творамі мастак падтрымлівае дух. Падтрымлівае ў сэрцах суайчыннікаў веру ў справядлівасць. Роля мастака — люстэрка эпохі, на мой погляд, і метафізічная, і містычная. Пішуць, каб застацца ў гісторыі. Магчыма, назаўжды.

І апошні нюанс тэмы. Як суадносіцца мастацтва з рэальным жыццём? На гэтую тэму я гутарыла з дызайнерам, які шмат гадоў працуе ў Нацыянальным тэатры балета, і штодня судакранаецца з гэтай вытанчанай, рафінаванай сферай творчасці.

— Мастацтва існуе выключна для самога мастацтва. Гэта такі субстрат, які можна вырасціць толькі штучна, у спецыяльна створаных умовах.

Таксама тлумачэнне...

Арт-пацеркі

У Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі адбываюцца не толькі справаздачныя канцэрты кафедраў, экзаменацыйныя выступленні сёлетніх выпускнікоў і асістэнтаў-стажораў. З уделам сімфанічнага аркестра БДАМ "Маладая Беларусь" пад кіраўніцтвам прафесара М. Казінца прайшоў канцэрт кітайскіх студэнтаў і магістрантаў. Праграмай "Прысвячэнне" адзначалася 90-годдзе з дня нараджэння прафесара фартэпіяна Ірыны Цвятаевай (1917—1992). Нядаўна прымала гэтая сцэна і замежных гасцей: студэнтаў Казанскай дзяржаўнай кансерваторыі імя М. Жыганава, студэнтаў Эстонскай акадэміі музыкі і тэатра. 21 мая тут будзе гучаць фартэпіянная музыка ў выкананні студэнтаў класа прафесара У. Няхаенкі. А 23 і 28-га — "Кармэн" Ж. Бізэ: яе пастаноўку пакажа оперная студыя БДАМ.

На Малой сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ажыццёўлена прэм'ера аднаактовай драмы "Маці" паводле К. Чапэка (пераклад на рускую мову А. Гуровіча, на беларускую — М. Бартніцкай). Яна разгортваецца ў сутыкненні дзвюх пазіцый: сыноў-мужчын,

якія бачаць сябе абаронцамі сям'і і айчыны, гатовымі, як бацька, аддаць за гэта жыццё, і жанчыны-маці, якая не можа ўразумець, чаму яе дзеці павінны паміраць за іншых. "Памерці можа кожны, а вось страціць мужа альбо сына?" — разважае гераіня спектакля, якая аднаго за адным страчвае сваіх сыноў. Найбольшай духоўнай моцы і гераізму жыццёвыя выпрабаванні вымагаюць менавіта ад жанчыны, ад маці... Рэжысёр-пастаноўшчык — Я. Лёгкін, мастак А. Меранкоў, пластыка В. Скварцовай. У галоўнай ролі — заслужаная артыстка Беларусі Зоя Белахвосцік.

Вечар, прымеркаваны да 80-годдзя з дня нараджэння народнага артыста Беларусі Юрыя Сідарава, прайшоў у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага. Ураджэнец Расіі, Ю. Сідараў з адзнакай скончыў Маскоўскае тэатральнае вучылішча імя М. Шчэпкіна і атрымаў накіраванне ў Гродзенскі абласны драматычны тэатр. Там працаваў 5 гадоў, а ў 1954-м быў пераведзены ў Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР імя М. Горкага. Гэтай сцэне, дзе ён адразу ж заняў вядучае месца, артыст быў адданы да свайго апошняга дня. Яго рознабаковы талент выяўляўся дасканалай псіхалагічнай распрацоўкай роляў як гераічных, так і камедыйных, і бытавога плана. Сярод лепшых сцэнічных работ Ю. Сідарава — Мікіта ("Улада цемры" Л. Талстога), Цэзар, Палоній ("Антоній і Клеапатра", "Гамлет" У. Шэкспіра), Фёдар ("Барабаншчыца" А. Салынскага), Пратасаў, Ягор ("Дзеці сонца", "Ягор Булычоў і іншыя" М. Горкага), Арыстарх ("Энергічныя людзі" В. Шукшына) ды інш. Ён стварыў нямала адметных вобразаў у кіно, на ТБ, у радыёспектаклях. Сакрэты свайго майстэрства Ю. Сідараў перадаваў студэнтам Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

С. ВЕТКА

Фота А. Дзмітрыева

Валерый Кучынскі... Дастаткова вымавіць гэтае імя, як памяць паслужліва малюе тым, каму пашанцавала чуць яго чароўны голас, вобраз надзвычайна артыстычнага спевака з цудоўным мастацкім густам і майстэрствам. Нябёсы шчодра адарылі В. Кучынскага: таленавіты музыкант, голас рэдкага тэмбру, прыгажосць, абаяльнасць — усё гэта ў непаўторным сінтэзе стварыла своеасаблівы эталон спеўнага мастацтва.

Суровы і зычлівы лёс

Артыстычны лёс Валерыя Кучынскага аказаўся для яго зычлівы, але ў той жа час — і суровы. Яшчэ калі быў студэнтам Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, ён дасягаў перамогі на многіх конкурсах, у тым ліку, на Усесаюзным конкурсе імя М. Глінкі, Міжнародным конкурсе савецкай песні ў Сочы. А ў 1970 годзе, на IV Міжнародным конкурсе імя П. Чайкоўскага, найбольш прэстыжным і аўтарытэтным у музычным свеце, спявак-пачаткавец атрымаў званне лаўрэата. Гэта быў фантастычны ўзлёт у стратасферу вакальнага мастацтва. І потым — усё жыццё на сцэне. Дзе б ні выступаў спявак: у замежжы, на сталічных опернай і філарманічнай сцэнах, у вайсковых падраздзяленнях альбо ў вясковым клубе, — залу заўсёды адразу напаўняла асаблівая "кучынская" атмасфера.

Слухаючы Валерыя Кучынскага, ніколі не сумняваўся: талент дадзены артысту Богам для таго, каб не толькі прыносіць людзям радасць далучэння да музыкі, але і рабіць іх больш шчаслівымі, ачышчаць іх душы.

Аднак каварны лёс наканаваў Кучынскаму не толькі лаўры і авацыі, але і цяжкія выпрабаванні. У апагеі яго славы, у росквіце творчых сіл з артыстам здарылася страшная бяда. Цяжкая хвароба падпільнавала і прыкавала ўлюбёнца публікі да ложка. І цяжка было тады нават уявіць, што чалавек, якому дактары вынеслі смяротны прысуд, не толькі падымецца, але і заспявае зноў.

Сведкамі гэтага цуду сталі слухачы, якія прыйшлі ў Вялікую залу Беларускай дзяржаўнай філармоніі на бенефіс-канцэрт Валерыя Кучынскага, прысвечаны яго 60-годдзю. "Музычны дарунак" — так назваў гэты дабрачынны вечар аўтар і рэжысёр праекта, арт-дырэктар прадзюсерскага цэнтра "Класіка" Беларускага саюза музычных дзеячаў, вялікі сябра юбіляра Валерый Уколаў.

А "дарункаў" было шмат. Цёплыя словы ўдзячнасці выказалі выдатнаму спеваку прадстаўнікі арганізацый-заснавальнікаў гэтага мерапрыемства — намеснік міністра культуры краіны В. Гедройц і першы намеснік старшыні праўлення Беларускага саюза музычных дзеячаў Н. Вітчанка. Прагучалі прывітанні ад Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Таварыства ветэранаў-блакаднікаў Ленінграда, Маладзечанскага музычнага вучылішча імя М. Кл. Агінскага... Прыехаў з Масквы народны артыст СССР, першы віцэ-прэзідэнт Міжнароднага саюза музычных дзеячаў У. П'яўко.

У тым легендарным 1970-м яны стаялі побач на сцэне, калі абвяшчаліся імёны новых лаўрэатаў конкурсу імя П. Чайкоўскага: Алена Абразцова, Яўген Несцярэнка, Зураб Саткілава, Тамара Сіняўская, Уладзіслаў П'яўко і ён, Валерый Кучынскі. Вось якое сузор'е! Але Кучынскі не згубіўся сярод знакамітых імёнаў. "За выдатны ўклад у развіццё музычнага мастацтва" Міжнародны саюз музычных дзеячаў узнагародзіў яго медалём, які Уладзіслаў П'яўко ўрачыста ўручыў юбіляру.

А яшчэ было шмат "музычных дарункаў" ад артыстаў — сяброў і калег. Даўняя дружба і плённае супрацоўніцтва звязвае Валерыя Кучынскага з такімі знанымі творчымі людзьмі, як кампазітар Ігар Лучанок, артысты эстрады Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч, саліст оперы Алег Мельнікаў. І, зразумела, з музыкаэнаўцай Інай Зубрыч і акцёрам, рэжысёрам Валерыем Анісенкам, якія вялі канцэрт. Поўнае творчае ўзаемаразуменне склалася за час падрыхтоўкі да канцэрта паміж юбілярам і Прэзідэнцкім аркестрам, яго мастацкім кіраўніком і дырыжорам Віктарам Бабарыкіным. Малады музычны калектыў цудоўна справіўся са складанай задачай: давялося суправаджаць выкананне і опернай класікі, і твораў эстрадных; гучалі і аркестравыя пьесы.

Заключны акорд вечара ўразіў усіх. Валерый Кучынскі заспяваў фінальную "Перамогу" Л. Захлеўнага дуэтам з народным артыстам Беларусі Уладзімірам Яскевічам. Так! Гэта той самы прыгажун-голас, аб'ёмны, напоўнены моцай і зухаватасцю, натхненнем і гарачым пачуццём. А далей — больш! У сольным выкананні юбіляра загучала песня, якая з'яўляецца яго талісманам: "Ты мне вясною прыснілася" Ю. Семянякі. З гэтай песняй Кучынскі пачынаў сваю кар'еру спевака, з ёю паступаў у кансерваторыю, з ёю ішоў па жыцці. І заўсёды яна прыносіла велізарны поспех...

Зала захоплена, стаіўшы дыханне, слухала песню-споведзь. Яе Валерый Кучынскі прысвяціў сваім любым жанчынам: маці Клаўдзіі Кірылаўне і жонцы Наталлі, якая ў адказ на страшны медыцынскі прысуд у 2001 годзе сказала: "Ты будзеш не толькі жыць, але і спяваць, і спяваць не горш за тое, як было раней." Што яны перажылі за гэтыя гады — ведаюць толькі яны адны і Госпад Бог. Але дзівоснае адчуванне таго, што ўвачавідкі здзейсніўся подзвіг, подзвіг чалавека і спевака, прымусіла залу ўзняцца ў агульным парыванні. Бясконцыя апладысменты, слёзы, мора кветак...

Гэта быў сапраўдны катарсіс, хвіліны прасвятлення, адухоўленасці. Меў рацыю Валерый Анісенка, сказаўшы ў сваім прывітанні, што такая сустрэча з юбілярам найперш была патрэбная нам. Усім нам, удзячным слухачам спевака, творчасць якога складае цэлую эпоху ў музычнай культуры Беларусі.

Міхаіл СОЛАПАЎ,
заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, прафесар

Фота У. Вітчанкі

Усе тэатры — побач

Неверагодна? Але ж факт: у адных сценах, на адным паверсе, на плошчы 85 квадратных метраў размясціліся ўсе прафесійныя тэатры краіны. Іх — два дзесяткі: нацыянальныя, рэспубліканскія, абласныя... Дзе ж такі казачны дом? У гістарычным квартале сталіцы. Наша творчая інтэлігенцыя і аматары мастацтва добра ведаюць гэты адрас: Музычны завулак, 5, Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі.

Леташняй восенню на 3-м паверсе музея адкрылася новая пастаянная экспазіцыя, праца над якой працягвалася амаль год. Цяпер, трапіўшы ў гэтую залу, можна, вобразна кажучы, калі не наведацца, дык зазірнуць ва ўсе тэатры, якія існавалі ў Беларусі 1920-х гадоў, якія дзейнічаюць сёння. Прысутнасць кожнага з іх пазначана старонкамі гісторыі, хронікай прэм'ер і гастрольных вандровак, мемарыяльнымі куткамі незабыўных карыфеяў сцэны. Афішы, фота, праграмкі, сцэнічны рэквізіт і касцюмы, асабістыя рэчы вядомых дзеячаў тэатра...

Абумоўлены абмежаванасцю выставачнай плошчы, добра прадуманы дызайн гэтай змястоўнай і ёмістай экспазіцыі надае ёй сцісласць, лаканізм. І — пэўную мабільнасць: рухомыя і рассоўныя элементы, планшэты, стэнды-купэ дазваляюць маніпуляваць кампактна размешчанымі матэрыяламі, "паглыбляцца" ў інфармацыйны шэраг. Уявіце: расхінаецца, як заслона, модуль, прысвечаны Коласаўскаму тэатру, і перад вачамі — глыбіні гісторыі: ад стварэння трупы БДТ-2, ад легендарнага "Несцеркі", да лепшых роляў Ц. Сяргейчыка, А. Ільінскага, П. Малчанава, З. Канапелькі...

Усім цікаўным і неабыякавым да прафесійнай тэатральнай культуры, да нашай мастацкай творчасці тут ёсць да чаго прыглядзецца. Дакументальны факт, радок афішы, фотапартрэт у ролі — і ўжо нагода паразважаць, задумацца, расчуліцца, усміхнуцца.

Звесткі пра перасоўны тэатр У. Галубка і пра стварэнне ў нашай сталіцы (для сённяшняга Мінска амаль што экзатычных) дзяржаўных польскага і яўрэйскага тэатраў. Купалаўскі... Сярод іканаграфічных матэрыялаў — кранальныя рэчы: макет ужо хрэстаматыйнай "Паўлінкі"; парасон Веры Пола; столік, зроблены знакамітым сцэнографам А. Марыксам, і яго шахматы; скульптурная фігурка зубра, якая належала З. Браварскай; гітара П. Кармуніна; сяброўскія шаржы — хобі акцёра Ф. Варанецкага... Горкаўскі тэатр... Вылучаецца постаць Аляксандры Клімавай; заўважаеш і кнігу з серыі "ЖЗЛБ" пра сённяшняга куміра публікі Р. Янкоўскага.

З гэтага года ў музеі для студэнтаў, школьнікаў наладжваюцца экскурсіі ў дапамогу вывучэння творчасці І. Мележа, І. Шамякіна, іншых тэм па беларускай літаратуры. Аднак у цэнтры ўвагі, безумоўна, тэатральныя з'явы. З гэтай мэтай папаўняецца відэатэка музея: для правядзення экскурсій, лекцый, гутарак выкарыстоўваюцца дакументальныя фільмы і стужкі Белвідэацэнтра, прысвечаныя жыццю і творчасці Д. Арлова, М. Яроменкі, З. Браварскай, Л. Давідовіч. Ёсць і запісы некаторых спектакляў.

З адметнасцю экспазіцыі захоплена знаёмілі мяне навуковыя супрацоўнікі музея П. Амяльковіч ды С. Мацюшэнка. Дадаў свой расповед і загадчык экспазіцыйнага аддзела А. Міхаленя:

— Ініцыятар стварэння новай экспазіцыі — дырэктар музея З. Кучар. Да гэтай працы быў далучаны У. Кандрацьеў, мастак-дызайнер з багатым вопытам стварэння выставачных кампазіцый. Нашы навуковыя супрацоўнікі сабралі належны матэрыял па тэмах. У гэтай збіральніцкай працы, у стварэнні экспазіцыі дапамагалі такія знаўцы тэатра, як А. Лабовіч, А. Сабалеўскі, Б. Бур'ян. Дзякуй за дапамогу коласаўцам С. Акружной, В. Дашкевічу, дачцэ колішняга дырэктара ТЮГа Д. Стэльмах, сям'і П. Кармуніна, галоўнаму мастаку Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Б. Герлавану (ён сам перадаў макет свайго афармлення спектакля "Плач перапёлкі") і многім іншым. На гэтай плошчы з трох тысяч сабраных фондавых экспанатаў размясцілася крыху больш як 600. Але яны даволі поўна адлюстроўваюць гістарычную і сённяшнюю панараму нашых тэатраў. Апроч самых знакамітых, тут прадстаўлены і сённяшнія рэгіянальныя — Магілёўскі абласны тэатр драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча, што працуе ў Бабруйску, Слонімскі імя І. Мележа, Мазырскі. Ёсць і Маладзёжны, РТБД, кінаакцёра, "Дзе-Я" і г.д. З часам на 2-м паверсе музея плануецца разгарнуць экспазіцыю, прысвечаную школьнаму і магнацкаму, радзівілаўскаму тэатрам.

Вось такая, збольшага, перспектыва.

С. БЕРАСЦЕНЬ

На здымку: дырэктар музея З. Кучар знаёміць першага намесніка міністра культуры Беларусі У. Рылатку з экспазіцыяй.

Фота К. Дробава

Старыя. Жывыя. Свае!

Пяць старадаўніх інструментаў, пяць характараў, пяць гісторый — і гэта толькі невялікі кавалак нашай багатай музычнай спадчыны...

Сёлета кіраўнік гурта "Стары Ольса" Зміцер Сасноўскі набыў вядомасць як рэжысёр дакументальнага фільма "Старыя інструменты Беларусі". У ім перад гледачом паўстае гісторыя пяці старадаўніх музычных інструментаў: дуды, лютні, ліры, гусляў і сурмы. Стужка падзеленая на пяць частак, у кожнай ідзе гаворка пра вышэйназваныя інструменты. Фільм дакументальны, але з мастацкімі ўстаўкамі. Пры яго стварэнні рэжысёр прытрымліваўся стылістыкі вядомых сусветных тэлеканалаў "Discovery" і "National Geographic".

Доўгія паўтара года пайшло на стварэнне музычнай "кінаэнцыклапедыі". Я нясуць у сабе каштоўную інфармацыю. За 58 хвілін (такая працягласць фільма) гледачу раскрываецца гісторыя кожнага інструмента: як ён трапіў на Беларусь, дзе на ім гралі — ці то ў палацы, ці то ў жабрацкім асяроддзі, гаворка ідзе і пра асаблівасці вырабу дуды, лютні, ліры, гусляў, сурмы.

У здымках удзельнічалі тэатр "Яварына", рыцарскі клуб "Княжы Гуф", коннагістарычны клуб "Залатая шпора" і інш. Выкарыстаная музыка многіх гуртоў і асобных выканаўцаў.

З'яўленне такога фільма невыпадковае. Сёння ў беларускім грамадстве відавочна ўзрасла цікавасць да

невыпадкова выкарыстоўваю такое параўнанне, бо фільм насычаны гістарычнымі звесткамі, навуковымі адкрыццямі і глыбокімі даследаваннямі. За час працы здымачная група з'ездзіла ў 8 этнаграфічных экспедыцый, запісвала ўспаміны старых людзей, якія маглі бачыць даўнія інструменты, чуць іх, граць на іх. Падчас працы ў Дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў у Дзяржынску было зроблена шмат навуковых адкрыццяў. Напрыклад, знойдзены унікальны фотаздымак І. Гвазда, апошняга дудара сярэдзіны XX ст. Фільм насычаны і іншымі цікавымі архіўнымі знаходкамі, запісамі. Глядач гартае старонкі Радзівілаўскага летапісу, знаёміцца са старажытнымі гравюрамі.

Таямніцы кожнага інструмента адкрываюць майстры, якія займаюцца іх рэканструкцыяй. Так, пра дуду распавядаюць вядомыя майстры і этнографы Тодар Кашкурэвіч, Алесь Лось, Віктар Кульпін, Алесь Жура. Знаўцы лютні — Ілья Кубліцкі, Юры Дубнавіцкі, Тацяна Бяльковіч. Гуслі майструюць Валеры Зінкевіч і Алесь Чумакоў, вырабам сурмы займаецца майстар Алесь Курбан. Неаднаразова аўтар фільма звяртаецца да меркаванняў вядомых навукоўцаў, мастацтвазнаўцаў, выкладчыкаў. Сваімі ведамі дзеляцца прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Валеры Жывалеўскі, доктар мастацтвазнаўства Вольга Дадзіёмава, журналіст, спецыяліст у галіне традыцыйнай культуры Рэгіна Гамзовіч. Кожны кадр, кожны сказ, кожнае слова ўласнай музычнай гісторыі і культуры. Пра гэта сведчаць колькасць вучняў у вядомых майстроў музычных інструментаў, натоўпы моладзі на вечарынах самабытных музыкаў, аншлагі ў канцэртных залах падчас выступленняў гуртоў, якія выкарыстоўваюць даўнія інструменты. І павелічэнне колькасці такіх гуртоў таксама сведчыць пра ўздым папулярнасці беларускіх інструментаў: "Стары Ольса", "Келіх Кола", "Літвінтроль", "Тэстамент" — пералік можна працягваць.

Упершыню мінчане ўбачылі фільм З. Сасноўскага 9 красавіка ў кіналекцыйнай зале Мінскага гарадскога Палаца моладзі. На прэзентацыю прыйшлі знаёмыя, сябры рэжысёра, а таксама тыя, хто браў непасрэдны ўдзел у стварэнні стужкі. Пакуль гледачы збіраліся, у зале адбыўся невялічкі канцэрт гурта "Тэстамент", пасля якога павіншаваць гаспадара вечарыны на сцэну выйшлі мастак і музыка Тодар Кашкурэвіч, кіраўнік студыі "Дуэт" Ігар Таркан. Фільм быў зняты пры падтрымцы Дзярждэпартамента ЗША ў межах праграмы, накіраванай на захаванне сусветнай культурнай спадчыны, таму на прэзентацыі слова было дадзена паслу ЗША ў Беларусі К. Сцюарт, якая, дарэчы, і павітала гледачоў, і працягвала сваю прамову на беларускай мове.

Шчодрыя апладысменты сведчылі пра безумоўны поспех стужкі. І доўга яшчэ стаялі ў чарзе тыя, хто хацеў павіншаваць рэжысёра і падзякаваць яму за натхнёную працу. А неўзабаве адбылася і другая прэзентацыя "Старых інструментаў Беларусі" — у нязвыклым для кінапрагляду месцы, у сталічным касцёле Найсвяцейшай Тройцы (св.Роха), падчас VIII фестывалю духоўнай музыкі "Залатагорская ліра". Дарэчы, у фільме выкарыстана шмат запісаў з колішніх святочных канцэртаў, якія ладзіліся тут, на Залатой Горцы.

Пераклад фільма на беларускую мову зроблены Андрэем Бурсавым. І беларуская, і англійская DVD-версіі ў хуткім часе з'явяцца ў мінскіх крамах.

Можна з упэўненасцю падкрэсліць унікальнасць фільма "Старыя інструменты Беларусі". Унікальнасць у плане навуковым, а таксама, не выключана, і ў адукацыйным. На жаль, няма у беларускіх музычных школах класаў, дзе дзеці змаглі б авалодаць лютняй, лірай, зайграць на дудзе. Можа, пасля выхаду фільма праграму навучання ў дзіцячых музычных школах чакаюць рэформы?...

Яна ШЫДЛОЎСКАЯ

На здымках: кадры з фільма "Старыя інструменты Беларусі".

"Няма сумніву, што тэатр, які толькі пачынаў сваё жыццё ў 50-я гады мінулага стагоддзя, быў сапраўдны і шчыры. Ён адпавядаў патрабаванням свайго часу. Хацелася б, каб і наш сучасны ТЮГ таксама быў такі", — гэтымі словамі завяршаецца агляд спектакляў шаноўнага творчага калектыву, змешчаны ў "ЛіМе" 11.04.2007 г. (Вераніка Ярмалінская, "Тэатр там, дзе пачуцці сапраўдныя"). У працяг нататкаў мастацтвазнаўцы мы друкуем акцёрскі допіс пра творчае жыццё ТЮГа — своеасаблівы палемічны "погляд знутры".

Ці можна?

Спектакль як мастацтва (бо любое самадзейнае відовішча можна назваць спектаклем) — гэта ўнутраная неабходнасць жывой, трапяткой душы творцы. Такімі былі спектаклі галоўнага рэжысёра Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача А. Андросіка. У 2003 годзе, пасля яго заўчаснай смерці, на гэтую пасаду была прызначана Н. Башава, якая працавала ў тэатры чарговым рэжысёрам. Падчас прызначэння 3/4 акцёрскай трупы выказаліся супраць Н. Башавай — з думкай пра яе няздатнасць да выканання абавязкаў галоўнага рэжысёра. А раней у тэатры адбыўся "круглы стол" з удзелам нашых слынных крытыкаў: Т. Арловай, Т. Гаробчанкі, Р. Смольскага і інш. Яны прагледзелі амаль усе спектаклі, якія ішлі на той час, і далі ім сваю адзнаку вартасці. Вышэйшую атрымалі "Шчаслівыя жабракі" — рэж. М. Шыйко, "Маленькі лорд Фаўнтлярой", "Палачанка" — рэж. А. Андросік. Са спектакляў Н. Башавай згадалі "Русалачку". "Трэба шукаць, працаваць, эксперыментаваць", — была ёй парада крытыкаў.

Пастаноўкі Н. Башавай, у лепшым выпадку, — чытанне на розныя галасы тэксту п'есы пад музыку, танцы, песні. Рэпетыцыйны працэс Н. Башавай — гэта патрабаванне рэжысёра ад акцёраў ведання тэксту і паказ ім — хто адкуль выходзіць і куды рухаецца. Спроба акцёра штосьці высветліць адносна ролі сустракае імгненны адказ рэжысёра — сустрэчным пытаннем: "А што тут незразумелага?" У дадатак крыўда, крык.

Жыццё тэатра складаецца і з творчых планаў. Абвешчаныя назвы пастановак, здаралася, змяняліся іншымі. А ўрэшце раптам да пастаноўкі бралася якая-небудзь п'еса з ніколі не чутай раней, "пазапланавай" назвай. Або наладжваліся рэпетыцыі, але неўзабаве без усялякага тлумачэння перапыняліся і пачыналася праца над новым творам. "Восем закаханых жанчын", "Сон у летнюю ноч", "Рамэо і Джульета", "Цяжкае каханне" — на іх пастаноўку былі загады, вылучаліся грошы і нават былі патрачаныя... І ніводная з гэтых пастановак не пабачыла свет. І мастацкі савет маўчыць. У ім людзі, прызначаныя галоўным рэжысёрам...

Ніводная іншая прафесія, як прафесія творцаў, асабліва, калі яна звязаная са словам, не нясе ў сабе адказнасць за Дух грамадства. І калі за літаратурны твор адказвае аўтар, дык за спектакль — рэжысёр. Андросік пакінуў ТЮГ на ўздыху, на ўзлёце, па-новаму адрадзіўшы ў ім дух тэатра. Пра яго Т. Арлова пісала: "Не толькі рэдкая, але і мала зразумелая сённяшнім тэатральным людзям з'ява: мастацкі кіраўнік тэатра (у дадзеным выпадку ў асобе А. Андросіка) арганізуе поспех другога рэжысёра". Так, гэта пра Андросіка. Гэта пра арганізацыю поспеху пастаноўцы М. Шыйко "Шчаслівыя жабракі". Толькі пасля поспеху калегі А. Андросік выпускае спектакль "Маленькі лорд Фаўнтлярой", затым "Палачанку" і прыступае да "Паліяны", якую пасля смерці рэжысёра дапрацоўвае выканаўца адной з роляў, І. Сідорчык. Усе названыя работы сёння з'яўляюцца асноўным упрыгажэннем афішы ТЮГа. "Маленькі лорд..." і "Паліяна" кардынальна адрозніваюцца ад структуры пастановак ва ўсіх іншых прафесійных тэатрах краіны: галоўныя ролі ў іх выконваюць — дзеці! Пасля дэбюта на сцэне ўсе яны зняліся ў мастацкіх фільмах: "Дунечка", "Маленькія ўцекачы", "Тры талеры". Вось гэта сапраўднае ноў-хаў, якое прынёс у ТЮГ А. Андросік, падараваўшы шчаслівы шанц маленькім акцёрам, а ў будучым, мажліва, — новым зоркам нашага тэатра і кіно. І ці не ў гэтым адна з місій дзяржаўнага тэатра?!.

Пасля смерці пастаноўшчыка даводзіцца прыкладаць намаганні, каб зберагчы яго спектаклі для тэатра. Але гэта высілкі не цяперашняга галоўнага рэжысёра, хаця пасада абавязвае да адказнасці за іх, спектакляў, захаванне ў рэпертуары і пракат. Галоўны выканаўца ў "Маленькім лордзе..." — хлапчук 9—12 гадоў. Дзеці растуць. Першую замену ў ролі паспеў зрабіць сам пастаноўшчык. Цяпер за гэта добраахвотна ўзяліся І. Сідорчык і я. З боку кіраўніцтва ТЮГа — ніякай зацікаўленасці. На свой першы спектакль, у якім аж тры дзеі, маленькія акцёры выйшлі без адзінага прагону. Не знайшлося для гэтага часу ў тэатральным раскладзе. Новых галоўных выканаўцаў у "Палачанцы" (балазе, прафесійных акцёраў — толькі скончылі акадэмію мастацтваў) чакала тое ж: у вялікі масавы спектакль іх даводзілася ўводзіць... у грымёрцы.

У студзені 2006-га я з групай артыстаў, з папярэдняга дазволу галоўнага рэжысёра і дырэктара тэатра, пачаў рэпетыцыі самастойнай работы паводле сваёй п'есы "Прылятаў да акна Бусел". Неверагодна, але нават у дзень спектакля, хаця з Н. Башавай было ўзгоднена за тыдзень, яна раптам прызначыла сваю рэпетыцыю — у той жа час, у тым жа месцы і з некаторымі акцёрамі, занятымі ў маім спектаклі. Тым не меней, сваю работу мы паказалі: поўны двухгадзінны спектакль. Праўда, без касцюмаў, дэкарацый, рэквізіту і ў зусім "умоўна тэатральным" асвятленні. Амаль поўна рэалізавалася толькі праца кампазітара Р. Уласюка і акцёраў. Спектакль быў прыняты мастацкім саветам аднагалосна, з рашэннем даць "зялёную вуліцу" на дапрацоўку і выпуск. Але "пільнымі намаганнямі" Н. Башавай нават у планах новага года ён не замоўлены.

Сёння тэатр не мае ніякай забароны — што і як ставіць. Але не трэба забывацца, што мы — дзяржаўны тэатр. І наш фундатар — дзяржава. Дапамагаць вырашэнню яе набалелых праблем мы проста абавязаныя. Праблема, узнятая на самым высокім узроўні, — бацькі і дзеці. Бацькі, якія глядзяць на дзяцей, як на бяздушную рэч, кідаюць іх... І дзеці, якія праз гэта пакутуюць. Праблема, на жаль, застарэлая. І каму, як не творчаму калектыву пад абрэвіятурай "ТЮГ", самым пільным чынам паставіцца да надзённага дзяржаўнага клопату! А наш самастойны спектакль — на гэтую тэму.

На жаль, ТЮГ катастрафічна страчвае свае набытыя мастацкія вышыні. Моладзь тут не затрымліваецца. Цэлая група сапраўды таленавітых пайшла з тэатра ў 2006 годзе. Такіх акцёраў трэба трымаць, змагацца за іх. Яны — будучыня. Тэатр — гэта адзіная каманда. Але, паводле аналогіі са спортам, пры адсутнасці прафесійнага трэнера развальваюцца самыя высакакласныя каманды.

ТЮГ скочваецца да прымітывізму. Часам спектаклі ідуць са значным парушэннем светлавой мастацкай партытуры. Тэатр пакінулі мастакі-асвятляльнікі. А быў жа лепшы асвятляльны цэх у Беларусі. Барані Божа, і пра тэатр скажуць: быў... Ці можна такое дапусціць?!

Анатоль ЖУК,
заслужаны артыст
Рэспублікі Беларусь, пісьменнік

Установа адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі" аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады (да 5-ці гадоў) прафесарска-выкладчыцкага складу (для тых, хто мае мінскую прапіску) з далейшым заключэннем кантракту ў выпадку выбрання на тэрмін, вызначаны Наймальнікам:

— кафедра спецыяльнага фартэпіяна:
прафесар — 1

Падрыхтоўка... да турмы, або Якуб Колас у 1906—1908 гады

У той перыяд царскі ўрад (пасля забароны 1840г.) пачаў даваць пэўны дазвол на афіцыйнае ўжыванне беларускай мовы, на развіццё самастойнай беларускай культуры і літаратуры. Тым не менш маладыя беларускія паэты прыцягнулі ўвагу не толькі прыхільнікаў іхняга таленту, усіх шчырых і сумленных патрыётаў Бацькаўшчыны, але і царскай ахранкі ды паліцыі — так сказаць, "мастацтвазнаўцаў у пагонах". Напрыклад, за Янкам Купалам віжавалі, збіралі на яго крамольныя факты, а Якуба Коласа, звольніўшы ўлетку 1906-га з працы за ўдзел у з'ездзе беларускіх настаўнікаў у Мікалаеўшчыне, пачалі рыхтаваць да судовага працэсу. Як зазначаў Г. Кісялёў у даследаванні "З жыццяпісу Якуба Коласа", у Вільні ёсць дзве архіўныя справы, дзе адлюстраваныя следствы і суд над К. Міцкевічам (Якубам Коласам) і яго сябрамі ў сувязі з іх удзелам у вышэйназванай сходцы і рэвалюцыйным руху. А менавіта: а) дакументы пракурора Віленскай судовай палаты "О съезде народных учителей в селе Николаевщине Сверженской волости» (61 ліст); б) дакументацыя Віленскай судовай палаты "О кр (естьянах) Константине Михайлове Мицкевиче..., обв(иняемых)..." (далей з указаннем артыкулаў Крымінальнага кодэксу (уложения), усяго 175 лістоў). Сам Якуб Колас пра тыя крамольныя падзеі ў сваім маладым жыцці напісаў найбольш падрабязна ў трылогіі "На ростанях" і ў артыкуле "З поваду майго юбілею". Цікавыя ўспаміны пра тое пакінуў Коласаў зямляк А. Сянкевіч (1884—1939, публіцыст, дзяржаўны дзеяч БССР, прататып Сташынскага ў рамане Фадзеева "Разгром", Садовіча ў трылогіі "На ростанях", Баса-Грэцкага ў Коласавай п'есе "Забастоўшчыкі"; частка яго мемуараў ёсць у даследаванні Г. Кісялёва).

Пазней да вывучэння гэтага пытання звярталіся многія літаратуразнаўцы. Сярод адпаведных прац варта добрым словам успомніць публікацыю Ю. Пшыркова "Судовая справа Якуба Коласа" ў кнізе "Беларуская літаратура і літаратуразнаўства" (выпуск 4. Мн., 1976). Г. Кісялёў у сваім даследаванні прывёў 14 розных дакументаў, прысвечаных настаўніцкаму з'езду, і 36 справам следства і суда, найперш датычных Якуба Коласа. Яго абвінавачвалі па 126 артыкуле тагачаснага Крымінальнага кодэкса, дзе, у прыватнасці, гаварылася: "Виновный в участии в сообществе, заведомо поставившем целью своей деятельности ниспровержение существующего в государстве общественного строя или учинение тяжких преступлений посредством взрывчатых веществ или снарядов, наказывается каторгою на срок не свыше восьми лет или ссылкою на поселение. Если такое сообщество заведомо имело в своём распоряжении средства для взрыва или склад оружия, то виновный в участии в таком сообществе наказывается срочною каторгою".

Прадчуваючы строгае пакаранне, некаторыя ўдзельнікі таго з'езда збеглі з Беларусі. Якуб Колас застаўся, спрабаваў знайсці працу (дома, пры брату Уладзю, што пасля смерці бацькі заняў адну з лесніковых пасад у Радзівілаўскіх лясах, у розных прыватных школах, у "Нашай Ніве" і інш.), але ўлады пераследавалі яго, не давалі магчымасці мець сталы заробак. А з гэтым, зразумела, не было і належнага настрою ажыццяўляць свае літаратурныя задумы, хоць чарніла не засыхала і пяро было ў рабоце (пра гэта крыху пазней).

У невялікай публікацыі цяжка нават пракаметаваць некалькі дзесяткаў (мясцінамі аб'ёмістых) дакументаў, прысвечаных следству і суду над Якубам Коласам. Але знаёмства з імі, а таксама грунтоўныя тлумачэнні Г. Кісялёва дапамагаюць нібы трапіць у жорсткую рэчаіснасць і прасякнутую недаверам атмасферу. Да слова, 20 ліпеня 1906 г. пракурор Мінскага акруговага суда сакрэтна дасылае пракурору Віленскай судовай палаты прадстаўленне, дзе "имеет честь донести" пра настаўніцкі з'езд, пра вынікі першых допытаў удзельнікаў і забраных у іх дакументах, сярод якіх былі і брашуры сацыял-рэвалюцыянераў, "призывающих крестьян к насилиям над помещиками и к забастовкам". Услед, праз месяц вывучэння справы, з Мінска ў Вільню ідзе новае прадстаўленне, у якім гаворыцца, што на аснове паказанняў "в качестве свидетелей полицейского стражника..., полицейского урядника... пристава" затрыманым прадстаўлена абвінавачванне па вышэйцытаваным грозным артыкуле. У лютым 1907 г. таксама сакрэтна з Мінска дасылаецца адпаведны дакумент у Міністэрства юстыцыі, адтуль у сакавіку — сакрэтны ліст пракурору Віленскай судовай палаты. На ім сярод рэзалюцый была і такая: "Предложить прокурору принять меры к скорейшему окончанию и направлению дознания». Гэта значыць, Мінск падспешвалі запускаць судовы махавік. "Улетку, — пісаў Якуб Колас у нататцы ў "Нашай Ніве" за 18 мая 1907 г., — як відаць, будзе суд". Але паколькі абвінавачаныя ўпіраліся (маўляў, падпісалі пратакол з'езда п'янымі, несвядома ці для жарту) працэс следства зацягваўся. А з ім шырылася і патайная перапіска паміж Мінскам, Вільняй і Пецярбургам, больш паглыблена вяліся допыты, пошукі доказаў віны як удзельнікаў з'езда, так і тых, хто за іх заступаўся. Некаторыя настаўнікі збаяліся і пачалі адмаўляцца ад байкоту і займаць месцы звольненых.

Паказальны абвінаваўчы акт, складзены памочнікам пракурора Мінскага акруговага суда, а пасля перароблены намеснікам пракурора Віленскай судовай палаты (18 красавіка 1908 г.). Першы па-зямляцку заўзята патрабаваў пакарання для ўсіх з'ездаўцаў, другі сканцэнтраваў увагу найперш на двух, адным з якіх быў Якуб Колас. У адносінах да яго была ўжыта нават фальсіфікацыя экспертызы — у прыватнасці, наконт напісання адозвы да настаўнікаў. Якуб Колас па меры пераездаў пісьмова паведамляў паліцыі сваё новае месца жыхарства, а таксама даваў распіску, што атрымаў копію акта "по обвинению меня в участии в сообществе, заведомо поставившем целью своей деятельности ниспровержение существующего в России общественного строя"; ёсць копія яго заявы ў Віленскую судовую палату, дзе Якуб Колас кажа, што хацеў бы мець на судзе абаронцам Ф. Рублеўскага (1855 — 1927) — вядомага віленскага адваката і грамадскага дзеяча, які вызначыўся абаронцам тых, каго прыцягвалі да суда па палітычных меркаваннях. Ён даў згоду, але на судзе 15 верасня 1908 г. у Мінску чамусьці не з'явіўся, і Коласавым заступнікам паспешна стаў таксама выдатны адвакат і грамадскі дзеяч К. Петрусевіч (1872 — 1949) — той самы, які паспрыяў у 1898 г. правесці ў яго мінскім доме першы з'езд РСДРП і стаў яе членам, пазней, у Заходняй Беларусі, абараняў ад судовых пераследаў Грамаду, Максіма Танка і інш., а ў 1945 — 1948 гг, быў суддзёй Вярхоўнага суда ПНР. Пра тое, як адбываўся той суд, мы чыталі яшчэ ў школе ў трылогіі "На ростанях". А калі хто жадае азнаёміцца з тым дакументальна, то трэба зазірнуць у даследаванне Г. Кісялёва ў раздзелы: "Пратакол судовага пасяджэння", "Рэзалюцыя", "Прысуд", "Пастанаўленне" (Определение). З іх можна даведацца, што Якуб Колас сваёй віны не прызнаў. Не было графалагічна даказана пісанне ягонай рукой адозвы да настаўнікаў, і суд не палічыў патрэбным, як таго дамагаўся адвакат, правесці дадатковае расследаванне ці ўвогуле апраўдаць падабаронных. Якуба Коласа аб'явілі вінаватым, вынеслі рашэнне «заключить в крепость на три года» і тут жа, у зале суда, узялі пад варту.

Нягледзячы на нестыкоўкі ў доказе віны Якуба Коласа, у прысудзе сцвярджалася, што ён "вступил в преступное сообщество", сваёй рукой пісаў злашчасную адозву, а пасля зламысна "возбуждал" настаўнікаў, чым учыніў «преступное деяние», а ў канцы дадавалася, што "подсудимые приговором довольны, просят копию". Сам Якуб Колас пісаў пра тое з абурэннем і гневам, як і пазнейшыя даследчыкі яго судовай справы. У прыватнасці, літаратуразнаўца С. Александровіч у даследаванні "Старонкі братняй дружбы" (Мн., 1960) пацвердзіў Коласава вызначэнне. "Царскі ўрад, — падкрэсліваў даследчык, — пасадзіў у турму не проста настаўніка Верхменскага вучылішча, а вядомага ўжо тады беларускага паэта Якуба Коласа".

Знаходзячыся ў зняволенні, Якуб Колас працягвае пісаць вершы, шукае самыя розныя каналы, каб перадаць іх на волю (ён нават адпусціў бараду, у якой хаваў невялікія паперчыны з вершамі альбо з рыфмамі для новых вершаў).

Пра побыт зняволеных і норавы ў тагачасным Мінскім астрозе ёсць яшчэ і нататкі нашага земляка А.Бонч-Асмалоўскага (1857 — 1930) — рэвалюцыянера-народніка, дзеяча вядомых суполак "Зямля і воля" і "Чорны перадзел", які з 1879 г. неаднаразова арыштоўваўся, браў удзел у рэвалюцыі 1905 — 1907 гг, а ў 1908 г. адбываў пакаранне разам з Якубам Коласам у Мінскай турме, пазней стаў прататыпам "нарадавольца" ў трылогіі "На ростанях". Яго ўспаміны "Эпоха 1905 г." друкаваліся ў 1925 г. у некалькіх нумарах часопіса "Полымя". У даследаванні Г. Кіселёва змешчаны ўрывак з іх. "Трымалі нас у Мінскай турме, — пісаў ён. — Умовы былі вельмі дрэннымі: па-першае, турма была перапоўненая — удвая больш нормы; усіх сядзела ў турме каля 600 — 700 чалавек; па-другое, яду перадаваць дазвалялі вельмі рэдка, траціць свае грошы таксама не дазвалялі; уся турма галадала; і толькі тады, калі чалавек у 60 з'явіліся азнакі цынгі, начальства апомнілася і крыху палепшыла становішча. Палітычных вязняў як асобую катэгорыю спачатку не прызнавалі, ніякімі палёгкамі мы не карысталіся і знаходзіліся ў агульных камерах з крымінальнікамі".

«УСТАНЬЦЕ, ХЛОПЦЫ, УСТАНЬЦЕ, БРАТКІ!»

Не пытайце, не прасеце
Светлых песень у мяне.

Якуб Колас

Вышэй было без перабольшання сказана, што царскі суд учыніў расправу менавіта над Коласам-паэтам. Да суда ён перажываў розныя непрыемныя калізіі, але ў гэтых умовах было напісана нямала твораў. Больш як 50 з іх пабачыла свет на старонках "Нашай Нівы", што зрабіла яго імя вядомым (так што пракурор меў на руках і публікацыі ягоных вершаў); іншыя творы, знойдзеныя пазней, будуць, як і Купалавы, надрукаваныя ў 1920 — 1930 гг.

Перажываючы за звольненых з настаўніцкай працы калег, Якуб Колас неаднаразова звяртаецца да іх:

Ой сябры мае вы, мілы,
Дзе цяпер вы, дарагія?
Ці схавалі свае сілы?
Ці ёсць думкі маладыя?

Не, няпраўда! Быць не можа,
Каб не грэла цёпла сонца.
Наша праўда нам паможа —
Блісне нам святло ў аконца!

Гэтыя радкі з верша "Сябрам", а яшчэ былі натхняльныя вершы "Кіньце смутак", "Не бядуй", "Згнанніку", "Сябрам-выгнанникам", "Наша возьме" і інш., дзе паэт, як не цяжка было самому, маральна падтрымліваў сяброў па няшчасці, а таксама і іншых настаўнікаў, каб яны не гублялі чалавечую годнасць. Як вядома, у 1907 г. рэвалюцыйная сітуацыя ў Расійскай імперыі пачала ісці на спад, царызм здолеў нейтралізаваць яе, а многіх вядомых палітычных і грамадскіх дзеячаў, як і раней, кінуў "перавучвацца" ў Сібір (на катарзе, напрыклад, апынуліся Коласаў дзядзька Язэп Лёсік і беларускі паэт Алесь Гарун). У час, калі, можа, трэба было і паасцерагчыся, Якуб Колас не мог змірыцца з усеўладнасцю паліцэйшчыны і ў вершы "Вобразы самаўладдзя" гнеўна асуджае яе:

Куды ні глянь — адно і тое:
Усюды стрэльбы і "шнуры" —
Стаяць па пары і па трое
На скрыжаваннях "каўняры".

Гэты твор быў надрукаваны ў "Нашай Ніве" 24 лютага 1907 г. Выконваючы абавязкі інспектара па справах друку даносіў пракурору Віленскай судовай палаты: "... Верш накшталт змешчанага на стар. 3 пад загалоўкам "Расейскіе образы" здольны... моцна ўзрушыць простага малаінтэлігентнага чытача беларускай газеты і ўнушыць яму непавагу да суда, паліцыі, земскага начальніка, памешчыка, войска і законаў дзяржавы і зрабіць яго лёгкай ахвяраю злачыннай прапаганды". Зразумела, маючы на руках гэты данос, паслужлівы пракурор не мог не пацірацъ рукі ад задавальнення, што атрымаў спрыяльную магчымасць пацвердзіць сваю адданасць імперыі. А Якуб Колас не адступіў ад свайго, ён нанёс новы ўдар паэтычным словам па чэрствых землеўладальніках і царскіх чыноўніках, хабарніках і прыстасаванцах у вершы "Ворагам" (ён, зразумела, пабачыў свет толькі ў 1920-я).

Згаданыя радкі, як і іншыя з названага верша, даюць падставу меркаваць, што паэт не проста абвінавачваў асобны атлусцелы, глухі да народных пакут люд, але вынес і суровы прысуд усяму царскаму рэжыму, прадбачачы, што яго чакае нялёгкі лёс. Ідэалагічны націск, фізічнае насілле пэўны час даюць магчымасць утрымацца ва ўладзе, але не надоўга. Тым больш, што паэт разгадаў царскія манеўры з тагачаснай Дзяржаўнай Думай, якая нібыта была прызначаная ажыццяўляць народныя запатрабаванні, але якая магла быць распушчаная ў любы час з-за празмерна смелых выступленняў некаторых дэпутатаў. У паўфельетонным вершы "Мікалаю II" (напісаны ў пакутлівым 1907 г., апублікаваны ў 1928 г.) Якуб Колас на поўную моц выкарыстаў сатыру, якой валодаў выдатна:

Дзесяць год Мікола думаў
І прыдумаў ён Думу.
Пасадзілі разам з панам
Янку, Грыца і Кузьму.

Пасядзелі тыдняў восем,
Узлаваўся Мікалай —
Дэпутатам даў па карку,
Ўзяў ды Думу разагнаў.

Да чаго ж мы дажыліся!
Эх, падвёў ты нас, царок!
Каб табе даў бог
на старасць
Лапці, торбу і кіёк.

Да зняволення Якуб Колас паспеў напісаць некалькі апавяданняў, шэраг публіцыстычных нататак з разнастайнага жыцця роднай вёскі Мікалаеўшчыны і мястэчка Бяларучы, якія змясціў у "Нашай Ніве". Праўда, іх друкаваў пад псеўданімамі (Дзядзька Карусь, Стары шут, Мікалаевец, Свой чалавек, Адзінокі і інш.). Сярод гэтых, у некаторай ступені этнаграфічных матэрыялаў рэзка вылучаецца публікацыя "Беларуская мова ў казёнай школе".

"— Чаму вы, беларусы, так скора адракаецеся ад свайго народа?" — пытаў у мяне калісь-та мой стары вучыцель. Я не ведаў, што сказаць на гэта. Толькі я стаў думаць, — і праўда, мы цураемся свайго роднага народа, — скрушліва пісаў Дзядзька Карусь. — ... Цяпер, як беларусам далі права гаварыць і пісаць на сваёй мове і як паявілася першае беларускае пісанае слова, багата знайшлося працаўнікаў беларускай мовы... Не, галубочкі! Не беларуская мова рэжа вам вушы, скрабе душу, а рэжа вам вушы і скрабуць вашу душу тыя далёкія ўспамінанні смеху над вамі... Як беларуса ні гналі, як яго ні душылі, як ні тапталі яго ў балота, усё ж такі ён захаваў сваю мову. І вы адбіраеце права ў беларуса чытаць кніжкі і газеты на роднай мове; і гэтае права адбіраюць тыя, хто быццам стаіць за свабоду народа!"

Знаходзячыся ў зняволенні, Якуб Колас працягвае пісаць вершы, шукае самыя розныя каналы, каб перадаць іх на волю (ён нават адпусціў бараду, у якой хаваў невялікія паперчыны з вершамі альбо з рыфмамі для новых вершаў).

1909 г. У Пецярбургу суполкі "Загляне сонца і ў наша ваконца", "Наша хата" выдаюць "Другое чытанне для дзяцей беларусаў" Якуба Коласа.

1910 г. Пабачыў свет яго зборнік вершаў "Песні жальбы" (Вільня).

7 лістапада Максім Горкі, азнаёміўшыся з першымі кнігамі Янкі Купалы і Якуба Коласа (мабыць, праз бацьку М. Багдановіча), у лісце да М. Кацюбінскага (1864 — 1913, украінскі пісьменнік) дае высокую адзнаку беларускім паэтам. Максім Горкі яшчэ неаднаразова будзе звяртацца да іхняй творчасці і ўхваляць яе.

1911 г. Творчасць Якуба Коласа станоўча ацэньваецца ў часопісе "Вестник Европы», дзе лічылі за гонар надрукавацца многія вядомыя рускія пісьменнікі.

Сакавік — май. Згодна даследаванням некаторых літаратуразнаўцаў, менавіта ў гэты час Якуб Колас задумвае напісанне паэмы "Новая зямля", а да 11 верасня мае ўжо некалькі напісаных раздзелаў з яе.

11 альбо 15 верасня пакідае астрог. У перыяд з 11 па 19 верасня наведвае Вільню.

У першай палове 1912 г. жыве ў Лунінцы ў сябра В. Філіповіча. Там навучае дзяцей чыгуначнікаў, задумвае паэму "Сымон-музыка", працягвае працу над раманам у вершах "Новая зямля".

Генрых ДАЛІДОВІЧ

Ад рэальнасці да мастацтва

Публікацыя ў "ЛіМе" (№11 ад 16 сакавіка 2007 г.) ліста пісьменніка Валерыя Гапеева падалася мне неардынарнай з'яваю. Ліст быццам бы прыватны (адрасаваны Анатолю Зэкаву), але фактычна гэта споведзь-разважанне, зварот да ўсёй пісьменніцкай браціі. Аўтар ліста наўмысна ці мімаходзь узнімае шэраг праблем, паказвае сваё бачанне літаратурнага працэсу.

Літаратар з Івацэвічаў выбраў досыць арыгінальныя форму і змест для такой гаворкі, і цяжка вызначыць, ці гэта прадуманы ход альбо блытаны струмень думак. Калі ўзяць за аснову апошняе, атрымліваецца, што творца ў сваіх выкладках пярэчыць самому сабе і, прыводзячы сцвярджальныя факты, тут жа іх абвяргае. Калі ж ліст быў напісаны з мэтай зрабіць сабе рэкламу, модны сёння піяр, то ён таго дасягнуў. Як бы ні было, разважанні Гапеева слушныя, акцэнтныя і патрабуюць усебаковага аналізу.

Хочацца аддаць належнае ЛеГАЛу, які надрукаваў ліст, пусціў яго ў шырокі чытацкі свет, а мог і не рабіць гэтага, хоць бы з той прычыны, што В. Гапееў с правінцыйнай "далікатнасцю" дзеўбануў ЛеГАЛа: "І "ЛіМ" выданне не заўважыў. Вось быў бы ў мяне ў сябруках Леанід Галубовіч — глядзіш — поўная "легалізацыя" б прайшла". Канечне, прайшла б і без сяброўства з ЛЕГАлам. Аўтар ліста, мабыць, нерэгулярна чытае публікацыі Л. Галубовіча, які досыць аб'ектыўны, справядлівы, і, незалежна ад таго, у якіх ён адносінах з аўтарам, надае перавагу менавіта пісьменнікам з глыбінкі. Дарэчы, сёння паняцце правінцыя, бадай, неактуальнае. У кожнай вобласці — па дзве пісьменніцкія арганізацыі, дзе хапае вядомых спрактыкаваных літаратараў, а тым больш — на Брэстчыне. Яны здольныя заўважыць удалую кніжку. Чамусьці В. Гапееў не асвятліў дзейнасці сталых літаратараў на карысць малавядомых талентаў Брэстчыны. Мо палічыў, што гэта не той маштаб? Мая заўвага не папрок, а так, да слова сказанае. В. Гапееў сам вінаваты, што ягоная кніжка засталася непрыкмечанай. Спадручней было б адрасаваць крыўду выдавецтву, бо яно, выпусціўшы кніжку, абавязана "легалізаваць" яе. Аднак, у дадзеным выпадку, выдавецтва мае абгрунтаванае алібі, бо ў тэматычных планах на кожную кніжку даецца анатацыя, якую, як і водгук, часцей за ўсё піша сам аўтар. Па ёй заказчык глядзіць, чаго вартае гэта выданне. Бедаванне аўтара ліста, кшталту: "А так выйшла — як быццам не выходзіла" — беспадстаўнае. Кніжка выдадзена "Юнацтвам", дзе да Гапеевага рукапісу і без "сяброўства" ці "чаркі" аднесліся сумленна. Нават нябожчык Міхась Зарэмба гарой стаяў, каб яна ўбачыла свет. Але здараецца, што і варты друку твор у выдавецтве могуць "зарэзаць". В. Гапееву пашэнціла, што чытаць і правіць ягоны рукапіс узялася высокай сумленнасці рэдактар Наталля Фядотава. Такіх прафесіяналаў у рэдакцыях няшмат.

Магчыма, што цяпер, пасля апублікавання ў "ЛіМе" ліста, аўтар "Пасткі на рыцара" пра ЛеГАЛа думае зусім інакш. Дзякуючы яму, цяпер многія хопяцца чытаць, а мо і перачытваць гэтую кніжку. Вось як проста вырашаецца праблема з вядомасцю. На жаль, я не чытаў яе — даўно не цікаўлюся, што выдаецца для дзяцей, хаця чуў, што кніжкі выходзяць. Падаецца, што ў лісце В. Гапееў неяк няўцямна гаворыць пра вартасць свайго кніжнага дзіцяці: Ён не сцвярджае, што кніга мае мастацкую вартасць, але піша, что яна "не такая, як усе іншыя". Безумоўна, не такая — а інакш навошта яе выдаваць? А вось у чым яна не такая, не кажа. А цікава было б прачытаць ягоныя аргументы наконт гэтага. Пра тое, што кніжка ўдалая, здагадваешся: ёю цікавяцца ў розных раёнах Беларусі і нават у сталіцы. Калі так, дык навошта было "сырбор усчынаць". Слава да аўтара прыходзіць "знізу", ад чытачоў, а не "зверху" ад эліты, дзе сяброўства, чарка, і шкварка. Аўтару першай удалай кніжкі ўжо не трэба таптацца на месцы з рукапісам новай, разважаючы, куды ісці.

Відавочна, прапанова знайсці ўплывовыя сувязі і аддаць рукапіс у Мінск, якую зрабіў

калісьці В. Гапееву Мікола Купрэеў, застаецца слушнай і сёння. У гэтым напрыканцы жыцця, магчыма, упэўніўся і сам апальны паэт М. Купрэеў, калі быў кандыдатам на Дзяржаўную прэмію. Яго падтрымлівала нямала ўплывовых літаратараў, аднак і гэта не спрацавала. Лічу, што аўтар ліста таксама дарэмна што называецца, "прыціснуў да сцяны" вядомага паэта, глыбока думаючага крытыка А. Зэкава за ягоную крытычную публікацыю ў "ЛіМе" пра сучасны стан дзіцячай літаратуры, а фактычна за тое, што ён ні словам не абмовіўся пра "Пастку на рыцара". На маю думку, цяпер няма для крытыкаў абавязалаўкі: гаворачы пра дзіцячыя кніжкі, называць усе, якія выйшлі ў свет. Такое было ў савецкія часы, калі ў пэўных артыкулах абавязкова згадваліся кніжкі, якія мелі розгалас. Цяпер крытык вольны ад такіх стэрэатыпаў. Ён даследуе праблемы, называе творы, як лічыць патрэбным.

Боль В. Гапеева зразумелы: вось выйшла кніжка, а пра яе нідзе ні гу-гу. І абвінавачвае ён у гэтым пануючае ў сталічных літаратурных колах сяброўства праз чарку, сумесную вучобу, работу, карацей, досыць шчыльнае дружбацтва.

Пэўна, у нейкай меры ўсё гэткае яшчэ жыве, але рашаючага значэння не мае. Патрэбны таленавіты твор — тады блат будзе нешта вызначаць. Інакш "стрэлу" не атрымаецца. Вядома, знаходзіць сваю нішу і "шэрая" літаратура: а як жа — яна фон, на якім залацінкі свецяцца...

Але ж правінцыя мае і шмат плюсаў для творцы. Тут больш непасрэднае асяроддзе, у ім больш сапраўднасці, менш штучнасці, бездухоўнасці. Ці ж гэта мала для пісьменніка? Усе знакамітыя творцы Беларусі "выйшлі з хат". Там для літаратара — шматтэм'е для захапляльнага зместу, каларытныя прататыпы будучых герояў. Больш верагодна, што менавіта адтуль прыйдзе рукапіс выдатнай кніжкі. Гарадскі ж пісьменнік знаходзіцца ў палоне моднага, наноснага, не заўсёды жыццёвага. Яму значна цяжэй намацаць жыццядайны сюжэт.

Але В. Гапееў мае выключную рацыю, калі згадвае, што для папулярызацыі літаратуры, новых кніжак патрэбна дзяржаўная праграма. Яна, пэўна, ёсць, аднак не дзейнічае, бо ставяцца да яе пакуль фармальна. Задамося пытаннем: якую ролю павінна адыгрываць бібліятэка ў прапагандзе новай беларускай літаратуры? Мне здаецца — найважнейшую. Вывучэнне чытацкага попыту менавіта праз бібліятэкі і павінна быць падставай для фарміравання выдавецкіх планаў.

Зразумела, што для ажыццяўлення гэтага патрэбны грошы. Калі будзе наладжана не тэарэтычная, а рэальная сістэма, з цягам часу кніга сама сябе апраўдае. Сёння пісьменніцкія суполкі ладзяць сустрэчы з вучнямі, студэнтамі ды іншымі аўдыторыямі. Аднак, на маю думку, такія сустрэчы маюць больш рытуальны, чым рабочы характар. Пісьменнікі прыйшлі, чытаюць свае творы, усё святочна, урачыста. А трэба ж не толькі чытаць, а разважаць са слухачамі пра твор. Здараецца нярэдка і так: пісьменнік ці паэт прачытае твор, а дасціпна расказаць, што падштурхнула напісаць яго, не можа. У выніку — слухачы самога аўтара як творчую асобу не бачаць і не разумеюць. Адным словам, сустрэча — для справаздачы.

З ліста В. Гапеева я вылучыў яшчэ адну важную для сённяшняга пісьменніцтва рэч: на ягоную думку, кожны, хто выдаў кніжку (сталую, цікавую), павінен мець вядомасць і гэтаму абавязана спрыяць крытыка.

Фармальна, так. Але як жа тады з тэзай, што імя творцу робіць найперш сама ягоная кніжка? Адкуль такая нясціпласць літаратараў — раней гэткага не заўважалася. А сёння ўсе ірвуцца хутчэй "на Парнас". Ці не з-за гэтага творцы падзяліліся на групоўкі? Мне здаецца, што пісьменнік не павінен быць празмерна заклапочаны сваёй вядомасцю ці невядомасцю. Напісанне кнігі — гэта ўжо найвялікшая ўзнагарода для яго, бо ён асэнсаваў пэўны пласт жыцця, зжыўся са сваімі героямі, пусціў іх у свет для таго, каб чытач уразіўся і ўбачыў там, чаго раней не заўважаў. Ад такога адкрыцця жыць лягчэй. Прызнаемся, што нам утульна, спакойна, калі мы ведаем пра чыю-небудзь пэўную жыццёвую практыку — тады ёсць упэўненасць у заўтрашнім дні. Ці не ў тым і палягае асноўная (жыццёвая) роля літаратуры? А разуменне гэтага — і ёсць разуменне свайго прызвання. Чалавек-пісьменнік забыўся пра сваё прадвызначэнне. Што тады ад яго можа чакаць літаратура і грамадства? Пытанне адкрытае...

Той, хто піша твор і загадзя цешыць сябе надзеяй, што напісанае ўзнясе яго да лаўраў, наўрад ці такі шэдэўр створыць. Ці ж думаў Васіль Быкаў, што ягоныя творы прынясуць яму такі гонар і несмяротную славу? Вядома, што не. Але ён пісаў іх, бо душа прагла пазнання ісціны, якую магчыма было выявіць толькі праз мастацкую праўду жыцця.

Мікола ДУБОЎСКІ

Толькі ў «ЛіМе»

"Навела пра паморак у Полацкай зямлі" — умоўная назва рарытэтнага помніка беларускай мастацкай літаратуры XI ст. Твор быў напісаны ў Полацку невядомым аўтарам, які, верагодна, перажыў трагедыю горада, на ўласныя вочы бачыў усе жахлівыя наступствы бедства.

Пачатак беларускай містычнай прозы

Першакрыніца летапіснай "Навелы пра паморак у Полацкай зямлі" не захавалася. Яна чытаецца паводле "Аповесці мінулых гадоў" — найбольш старажытнага ўсходнеславянскага летапіснага зводу XII ст., што ўвайшоў у склад шэрагу летапісаў XIV — XV стст., у прыватнасці, у Радзівілаўскі і Лаўрэнцеўскі.

У цэнтры адлюстравання "Навелы пра паморак у Полацкай зямлі" — бедства, якое спасцігла Полацкае княства ў 1092 г. і ў выніку якога памерла мноства людзей. Пісьменнік паведамляе, што насланнё на Полацкую зямлю пачалося з Друцку. Аўтар вобразна апісвае сполах і адчай, якія выклікала сярод гараджан невядомая заразная хвароба.

Узрушанне летапісца выявілася ў стварэнні каларытнай містычнай сцэны авалодання Полацкам і яго ваколіцамі наўем (нячыстай сілай) — інфернальнымі істотамі, што былі надзеленыя звышнатуральнымі ўласцівасцямі.

На вуліцах горада ўначы з'яўляліся д'яблы, паўсюль стаяў неверагодны тупат, штосьці пранізліва стагнала і енчыла. Нарэшце д'яблы пачалі з'яўляцца і ўдзень. Яны гойсалі верхам на конях, але ні іх саміх, ні коняў не было відаць, былі выразна бачныя толькі конскія капыты. Д'яблы нялітасціва нішчылі людзей. У горадзе пайшла пагалоска, што гэта мерцвякі прыйшлі па жывых.

Д'ябальскае нашэсце на Полацк і вынішчэнне жыхароў — кульмінацыйны момант усёй навелы, адна з найбольш яркіх сцэнаў страдаўняй беларускай мастацкай прозы.

Містыцызм "Навелы..." ўзмацняўся іншымі сюжэтамі пра надзвычайныя здарэнні — з'яўленне пасярод неба велізарнага вогненнага кола, неверагодную засуху і выгаранне зямлі, самаўспаленні лясоў і балот.

"Навела..." мае выразную стылёвую афарбоўку. Скупыя радкі летапіснага твора перапоўненыя пачуццямі, эмоцыямі і перажываннямі аўтара з-за пакутаў людзей.

У Радзівілаўскім летапісе "Навела пра паморак у Полацкай зямлі" адмыслова праілюстравана каларытнымі мастацкімі малюнкамі, якія ўзмацнялі агульную містычную скіраванасць твора.

Узнаўленне і пераклад летапіснай "Навелы пра паморак у Полацкай зямлі" ажыццёўлены паводле Радзівілаўскага летапісу, яго найноўшага факсімільнага выдання і тэксталагічнай апрацоўкі. Гл.: Радзивиловская летопись: текст, исследование, описание миниатюр. СПб.— М., 1994. С. 144.

Іван САВЕРЧАНКА,
доктар філалагічных навук

Навела пра паморак у Полацкай зямлі

У 1092 год незвычайныя дзівосы здарыліся ў Полацку.

Уначы на вуліцах стаяў страшэнны тупат, адусюль даносіліся пранізлівыя стогны і жаласлівыя енкі.

Калі хтосьці з жыхароў выходзіў з дому, каб дазнацца, што дзеецца, яго імгненна спасцігалі д'яблы і нябачным чынам смяротна ранілі. У выніку чалавек хутка паміраў. Таму ўсе людзі неверагодна баяліся пакідаць жытло.

Праз нейкі час д'яблы пачалі з'яўляцца і ў дзённы час. Яны насіліся верхам на конях. Але ні іх саміх, ні коняў не было відаць. Адно толькі конскія капыты выразна праглядаліся на бруку.

Д'яблы шалёна нішчылі безліч людзей у Полацку і яго ваколіцах. Сярод палачанаў пайшла пагалоска, што гэта мерцвякі забіваюць людзей.

Пачалося нечуванае насланнё з Друцку.

Тым часам і ў нябёсах назіраліся неверагодныя цуды. Пасярод неба з'явілася агромністае вогненнае кола.

У той жа год надарылася нябачная засуха, зямля павыгарала, шмат дзе ўспыхвалі і доўга гарэлі лясы і балоты.

Мноства розных дзівосаў адбылося тады паўсюль у гарадах і мястэчках.

Пераклаў
Іван САВЕРЧАНКА

Графіці — адносна новы кірунак мастацтва, хаця шмат хто з класічных майстроў наогул не згаджаюцца з гэтым азначэннем. Можа, проста састарэлыя погляды на класічную творчасць не спрыяюць успрыманню чагосьці новага. Дык што ж гэта такое на самай справе? Хто і чаму распісвае сцены (і не толькі) там, дзе дазволена і дзе забаронена? Каб знайсці адказы на пытанні, паспрабавала адшукаць хаця б аднаго вулічнага мастака. Высветлілася, што гэта не так проста зрабіць, але, як кажуць, хто шукае, той заўсёды знойдзе.

Палёт натхнення ў стылі графіці

Расказаць пра ўлюбёную справу ўсяго свайго жыцця згадзіўся вядомы ў колах аматараў графіці мастак Дзяніс Авяр'янаў. Хоць бачылася з ім упершыню, але адразу пазнала ў мітуслівым людскім натоўпе. Прадстаўнікі хіп-хоп культуры заўсёды адметныя — як знешнім выглядам, так і поглядамі на жыццё.

Чалавек, апантаны графіці, з задавальненнем распавёў усё да драбніц. Дзяніс мае самае непасрэднае дачыненне да мастацтва, бо скончыў Мінскае мастацкае вучылішча і цяпер працуе дызайнерам. Чаму абраў замест мальберта і палатна сцяну і балончык фарбы? Мабыць, таму, што загадкавая душа гэтага творчага чалавека прагне выкшталцонага ўвасаблення вобразаў. Захапленне прыносіць сапраўднае задавальненне і непараўнальную асалоду. Калісьці работы знакамітых майстроў графіці падштурхнулі Дзяніса паспрабаваць на гэтай ніве ўласныя сілы. Спадабаліся цікавая тэхніка выканання, падыход, вынік працы. Кожны мастак стварае арыгінальны дызайн і ўлічвае свае погляды на графіці. Цяпер Дзяніс выкарыстоўвае элементы гэтай тэхнікі ў невялікіх работах: на запрашэннях, вокладках для кампакт-дыскаў, плакатах ды інш. Бываюць і вялікія заказы: часам хтосьці просіць распісаць сцяну ў памяшканні ці нават ва ўласнай кватэры.

Калі ж звярнуцца да гісторыі ўзнікнення графіці, то можна сказаць, што ўсё пачалося ў Амерыцы ў сямідзесятыя гады мінулага стагоддзя. Маладыя людзі ў Нью-Йорку пісалі свае імёны на сценах ці цягніках, быццам пазначаючы подпісамі вуліцы і кварталы. Складаліся пэўныя групоўкі, якія мелі ўласныя назвы і абазначэнні. Пазней гэтыя малюнкі набылі адметны стыль, які пастаянна ўдасканальваўся. Кожны імкнуўся зрабіць надпіс больш

цікавым і незвычайным, таму ўвесь час працавалі над тэхнікай. Падтрымліваўся дух спаборніцтва: хто выканае малюнак лепш за астатніх? Жаданне быць лепшым нараджае сапраўдныя таленты.

Вулічныя мастакі фотаздымкі сваіх работ змяшчаюць у Інтэрнеце. На сайтах, прысвечаных графіці (а іх вельмі шмат), можна пазнаёміцца з творамі шматлікіх замежных майстроў. Вулічныя мастакі пастаянна падтрымліваюць сувязь, разам ствараюць новыя работы і абавязкова бяруць удзел у фестывалях: два папярэднія міжнародныя праходзілі ў Гомелі, а сёлета прыхільнікі графіці з Расіі, Германіі, Польшчы, Літвы і іншых краін сабраліся ў Санкт-Пецярбургу.

Нехта з графіці-мастакоў аддае перавагу спакойнай працы на аддаленай ад горада сцяне, хтосьці размяшчае свае работы выключна на вагонах электрацягнікоў ці ў іншых забароненых месцах, шукаючы ў дадатак да асалоды ад зробленага яшчэ і добрую порцыю адрэналіну. У нашай сталіцы такія здарэнні пабачыш вельмі рэдка, а вось за мяжой гэта — сапраўднае бедства. Цэнтральныя праспекты і вуліцы гарадоў размаляваныя вулічнымі мастакамі-нелегаламі. У паліцыі нават існуюць спецыяльныя аддзелы па барацьбе з імі. У Польшчы, Францыі, Германіі, Галандыі насценныя малюнкі сталі вялікай дзяржаўнай праблемай. Амаль не было чыстых цягнікоў і вуліц, надпісы апанавалі ўсё навокал. Да мастакоў прымяняліся нежартоўныя штрафныя санкцыі, некалькі чалавек нават трапілі на некаторы час у турму. Як вынік — рух графіці яшчэ больш узмацніўся, маляваць пачалі з асаблівым імпэтам.

Мабыць, беларускія творцы ў большасці сваёй маюць спакойны характар. Пачаткоўцы нейкі час напрацоўваюць вопыт, бывае, па начах і не там, дзе трэба, але з часам усё стабілізуецца. Малюнкі адметных майстроў цяпер выконваюцца ў спецыяльных месцах, звычайна аддаленых ад цэнтра горада. Сапраўдных мастакоў, якія пастаянна і сур'ёзна займаюцца графіці, у Мінску мала — чалавек пятнаццаць. Ва ўсёй краіне налічыцца не больш, як дзесяць каманд. Адна з вядомых — "True Stilo", што азначае "сапраўдны стыль". Кожны адметны мастак графіці працуе ў сваім кірунку, яго почырк лёгка пазнаецца сярод іншых.

Графіці — расплывістае паняцце. Малюнак часцей за ўсё змяшчае літары імя альбо псеўданіма мастака, ці нешта фантазійнае. Літары стылізуюцца пад пэўныя формы і вобразы, дадаецца колер і фон — атрымліваецца графіці-работа. Калі для выпадковага гледача малюнак часта бывае незразумелы, то той, хто мае дачыненне да гэтага віду мастацтва, з лёгкасцю разбярэцца ў любой рабоце.

Для адных графіці — мастацтва, для другіх — магчымасць пакінуць сваю адзнаку на фасадзе будынка альбо вагоне цягніка. Таму адны гледачы ўспрымаюць графіці як высокае мастацтва, другія як агіднае. І самі стваральнікі называюць свой занятак паўхуліганскім, бо пры гэтым нічога не б'юць, не нішчаць. Каля сцен, на якіх малююць, няма шыльдачак, што там забаронена рабіць падобныя шэдэўры, але і дазвольныя надпісы таксама адсутнічаюць. Прынамсі, у сталіцы няма легалізаванай сцяны, як, напрыклад, у Гомелі. У Мінску гэтае пытанне ўзнімалася, але пакуль што засталося без адказу. Магчыма, наяўнасць легальных, спецыяльна адведзеных месцаў паменшыла б колькасць "падпольных" малюнкаў.

Вулічныя мастакі, улюбёныя ў сваю справу, лічаць графіці стылем свайго жыцця. Трэба адзначыць, што такое захапленне абыходзіцца не зусім танна. Адзін балончык фарбы каштуе 10 — 15 тысяч рублёў, а на стварэнне малюнка сярэдніх памераў іх патрабуецца 7-8 штук. У сезон, з вясны да восені, мастакі графіці даволі часта выязджаюць памаляваць, часам сустрэчы адбываюцца і некалькі разоў на тыдзень. Хтосьці падумае, што графіці — хобі для забяспечаных маладых людзей. Як высветлілася, гэта не так. За магчымасць купіць фарбы і напісаць свой шэдэўр апантаныя мастакі часта адмаўляюць сабе ў набыцці нейкіх рэчаў альбо працуюць для таго, каб толькі займацца любімай справай.

Зразумела, што ні ў якім разе нельга маляваць там, дзе захочацца. Для стварэння сваіх шэдэўраў неабходна выбіраць толькі дазволеныя месцы. Трэба ведаць, што размалёўваць сцены гарадскіх будынкаў — занятак, які падпадае пад дзейнасць артыкула 143 Адміністратыўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь і прадугледжвае пакаранне ў выглядзе штрафу, грамадскіх работ, умоўнага асуджэння.

Калі ўстанова, чыю ўласнасць размалявалі графіці, прад'явіць вінаватаму іск, то ў судовым парадку ён абавязаны пакрыць матэрыяльныя страты.

Усе месцы для графіці-работ вынесены на ўскраіны горада і за яго межы. Даволі шмат цікавых малюнкаў размешчана каля будаўнічага рынку ва Уруччы, уздоўж чыгункі ў мікрараёне Вяснянка, каля ЦЭЦ-4 у Малінаўцы. Каб прасякнуцца духам графіці і зразумець гэты від мастацтва, трэба ўбачыць вартыя работы і абавязкова паназіраць за самім працэсам стварэння малюнкаў. Нават тыя, хто не заўважаў іх раней, пазнаёміўшыся з незвычайнымі творамі больш уважліва, мяняюць свае погляды. Можа цяпер графіці-малюнкі паўстануць перад кімсьці ў іншым святле і захапленне вулічных мастакоў стане больш зразумелым і прывабным?

Прыгажосць і яе ахвяры

Упрыгожванне цела з дапамогай татуіровак — тату — усё больш набывае папулярнасць. Мода дыктуе сваё! Але калі рэчы ў гардэробе можна з лёгкасцю памяняць на навамодныя, то наконт тату ёсць праблемы. Апошнім часам у тату-салонах павялічылася колькасць кліентаў. Многія прыходзяць, каб зрабіць на сваім целе ўпрыгожванне, але яшчэ большая колькасць наведвальнікаў — каб ад тых малюнкаў пазбавіцца. Прычыны бываюць самыя розныя.

Таму калі вы ўсё ж захацелі нанесці на сваё цела тату, то не спяшайцеся адразу ж бегчы ў салон. Да такога кроку трэба аднесціся адказна і ўзважыць ўсе "за" і "супраць".

Па-першае, перад тым як вытатуіраваць на сваёй скуры якісьці сімвал ці знак, трэба даведацца, што ён азначае. Апошнім часам зрабіліся папулярнымі разнастайныя ўсходнія малюнкі. Спадабаўся нейкі арнамент, вось яго і наносяць, не разбіраючы, аб чым ён гаворыць. Неабходна памятаць, што вы можаце трапіць у далікатную сітуацыю, вандруючы па краінах, дзе гэты сімвал добра ведаюць.

Па-другое, трэба падумаць пра дзень заўтрашні. Прыгадваю, як мая сяброўка вырашыла зрабіць арыгінальны падарунак свайму бой-фрэнду. Яна не прыдумала нічога лепшага, як вытатуіраваць імя свайго каханага. І не было б нічога тут выключнага, але... Праз некаторы час яны разышліся, а тату засталося. Выдаліць надпіс сяброўка не гатова, таму займаецца пошукам новага сябра. Адна ўмова: неабходна, каб яго звалі Серж. Адпаведны надпіс ужо маецца.

Па-трэцяе, тату можа мець свае наступствы. Падумайце, ці не збіраецеся вы заняць адказныя пасады. Можа, ваша мара — кар'ера дыпламата ці служба ў органах унутраных спраў? Татуіроўка часам становіцца перашкодай на шляху па службовай лесвіцы. Малюнак, магчыма, проста не спадабацца вашаму кіраўніцтву. Вось тады вы задумаецеся...

Сапраўдная татуіроўка робіцца надоўга, таму рашэнне павінна быць добра асэнсаванае... Так звычайна думаеш, пакуль не прыйдзеш у салон. А там табе ў рукі трапляюць шматлікія альбомы з выявамі самых разнастайных тату. І што? Ды проста вочы разбягаюцца і імгненна з'яўляецца непераадольнае жаданне вытатуіраваць на сваім целе вось гэту, і гэту, а яшчэ і тую, і абавязкова тры-чатыры з гэтай старонкі... Хочацца так шмат, што проста месца на целе не хапае! Як тут быць? У такім выпадку майстры прапануюць зрабіць часовае тату. Што ж, найлепшае выйсце! Вы зможаце прыгледзецца да шэдэўра, вызначыць рэакцыю вашых родных і сяброў ды яшчэ раз падумаць. Калі спадабалася — малюнак можна зрабіць "пасапраўднаму".

Сярод маіх знаёмых шмат такіх, хто хацеў бы паспрабаваць зрабіць модную татуіроўку, але не назаўсёды. Тут маецца некалькі варыянтаў.

Варыянт першы. Можна купіць звычайныя наклейкі, якія лёгка змываюцца пасля першага ж душа. На працягу цэлага дня вы паспееце адчуць усе станоўчыя і адмоўныя бакі жыцця чалавека з татуіроўкай.

Варыянт другі. Для тых, каму аднаго дня недастаткова, могуць зрабіць татуіроўку хной. Яна пратрымаецца на целе ад тыдня да месяца, а канчаткова выдаляецца з дапамогай вяхоткі і мыла.

Варыянт трэці. Крыштальны татуаж. Гэта сучасная тэхналогія ўпрыгожвання цела з дапамогай маленькіх крышталікаў, якія наносяць на скуру. Замест крышталікаў могуць быць выкарыстаныя нават дыяменты і іншыя каштоўныя каменьчыкі.

Варыянт чацвёрты. Ультрафіялетавая татуіроўка, якая не бачна пры дзённым асвятленні, але як толькі вы трапляеце пад UF-промні, ваша тату пачынае прыгожа свяціцца!

Падагульняючы, можна сказаць, што кожны, хто захоча, можа зрабіць сабе моднае тату, а вось які варыянт для ажыццяўлення сваёй мары абраць — асабістая справа кожнага. Галоўнае, спачатку добра падумаць, бо прыгажосць, як вядома, патрабуе ахвяр, але ўсё ж памяркоўных.

Паласу падрыхтавала Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ

На пачатку 1969 з “Сельской газеты” я перайшоў у “ЛіМ”. Перайшоў — не тое слова. Вырваўся з боем, як птушка з клеткі. Двойчы засядала рэдкалегія газеты: ты — малады камуніст (працаваў я ў аддзеле партыйнага жыцця), мы далі табе кватэру, не маеш права пакідаць орган ЦК КПБ, забірай заяву назад. Але я цвёрда стаяў на сваім: хачу пісаць на роднай мове. Тады рэдактар патэлефанаваў у ЦК, папрасіў, каб мяне ў “ЛіМ” не бралі. Але Нічыпар Пашкевіч, тагачасны лімаўскі галоўны рэдактар, не збаяўся: “Дык ён жа ідзе не ў падпольную газету. Нам таксама патрэбны маладыя камуністы. Да таго ж, ён культасветработнік па адукацыі”.

У тыднёвіку я нарадзіўся другі раз

Апошні козыр вырашыў мой лёс, і я апынуўся ў аддзеле культуры “ЛіМа”. Загадваў ім Павел Місько, менавіта ён і перацягваў мяне да сябе. Раней ён таксама працаваў у “Сельской газете”, мы былі добра знаёмыя.

Тагачасная газета “ЛіМ” была унікальным выданнем: яна служыла двум панам — Міністэрству культуры і Саюзу пісьменнікаў, выходзіла два разы на тыдзень. Знешне вылучалася тым, што на яе старонках не было вертыкальных друкарскіх лінеек: загалоўкі і слупкі набранага тэксту. Але газета мела трывалы аўтарытэт выдання сур'ёзнага, прафесійнага, рэцэнзіі ды артыкулы былі прынцыповыя, аргументаваныя. Артыкулы, карэспандэнцыі на самыя розныя тэмы: пра сельскія клубы і бібліятэкі пісалі людзі дасведчаныя, спецыялісты сваёй справы.

Супрацоўніцтва з “ЛіМам” пачалося... з фотаэцюда “У зімовым лесе”. Паказаў свае здымкі адказнаму сакратару Уладзіміру Мехаву, той адразу ўхапіўся за лясны пейзаж: “Ставім у нумар”.

Памятаю першую камандзіроўку ад “ЛіМа” на Пухаўшчыну. Заданне было канкрэтнае: напісаць праблемны артыкул пра сельскі асяродак культуры, бо пачалася Усесаюзная пераклічка сельскіх клубаў, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Леніна.

Перачытваю артыкул “Вечары ў вёсцы Блужа”, напісаны амаль сорак гадоў таму, і дзіўлюся: як надзённа гучыць! Ну, вось, мяркуйце самі. Гаворыць вясковы культработнік: “ Эх, каб нашым клубам ды болей утульнасці! Неяк засушылі мы свае мерапрыемствы. А ведаеце, аб чым я мару? Каб быў самавар у клубе. Не ўсміхайцеся. Запрасілі б мы, скажам, у госці Героя Савецкага Саюза альбо пісьменніка ці кампазітара. Пасядзелі б шчыранька за сталом. Тут жа самавар клякоча. Ведаеце, як бы душэўна ішла размова!..

Што ж, можа і варта было б мець самавар у клубе. Хоць, зрэшты, справа не ў ім. Галоўнае, каб заўжды жыла прага пошуку новых форм і метадаў клубнай работы, каб часцей звярталіся да багатай скарбонкі народнага вопыту правядзення святаў, ігрышчаў і г. д.”. Ох, як гэта трэба і зараз. Заканчваецца карэспандэнцыя так: “Вузкая сцяжынка бяжыць раніцой праз малады парк да клуба. А познім вечарам, калі вяртаецца дамоў Ганна Заблоцкая, сцяжынка нагадвае шырокую, добра ўтаптаную дарогу. Значыць, многа людзей пабывалі ў сельскім асяродку культуры. І кожны з іх панёс нешта з сабою ў душы, даведаўся аб нечым цікавым, весела і карысна адпачыў”.

Унізе прыпіска ад рэдакцыі: зварот да чытачоў — узяць удзел у абмеркаванні праблем сельскіх асяродкаў культуры.

На лятучцы артыкул хвалілі. Суровы Нічыпар Пашкевіч і той зазначыў: матэрыял талковы, напісаны з веданнем справы. Але ў журналістыцы, увогуле ў творчасці, бываюць не толькі ўдачы. Неўзабаве і мяне напаткала няўдача. Неяк на лятучцы зайшла размова пра вясну, пра жаночае свята, што трэба напісаць перадоўку-віншаванне. Раптам Пашкевіч зірнуў на мяне, скупа ўсміхнуўся:

— А ў нас ёсць свежы кадр. Не заштампаваны. Хай пакажа, як ён любіць жанчын. Шчыра, цёпла, па-пісьменніцку...

Адмаўляцца не выпадала. Апошнія словы мяне, зялёнага літаратара, так бы мовіць, азадачылі, скавалі палёт фантазіі. Артыкул атрымаўся сумбурны, без належнай шчырасці ды цеплыні. Аглядальнік на лятучцы стрымана пахваліў за цікавую фактуру, але Нічыпар Пашкевіч сказаў:

— Такое ўражанне, што аўтар набраў паветра поўныя грудзі, а выдых атрымаўся неглыбокі. Мабыць, першая перадоўка ў жыцці?

— Так, раней пісаць не даводзілася, — адказаў я.

Увогуле месяцы тры я сядзеў на лятучках, як мыш пад венікам, бо гаварыў на роднай мове слабавата.

Неўзабаве Нічыпар Пашкевіч паехаў у Маскву, у газету “Правда”. А на яго месца прыйшоў Леанід Прокша. Усё часцей ён пачаў гаварыць, што “ЛіМ” павінен стаць тыднёвікам, будзе выходзіць па пятніцах. Раней Прокша рэдагаваў тыднёвік “Голас Радзімы”, мабыць, яго і прызначалі з такім прыцэлам, каб перавёў “ЛіМ” у новы фармат.

І вось Першага мая 1970 года адбылося другое нараджэнне “Літаратуры і мастацтва”. Выданне стала тыднёвікам, упершыню на яго старонках зачырванеліся каляровыя загалоўкі. У нумары былі мае тры фотаэцюды з тэкстоўкамі-абразкамі. Прычым, агульны загаловак “Самнасам з прыродай” чорны, а падзагаловак — “Дрэва-ветэран”, “Лекавыя гнёзды”, “Зялёная ліра” — чырвоныя.

На лятучках Прокша не забываўся паўтараць: “ЛіМ” ужо не газета. Мы — пісьменніцкае выданне. Трэба павышаць узровень матэрыялаў”. Слова “ўзровень” ён звычайна вымаўляў з націскам на “у”. Распарадак дня памяняўся: пачалі працаваць з 12 гадзін. Суседзі — супрацоўнікі часопісаў “Полымя”, “Беларусь” — прыходзілі на працу к 14 гадзінам. Гэта была мудрая завядзёнка. Калі ў пакоі сядзяць чатыры чалавекі, як можна рэдагаваць раман ці пісаць нешта сваё? Асноўная работа адбывалася дома, а рэдакцыя — для сустрэч з аўтарамі, абмеркаванняў, планёрак.

У камандзіроўках, апрача канкрэтнага задання, я збіраў матэрыял для праблемнага нарыса пра бульбу. Доўга яго пісаў, урэшце аддаў Паўлу Місько. Той начапіў акуляры і адразу ўзяўся чытаць. Нарыс яму спадабаўся, ён падпісаў і панёс намесніку рэдактара. Праз дзень-два заходзіць намеснік, вяртае нарыс.

— Вось што, стары. Напісаў ты няблага. Але надта згусціў фарбы. Гатункі звялі, ураджаі нізкія, убіраць няма чым, захоўваць няма дзе. Усё кепска. У такім выглядзе не пайдзёць. Падумай, як змякчыць матэрыял. Падкараці троху.

Я сядзеў, як апляваны. І Павел адчуваў сябе няёмка. “Лявоне, нічога нікому не кажучы, аддай нарыс галоўнаму”. Што я і зрабіў. Назаўтра заходзіць Прокша, вясёлы, усмешлівы, кучаравы: “Віншую вас. Выдатны нарыс. Праблемны, востры. На добрым літаратурным узроўні”.

Нарыс надрукавалі. Ён меў шырокі розгалас. Было рэагаванне Мінсельгаса, віншавалі калегі. Неяк Іван Чыгрынаў прывёў у пакой Антона Бялевіча.

— Слухай сюды, зямляк. Вось Антон Пятровіч хоча з табой пазнаёміцца.

Бялевіч быў у капелюшы, у белай кашулі, пры гальштуку, гладка паголены і злёгку на падпітку. Доўга трос маю руку і казаў:

— Смачна напісаў пра бульбу. Асабліва пра печаную ў прыску... Я маленства ўспомніў... Ажно слязу пусціў...

Такі водгук мяне ўсцешыў. А потым патэлефанаваў з выдавецтва Аркадзь Марціновіч і “заказаў” напісаць... кніжку. Так, так, была ў выдавецтве “Беларусь” серыя “Праца ўпрыгожвае чалавека”, запланаваны нарыс пра агранома, памер — тры, чатыры аркушы. Марціновіч даў два дні на роздум. Я пагадзіўся, сказаў, што буду пісаць пра агранома з Навагрудчыны, Героя Працы Марыю Карковіч. Са мною адразу заключылі дамову і выдалі аванс. (А цяпер выходзіць раман, які пішаш тры гады, а то й пяць, і не атрымліваеш ні капейкі.)

Кніжка “Гаспадар зямлі” праз год убачыла свет. Падпісана была сціпла, “дзявочым” прозвішчам — Л. Лявонаў. Выданне кніжкі падштурхнула шукаць псеўданім. І шукаў я доўга. Нечакана дапамог Іван Мележ. Мы сядзелі побач у сталоўцы Дома творчасці “Каралішчавічы”. Ён параіў узяць псеўданім Леанід Левановіч. Я сказаў: быў жа пісьменнік Павел Левановіч. “Ён загінуў на фронце. Паспеў выдаць адну кніжку. Працягвайце яго справу”.

У мяне было падрыхтавана некалькі апавяданняў. Два з іх аддаў у “ЛіМ”. З трапяткім хваляваннем вычытаў карэктуру. Уразіла новае прозвішча, набранае буйным шрыфтам. Першае апавяданне я надрукаваў у газеце “Советская Белоруссия” яшчэ ў красавіку 1963 года. Праз восем гадоў адбывалася маё другое нараджэнне. І не абышлося без кур'ёзу. “ЛіМ” тады выходзіў двума сшыткамі. Канец апавядання “Брытва” быў у другім сшытку. Выходзіць “ЛіМ”, а канцоўкі апавядання няма. Дзесьці згубілася. Знаёмыя пыталіся, што я хацеў сказаць другім апавяданнем? Зусім незразумелы фінал. Сваю крыўду выказаў галоўнаму рэдактару.

— Не бядуй. Значыць, друкавацца будзеш бясконца, — суцяшаў гумарыст Прокша.

Вельмі не хацелася развітвацца з “ЛіМам”, але Андрэй Макаёнак настойліва ўгаворваў перайсці ў часопіс “Нёман” рэдактарам аддзела крытыкі і мастацтва. Урэшце я згадзіўся. У “ЛіМе” друкуюся даволі часта, кур'ёзаў болей не было, хоць прыкрыя памылкі (не па маёй віне) здараліся. Хачу пажадаць тыднёвіку зноў стаць гэткім папулярным, як у часы перабудовы, калі кожную пятніцу гучала адмысловая радыёперадача “Гасцінец”, прысвечаная свежаму нумару “ЛіМа”. Цяпер тыднёвік зрэдку ўзгадваюць у радыёаглядзе прэсы, прычым, называюць артыкул, а хто яго напісаў, не кажуць.

Жадаю, каб пра “ЛіМ” не забываліся ў адроджаным на БТ тэлечасопісе “Літаратурная Беларусь”. Каб тыднёвік можна было купіць у любым кіёску. Неяк на вуліцы Карбышава, у Мінску, пытаюся ў кіёску, ці ёсць “ЛіМ”? “А что это такое? Такая газета к нам не ходит”. Дык вось, трэба, каб хадзіла. Бо літаратура — першааснова культуры, хлеб мастацтва. Без літаратуры няма народу, няма дзяржавы.

Леанід ЛЕВАНОВІЧ

На лятучках Прокша не забываўся паўтараць: “ЛіМ” — ужо не газета. Мы — пісьменніцкае выданне. Трэба павышаць узровень матэрыялаў”. Слова “ўзровень” ён звычайна вымаўляў з націскам на “у”. Распарадак дня памяняўся: пачалі працаваць з 12 гадзін. Суседзі — супрацоўнікі часопісаў “Полымя”, “Беларусь” — прыходзілі на працу к 14 гадзінам. Гэта была мудрая завядзёнка. Калі ў пакоі сядзяць чатыры чалавекі, як можна рэдагаваць раман ці пісаць нешта сваё? Асноўная работа адбывалася дома, а рэдакцыя — для сустрэч з аўтарамі, абмеркаваннях, планёрак.

Насевак поўнай жменяй

Пісьменнікі — не рэдкія госці ў нашай бібліятэцы. Нядаўна Пяты філіял гарадской дзіцячай бібліятэкі і музычная школа № 1 наладзілі творчую сустрэчу пісьменніка Міколы Буська з вучнямі 4 класа СШ № 14. Ён часта наведвае дзіцячыя садкі і школы. Гэтым разам пісьменнік прынёс вучням казку, што выйшла асобнай кніжкай — “Шасцікрылец Хмарагон”, а кніжкай “Бабрыная навука”, якую склалі скорагаворкі, каламбуры, акравершы, загадкі і вершаваныя казкі, парадаваў і зацікавіў усіх прысутных.

Да сустрэчы з пісьменнікам была прымеркавана кніжная выстава “У гасцях у казкі” з якой і распачала гаворку бібліятэкар Тамара Разінкіна пра творчыя набыткі пісьменніка. Яго вершы з кніжак “Аўтобус на Пагарэлку”, “Ластаўкі”, “Песня пра Радзіму” прачыталі вучні Саша Гаўрылкін і Насця Буглак.

— Калі я бегаў з вучнёўскай торбачкай у школу вёскі Турэц (а яна знаходзілася ў сямі кіламетрах ад дому), было дастаткова часу, каб зрабіць накід верша. Пасля дасылаў першыя вершаваныя спробы ў раённую газету. У кожнай бібліятэцы быў запісаны, такая была неадольная прага да творчасці.

Шчырая гамонка з вуснаў пісьменніка выклікала вялікую цікавасць у дзетак. Вочы іх заіскрыліся, напоўніліся радасцю. Вучань Ілья Гаваркоў насмеліўся прачытаць уласны верш.

— Я ўражаны творчай знаходкай, навізной, адчуваннем вобразнасці, — здзіўлена адзначыў Мікола Буська і дадаў: кожная літаратура мае перш за ўсё пазнавальна-выхаваўчы характар, і ў сваю чаргу — гэта вынаходніцтва і... рацыяналізацыя.

Шчырая гаворка дзетак і літаратара паступова перайшла ў павучальны кірунак і натхніла іх да пазнання сакрэтаў прыгожага пісьменства.

— Патрэбна выказаць свае ўражанні, сказаць так, як да вас яшчэ ніхто не сказаў! — падкрэсліў галоўнае правіла літаратуры М. Буська.

Затым вучні праслухалі фрагменты радыёпастаноўкі казкі “Шасцікрылец Хмарагон” у выкананні знакамітых артыстаў беларускіх тэатраў, таксама ўрыўкі з оперы “Бабрыная навука” (лібрэта М. Буська, кампазітар Ю. Вальмус) у магнітафонным запісе.

Натхнёна і прыцягальна пісьменнік апавядаў пра нёманска-пушчанскую прыгажосць, пра сваю адданасць родным караням, пра мілагучнасць і прыгажосць матчынай мовы, а таксама засяродзіў увагу дзетак на патрыятызме, маральнасці нашага грамадства, падтрымцы таленавітай моладзі.

Заслугоўвае ўвагі і такая акалічнасць: Мікола Буська спалучае пісьменства з мастацкай творчасцю, і даволі плённа. З парты на парту пералятаў альбом з фотаздымкамі карцін, напісаных яго пэндзлем. Мікола прапанаваў дзецям і свае графічныя выявы краявідаў Берасцейшчыны: Белае возера, Чорнае і Рагазнянскае.

Творчая ідылія працягвалася. Канцэрт з твораў беларускіх кампазітараў залагодзіў усіх прысутных. Вучнямі 2, 5 і 7 класаў СШ № 1 былі выкананы творы І. Лучанка, Я. Цікоцкага, М. Чуркіна...

Пасля ізноў узяў ініцыятыву Мікола Буська, чытаў вершы пра патрыятызм, маральнасць, павагу да Айчыны і роднай мовы.

Алена ТУРКЕВІЧ,
загадчыца 5-га філіяла дзіцячай бібліятэкі г. Баранавічы

Фота аўтара

Калектыў РВУ «Літаратура і Мастацтва» выказвае глыбокія спачуванні старшыні прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Міхаілу Уладзіміравічу Мясніковічу з напаткаўшым яго горам — смерцю МАЦІ.

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва» выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім галоўнага рэдактара “Белорусской военной газеты. Во славу Родины” Леаніда ЗАХАРАНКІ з выпадку яго заўчаснай смерці.

РВУ «Літаратура і Мастацтва» выказвае шчырыя спачуванні кансультанту аддзела па рабоце з кадрамі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Броўчанцы Аксане Валянцінаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — раптоўнай смерцю МУЖА.

Школа майстроў

Адной з адметных устаноў старажытнага Заслаўя з'яўляецца дзіцячая школа мастацтваў, заснаваная ў 1959 годзе. Дакладней, школай мастацтваў яна пачала называцца пасля адкрыцця ў ёй аднайменнага аддзялення ў 1987-м. Знамянальным для навучальнай установы стаўся і 1999-ы — адбыўся пераезд у адрамантаванае трохпавярховае памяшканне з новай канцэртнай залай на сто дваццаць месцаў. А праз год адкрыўся клас харэаграфіі, які знаходзіцца на базе Заслаўскай гімназіі.

Школа, якую ўзначальвае Валерый Шкурскі, па праве завецца культурна-асветніцкім цэнтрам горада, бо намаганнямі яе калектыву праводзіцца вялікая работа па эстэтычным выхаванні моладзі, прапагандзе нацыянальнай культуры і народнай творчасці.

Ва ўстанове працуе падрыхтоўчая група, а таксама адкрыта музычная студыя для ўсіх жадаючых — без абмежаванняў па ўзросце — займацца на любым музычным інструменце. Усяго ж у школе 360 хлопчыкаў і дзяўчынак, якія навучаюцца на наступных аддзяленнях: фартэпіяннае, народнае (баян, акардэон), духавое, смычковае струннае, народнае струннае, тэарэтычнае, харавое, харэаграфічнае і мастацкае.

Такая разнастайнасць выбару кірункаў навучання і прафесіяналізм выкладчыкаў знайшлі адлюстраванне ў шматлікіх мастацкіх калектывах, на якія багатая гэта ўстанова. На іх дзейнасці і дасягненнях мы і спынім сваю ўвагу.

У 1990 годзе ў школе створаны ансамбль скрыпачоў (два гады таму яго кіраўніком стала выкладчыца ўстановы Алена Казлоўская). На аснове разнастайнага музычнага матэрыялу дзеці знаёмяцца з культурай розных краін і эпох. А рэпертуар ансамбля, які з'яўляецца заўсёдным удзельнікам школьных ды гарадскіх мерапрыемстваў, складаюць творы беларускіх, рускіх і іншых кампазітараў.

Заняткі на харавым аддзяленні падпарадкаваныя галоўнай мэце — зацікавіць навучэнцаў харавымі спевамі, калектыўнай творчасцю, музыкай. Тут працуюць ажно два хоры: малодшых (кіраўнік Ірына Салаўёва) і старэйшых (кіруе Вольга Нікалаенка) класаў. У рэпертуары гэтых калектываў — замежная і руская класіка (Бах, Моцарт, Глінка), а таксама народныя песні і творы сучасных аўтараў, у тым ліку знакамітага Ю. Семянякі.

Сёлета пятнаццаць гадоў споўнілася тамтэйшаму ансамблю цымбалістаў "Глорыя", якім кіруе Ларыса Саўчук і які выконвае творы айчынных і замежных кампазітараў. Летась знаны калектыў паспяхова вытрымаў творчы іспыт на наданне ганаровага звання "ўзорны". "Глорыя" — лаўрэат мінулагодняга Міжнароднага конкурсу дзіцячай творчасці "Золотая пчёлка". На рахунку ансамбля і шматлікія іншыя ўзнагароды і дыпломы.

Уладзімір Гінько ачольвае зусім малады — створаны ў 2005-м — ансамбль старадаўняй беларускай музыкі "Легенда". Нягледзячы на маладосць, калектыў паспяхова дэбютаваў на першым абласным конкурсе ансамбляў, прымеркаваным да 60-годдзя Вялікай Перамогі, а таксама ўдзельнічаў у III Міжнародным фестывалі старадаўняй музыкі і танца ў Мінску. Сваіх прыхільнікаў "Легенда" радуе сярэднявечнай еўрапейскай і старадаўняй беларускай музыкай.

Адметнасць школы мастацтваў — аркестр баянаў (кіраўнік Дзмітрый Нікалаенка). Вучні старэйшых класаў выступаюць з размаітым па змесце, стылі і жанры рэпертуарам, аснову якога складаюць класічныя ды арыгінальныя творы, апрацоўкі народных песень і танцаў. Яшчэ ва ўстанове дзейнічае ансамбль ударных інструментаў (кіраўнік Вольга Дарыенка). Вучні малодшых і старэйшых класаў складаюць вакальны дзіцячы ансамбль народнай музыкі (кіраўнік Міхаіл Лявонаў). Яны выконваюць беларускія народныя песні розных жанраў. А рэпетыцыі ансамбля скіраваны на тое, каб прывіць любоў да народнай музыкі і песні.

Як зазначае загадчык мастацкага аддзялення ўстановы Таццяна Мядзведзь, мэта іх заняткаў — развіццё ў вучняў здольнасцей да выяўленчага мастацтва, захаванне традыцый культурнай спадчыны нашай Бацькаўшчыны. Вынікі навучання відавочныя: мастацкае аддзяленне школы добра вядомае не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Выхаванцы сталі дыпламантамі міжнародных конкурсаў "Другой взгляд" (г. Сасновец, Польшча) і "Космос и я" (г. Новасібірск, Расія).

Як ужо адзначалася, у 2000 годзе ў дзіцячай школе мастацтваў быў адкрыты клас харэаграфіі. Вучні займелі магчымасць раскрыць свой талент і творчыя здольнасці, а таксама атрымаць практычныя і тэарэтычныя веды па наступных прадметах: асновы класічнага танца, народна-сцэнічны танец, вобразна-рытмічны рух ды гісторыка-бытавы танец. Харэаграфічны калектыў актыўна ўдзельнічае ў культурным жыцці горада, а летась ён быў ганараваны дыпломам за паспяховы ўдзел у конкурсе "Зоркі Заслаўя".

А самы вядомы калектыў установы — народны ансамбль інструментальнай музыкі "Каданс", у складзе якога выкладчыкі дзіцячай школы мастацтваў. Ганаровае званне "народны" нададзена калектыву ў маі 2004 года. Рэпертуар ансамбля цікавы і разнастайны: творы беларускіх, рускіх ды замежных кампазітараў, а таксама творы сучасных беларускіх кампазітараў, што з'яўляецца яскравым прыкладам папулярызацыі і прапаганды айчыннай музыкі.

Неад'емная частка народнага ансамбля інструментальнай музыкі "Каданс" — вакальны ансамбль выкладчыкаў школы. Ён робіць канцэртную праграму больш разнастайнай, дадае асаблівы каларыт выкананню вакальна-інструментальных нумароў. "Каданс" — лаўрэат Рэспубліканскага конкурсу творчых работ выкладчыкаў навучальных устаноў культуры і мастацтва (май 2004 года) і ўладальнік дыплома III ступені абласнога фестывалю "Напеў зямлі маёй" (г. Мар'іна Горка, кастрычнік 2004-га).

Ансамбль з'яўляецца пастаянным удзельнікам Беларускага музычнага фестывалю, які праходзіць пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі прафесара Міхала Фінберга. Вось і гэтым разам адбылося выступленне "Каданса" на, сёмым па ліку, музычным фэсце "Заслаўе-2007", які ладзіўся ў студзені і пра які падрабязна распавядалася ў "ЛіМе".

Дырэктар Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў Валерый Шкурскі ўпэўнены, што музычнае асяроддзе, у якім знаходзіцца чалавек, вызначае не толькі яго асабісты густ, але і агульны эстэтычны ўзровень, фарміруе мастацкія прыярытэты будучых пакаленняў. Да таго ж, музыка — эфектыўны сродак фарміравання і выхавання светапогляду асобы. Яна валодае велізарнай эмацыянальнай сілай уздзеяння і здольная істотна ўзбагаціць духоўны свет чалавека.

В. КАВАЛЁЎ

На здымках: у школьным фае — музыка і жывапіс.

Фота аўтара

У пошуках дабра і святла

Сёння ідэі і ідэалы ў нашым жыцці адышлі на другі план, намі кіруюць грошы і камерцыя. Моладзь захапляецца камп'ютэрам і Інтэрнетам, жывыя зносіны страчваюць былое значэнне. Слова "духоўнасць" раздражняе і выклікае неразуменне. Каханне, як правіла, асноўная тэма мыльных опер і надуманых меладрам. Экран запоўнены насіллем, некалі забароненым сексам, і пастаноўка прыстойнага твора залежыць найчасцей ад яго камерцыйнага поспеху. Інакш... за гэта ніхто і не возьмецца. І на гэтым фоне паэзія становіцца лёсам нямногіх, ледзь не абраных. Пісаць вершы сёння — справа няўдзячная, бескарысная, а часам і небяспечная. Вершы — гэта душа аўтара, яго крыж, яго боль...

Салавей спявае таму, што гэта яго звычайны стан, і ніхто не прымусіць яго заціхнуць. Пісаць вершы таксама звыкла, як і дыхаць, і ніхто не забароніць гэта рабіць.

Зборнік Лявона Валасюка "Познія сны" (брэсцкае выдавецтва "Акадэмія", 2006 год) ужо трэцяя кніжка аўтара на беларускай мове. Дагэтуль амаль усе яго вершы пісаліся па-руску. Сказаць, што гэта даніна модзе — было б глупствам і няправільна. Хутчэй за ўсё гэта вяртанне да тых вытокаў, адкуль ён выйшаў, якія ўскармілі яго з малаком маці, выхавалі ў ім любоў да родных мясцін, адарылі талентам. І гэта ўжо заўважна ў першых вершах зборніка:

Маці сніцца. Яе голас.
Блакітны позірк, ціхі крок.
Мне сніцца
Цяжкі жніўні колас
І сіні сціплы васілёк.

"Познія сны" — гэта кніга ўспамінаў і падвядзення вынікаў. Успамінаў пра сваё дзяцінства, пра блізкіх і родных сэрцу людзей, пра мілыя куточкі родных мясцінаў Бацькаўшчыны. Успаміны выклікаюць сум, і гэта заканамерна, бо вельмі позна мы пачынаем разумець, што шмат чаго згубілі ў жыцці, былі не вельмі цярплівыя да блізкіх і дарагіх нам людзей, захапляліся абы чым, не помнілі пра галоўнае... Горыч і боль, сум і непрыкрытая пяшчота — вось асноўны матыў зборніка:

Жыцця незваротны матыў
Пад снежаньскім небам блукае...
Прыпалі да дрэва платы,
І вецер-скразняк не сціхае...

Жыцця незваротны матыў:
Жаўрук над радзімай спявае...
Да скроні, да мёртвай вады
Замерзлы лісток ападае...

Чытаючы яго вершы, міжволі задумваешся: няўжо мы сапраўды настолькі глухія і сляпыя, што перастаём прыкмячаць чужы боль; чэрствасць і абыякавасць запаланілі нашы душы...

Паміж вёскай
І балотам —
Птушка плача
І крычыць:
Што зрабілася
З народам?
Хто мне зможа
Памагчы?

Гэта добра, калі ёсць людзі, якія будзяць нашы душы трывожным набатам, не дазваляючы забываць, хто мы такія насамрэч. У гэтым і заключаецца задача паэта — не дазваляць супакойвацца, вынішчаць у сабе абыякавасць.

Паэт — гэта звон, які будзіць тых, хто спіць у час небяспекі і трывогі. Наш боль — гэта яго боль. І яго душа крывавіць пры выглядзе апусцелых, асірацелых вёсак.

Завяршаюць зборнік лірычныя мініяцюры аўтара. Яны сугучныя ягоным вершам. Проза Лявона Валасюка напоўнена паэзіяй, іскрыцца лёгкасцю і прастатой; у ёй шмат дзівоснай назіральнасці і тонкага гумару. Гэта жыццё, а жыццё, як вядома, цудоўнае ва ўсіх сваіх праявах. Дабро і святло душы аўтара праменяць і ў сэрцах герояў невялікіх замалёвак.

Віктар ЗУБОВІЧ

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"
РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Леанід ГАЛУБОВІЧ
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Валерый ПІНЧУК
(адказны сакратар)
Мікола СТАНКЕВІЧ
(намеснік галоўнага рэдактара)
Ірына ШАЎЛЯКОВА

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-66-71
літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі— 284-44-04
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-66-71
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ"
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79

Індэкс 63856
Наклад 3608
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 16.04.2007 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 2572

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12